СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*IV квартал*
63850 (індывідуальны)	**12400**	**37200**
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	**11600**	**34800**
63858 (ведамасны)	**19900**	**59700**
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	**18000**	**54000**

Заставайцеся з намі!

WWW.ZVIAZDA.BY — *на 12 гадзін раней*

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

16 ВЕРАСНЯ 2010 г. ЧАЦВЕР № 181 (26789)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ШТО ПАСЕЕШ, ТОЕ І ПАЖНЕШ. І Ў БІЗНЭСЕ, І НА АГАРОДЗЕ

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Таццяна ПАЛУЯН: пад такім «цеплавым парасончыкам» на вуліцы не змерзнеш.

На шчасце, даўно мінулі часы, калі ўсё ва ўсіх было збольшага аднолькавым. Цяпер кожны можа на свой густ аздобіць сваё жыллё, добраўпарадкаваць прысядзібны або дачны ўчастак. Як і ўласнае прадпрыемства. Дапамагчы вырашыць такія пытанні можа V міжнародны спецыялізаваны форум, падчас якога працуюць выставы «Гандаль Экспа», «Склад Экспа», «Прыдарожны сэрвіс», а таксама сезонная выстава-кірмаш «Мінскі фестываль ландшафту, кветак, саджанцаў». Форум працуе ў выставачным комплексе ў сталіцы па праспекце Пераможцаў, 14. Паводле інфармацыі арганізатара — выставачнага прадпрыемства «Асунта» — толькі за першы дзень працы форуму яго наведала каля 750 чалавек, што можна лічыць — з папраўкай на восеньскі час і досыць аддаленае месца правядзення — добрым паказчыкам. Выправіліся на яго і журналісты «Звязды».

У мінулыя выхадныя пасля працы на агародзе смажылі сям'ёй шашлыкі. Цудоўна правялі час, толькі шкадавалі, што, на жаль, няма ўвечары ўжо таго цяпла. А на выставе пабачыў выйсце — вулічны газавы інфрачырвоны абагравальнік, гэткі «цеплавы парасончык». Працуе ён ад звычайнага газавага балона на 27 літраў, ствараючы зону ўтульнага цяпла на 9 метраў у дыяметры.

— Калі на вуліцы тэмпература паветра толькі 5 градусаў цяпла, з дапамогай газавага інфрачырвонага абагравальніка яе можна павялічыць да плюс 25, — тлумачыць менеджар мінскага ПУП «ЭлМора-М» — першага пастаўшчыка ў Беларусь гэтай прадукцыі з Германіі — Таццяна Палуян. — Пры працы ў сярэднім рэжыме прапальвання газавага балона хапае прыкладна на 40 гадзін.

Такі абагравальнік можна выкарыстоўваць як побач з альтанкамі, дзіцячымі пляцоўкамі і пясочніцамі на прыватных участках, так і на адкрытых пляцоўках вулічных кавярняў, рэстаранаў. Кошт — 960 тысяч рублёў, аднак для тых, хто любіць бавіць час сям'ёй, ды яшчэ з дзецьмі, на свежым паветры, падаецца, гэта цана цалкам «пад'ёмная». Тым больш што абагравальнік лёгкі ў мантажы, яго лёгка перавозіць, ён не псуе сваім выглядам навакольле.

Прыгадайце нядаўнюю спёку. Як прыемна было бавіць час летам недзе побач з вадой або проста ў цяньку ў шэзлонгу, памятаеце?

— Сёлета мы ў параўнанні з мінулым годам адчулі павелічэнне попыту на сваю прадукцыю, — кажа індывідуальны прадпрымальнік Дзмітрый Ярашэвіч, які першым пачаў вазіць з Расіі мэблю для лецішчаў, адпачынку: пластыкавую, драўляную, металічную. — Завезлі навінку — лежакі, якія добра ішлі. Прычым яны былі двух відаў: монаблок — цэльная канструкцыя (добра ўстанаўліваць на ўчастку каля басейна, але яны і даражэйшыя) і складныя (можна пакласці ў багажнік, вывезці з сабой на прыроду). Ішлі яны па 290—390 тысяч рублёў. Упершыню з'явіліся і матрацы для лежакоў. Бавaўняныя прадаваліся па 140 тысяч, вільгацеўстойлівыя — такі прыбіраць не трэба, а пасля дажджу з яго дастаткова толькі кроплі вады змахнуць — па 200 тысяч рублёў.

Якім будзе наступнае лета, зараз, напэўна, ніхто не скажа. Але добрую і зручную мэблю для адпачынку, падаецца, ніколі не рана набыць, так?

...І ў дарозе, і дома заўсёды прыемна выпіць кубак кавы. Сапраўдныя знаўцы аддаюць перавагу молатай каве — натуральнай, у зернях. Намеснік дырэктара па продажы сталічнай кампаніі «Проксімавест» Аляксандр Бернатовіч кажа, што ў кожнага народа — свае традыцыі спажывання кавы. Яму б хацелася прывіць беларусам такую культуру ад італьянцаў, якія лічаць, што ўвесь смак кавы — у першых кроплях, якія падаюць у кубак. Таму кампанія пастаўляе менавіта эксклюзіўныя італьянскія, цалкам аўтаматычныя кава-машыны (прафесійныя і бытавыя), экспрэса-кавaваркі (адрозненне ў тым, што ў першыя закладаецца зерне, у другія — ужо молатая кава), гандлёвыя аўтаматы. Фірма даўно працуе на рынку, пастаянна ўдзельнічае ў выставах, таму гэтая прадукцыя ёсць шмат у якіх установах грамадскага харчавання, на кухнях беларусаў. Кошт — ад 550 тысяч рублёў за бытавую экспрэса-кавaварку да... 7,7 мільёна за бытавую ж аўтаматычную кава-машыну.

— І што, бяруць па такім кошце?

— Так, напрыклад, уладальнікі катэджаў. Кава ў ёй гатуецца з дапамогай аднаго дотыку рукі...

...У дачнікаў, як вядома, увосень — работ восем. Аднак менавіта яны складаюць зараз, паводле інфармацыі ад арганізатараў форуму (зрэшты, гэта і так было бачна), асноўную масу наведнікаў. Хоць ад саміх прадаўцоў кветак, саджанцаў даводзілася чуць, што пакупнікоў хацелася б больш, аднак «падкачала» адсутнасць рэкламы і месца правядзення выстаў. Зноў жа — у многіх зараз шмат клопатаў на ўчастках.

У Марыны Драменка, якая наведала выставу разам з маленькім сынам Уладам, што ціхенька пасопваў у пераносцы на люльцы, і маці, дача за Дзяржынскам. Быў вольны час, вось і пад'ехалі за шаўкоўніцай. Але, кажа, можа і яшчэ нешта выберуць.

Да саміх прадаўцоў, як заўсёды, падысці даволі праблематычна: і гандаль перабіваць не хочацца, і пакупнікам замінаць — таксама. Таму зносіны выходзяць такімі своеасаблівымі «наскокамі». Напрыклад, зацікавіў набор садовага рыштунку ад сталічнай кампаніі «Аграмір» — чым не падарунак жонцы для догляду за яе любімымі кветкамі: у кампактным пластыкавым чамаданчыку сабраныя грабелькі, сякатар, невялікі апырсквальнік, дзве рыдлёвачкі. Адстаяўшы ў чарзе, задаю некалькі пытанняў спецыялісту па працы з клiентамі Аляксандры Лаговік. Высвятляецца, што тавар кітайскі, раней такі чамаданчык каштаваў 35 тысяч, цяпер са зніжкай ідзе па 27 тысяч. Купляюць набор, паводле слоў Аляксандры, даволі актыўна: і дачнікі для працы ў цяпліцы, і тыя, хто кветкі на балконе вырошчвае. А яшчэ добра бяруць чамаданчык з садовым рыштункам знаёмым — у якасці падарунка. Так што, сумнявацца вельмі не выпадае — трэба браць.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Марына ДРАМЕНКА наведала форум разам сынам Уладам і маці: куплiць шаўкоўніцу на дачу.

СТАР.2

«ТРЭБА ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ ПАДЫХОДЫ ДА АПЛАТЫ ПРАЦЫ ГРАМАДЗЯН», —

заявіў на шостым з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі яе старшыня Леанід КОЗІК.

Генеральнае пагадненне паміж урадам Беларусі, рэспубліканскімі аб'яднаннямі наймальнікаў і прафсаюзаў на 2009-2010 гады, паводле слоў старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, выканана практычна на 100 працэнтаў. Зараз рыхтуецца новы праект на бліжэйшыя тры гады, які ў параўнанні з дзейным, распрацаваным ва ўмовах нарастання сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, значна ўзмоцнены ў сацыяльным плане.

— Мы паглядзім і прааналізуем яшчэ раз усе эканамічныя параметры, якія зараз закладваюцца ў новае пагадненне, — адзначыў Леанід Козік. — Я лічу, што новы праект павінен быць на прыступку вышэйшы за папярэдні ў развіцці сацыяльнага складніка — па ўзроўні зарплаты, па выдаткаванні сродкаў на аздараўленне і ахову працы.

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі перакананы, што прыйшоў час ураду пераглядзець падыходы да аплаты працы грамадзян і ўнесці ў іх карэктывы ў адпаведнасці з цяперашнімі эканамічнымі ўмовамі. І пры гэтым адзначыў, што летась пакупніцкая здольнасць заработнай платы засталася на ўзроўні 2008 года, у той час як у 2005—2008 гадах суадносіны сярэнямесячнай зарплаты да мінімальнага спажывецкага бюджэту ўзраслі з 204 да 260 працэнтаў. Прычыны замарожвання пакупніцкай здольнасці зразумелыя і не адрозніваюцца ад эканомік іншых краін.

— Мы неаднаразова звярталі ўвагу ўрада на тое, што трэба ў большай ступені скіраваць свае сілы на барацьбу з беднасцю, — падкрэсліў старшыня ФПБ. — І нельга сказаць, што ў гэтым напрамку нічога не робіцца.

Адным з асноўных паказчыкаў спрыяльнага развіцця Беларусі Леанід Козік назваў параўнальна невысокі ўзровень беспрацоўя.

— Падчас сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу перад дзяржавай стаяла рашэнне: скарачаць працоўныя месцы і выганяць на вуліцу людзей альбо скарачыць працягласць працоўнага часу на асобных прадпрыемствах, — кажа старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

СТАР.2

Выбары-2010

Плацдарм падрыхтаваны

ЦВК на сваім пасяджэнні зацвердзіў неабходныя для разгортвання прэзідэнцкай кампаніі дакументы

Прынятыя пастановы ствараюць нарматыўную пляцоўку, уладжваючы юрыдычныя нюансы арганізацыі выбараў. Каляндарны план па днях распісвае кожную фазу электаральнай баталіі. Каштарыс выдаткаў размяркоўвае, на што скіраваць выдаткаваныя з бюджэту 37,71 млрд рублёў для двух тураў галасавання. А распрацаваныя Цэнтрвыбаркамам метадычкі праводзяць своеасаблівы лікбез для ўсіх, хто мае дачыненне да выбараў. І для арганізатараў, і для ўдзельнікаў, і для назіральнікаў, і натуральна ж, для нас — звычайных выбаршчыкаў.

Большы арсенал

Патэнцыйным кандыдатам ужо варта «варушыцца»: спіс членаў сваёй ініцыятыўнай групы разам з заявай аб яе рэгістрацыі трэба падаць у Цэнтрвыбаркам не пазней за 24 верасня. А пакольні прагрэс не абышоў і ЦВК, то спіс там патрэбны не толькі ў папяровым, але і ў электронным выглядзе:

— Каб пры дапамозе адмысловай праграмы пасведчанні членаў ініцыятыўных груп былі вырабленыя ў найкарацейшыя тэрміны, — адзначае **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА**, з усмешкаю прыгадваючы часы, калі «мы былі маладыя і нявопытныя і доўгімі начамі запаўнялі тыя пасведчанні ўручную, далучаючы да гэтага і членаў сям'і».

Спісы ўдзельнікаў ініцыятыўных груп будуць апублікаваныя на сайце Цэнтрвыбаркама. Паводле слоў Лідзіі Ярмошынай, робіцца гэта для таго, «каб яшчэ больш павысіць галоснасць выбарчага працэсу». Там жа самі ўдзельнікі ініцыятыўных груп змогуць адшукаць усе тлумачэнні — як збіраць подпісы, як завяраць, куды падаваць і гэтак далей.

СТАР.2

У АЎТААВАРЫІ Ў ПОЛЬШЧЫ ЗАГІНУЛІ ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСІ

Пяць беларусаў загінула ў ДТЗ, якое адбылося раніцай 15 верасня ў Польшчы, непадалёк ад Беластока.

Фота БЕЛТА.

Два мікрааўтобусы, адзін з якіх зарэгістраваны ў Мінскай вобласці, а другі — у Гродзенскай, рухаліся ад Беластока ў бок Варшавы. У адной машыне было пяць пасажыраў, у другой — чацвёра. Адзін з мікрааўтобусаў у забароненым для абгону месцы вырашыў пайсці на гэты манеўр і сутыкнуўся з грузавіком «Вольва». У выніку грузавік выехаў на сустрэчную паласу і знёс у кювет другі мікрааўтобус з беларускімі нумарамі. У выніку ДТЗ загінула пяць чалавек.

На месца здарэння выязджалі прадстаўнікі генеральнага консульства Беларусі ў Беластоку і кіраўнік консульскага аддзела пасольства ў Варшаве, якія і пацвердзілі беларускае грамадзянства загінулых. Як паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь, у ДТЗ пацярпелі яшчэ тры чалавекі, яны шпіталізаваныя з цяжкімі траўмамі.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

БЕЛАРУСБАНК

Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 08.09.2010 зарегистрированы изменения в Проспекты эмиссии восемьдесят третьего и девяносто четвертого выпусков облигаций Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» в части сокращения срока проведения открытой продажи облигаций.

http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

Лицензия Министерства финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/0385613 действительна до 29.07.2012 (изменения и (или) дополнения внесены на основании решения Министерства финансов Республики Беларусь от 28.05.2010 № 118). УНП 100325912.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Дзержинский райагросервис» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже административно-хозяйственного здания, об.пл. 393,9 кв.м, расположенного по адресу: **Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 4.**

Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 276 771 840 бел. руб.

Площадь земельного участка 0,0808 га.

Задаток 25 000 000 бел. руб.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.08.2010.

Аукцион состоится **23.09.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.09.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34; 500 47 12.

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ

КУПП «Виттекс»

(36 кв. м; 40,8 кв. м; 793,9 кв. м; 1042,7 кв. м; 1207,8 кв. м; 1189,9 кв. м; 2939,2 кв. м) в г. Витебске по ул. Володарского, 100.

ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.

Информация на сайте: www.vitinvest.biz.

Тел.: 431498, +375336480387; +375292962323 МТС.

УНП 300149663

У Беларусі адменены прэйскурант рознічных цэнаў на цэмент, які адпускаецца насельніцтву

паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.

Гэта рашэнне прынята пастановай Мінэканомікі № 133 ад 31 жніўня 2010 года, якая прызнае страціўшымі сілу некаторыя дзеючыя раней пастановы, прынятыя ў сувязі з дэфіцытам цэменту ў 2007 годзе і розным узроўнем цэнаў на гэту прадукцыю на ўнутраным рынку рэспублікі. Цяпер сітуацыя стабілізавалася, у выніку чаго было прызнана мэтазгодным адмяніць названы прэйскурант.

РЭКОРДНАЕ МЕСЦА Ў РЭЙТЫНГУ ФІФА

заняла зборная Беларусі, абыграўшы французаў

У новым рэйтынгу Міжнароднай федэрацыі футбола (ФІФА), распаўсюджаным 15 верасня, зборная Беларусі заняла рэкордnае ў сваёй гісторыі 55-е месца, перамясціўшыся з 78-га. Раней лепшым лічылася 57-е, якое наша каманда займала ў чэрвені-верасні 2008 года.

З часу складання папярэдняга рэйтынгу наша каманда правяла тры матчы. 11 жніўня ў гасцявым таварыскім паядынку беларусы абыгралі літоўцаў 2:0. 3 верасня наша зборная сенсацыйна выйграла ў Парыжы ў французаў 1:0, а 7 верасня ў Мінску мы ўнічыю (0:0) згулялі з румынамі. Усё гэта дазволіла набраць 554 ачкі (раней было 403) і ўзняцца на 23 прыступкі. У еўрапейскім рэйтынгу падапечныя Бернда Штанге падняліся з 39-га на 31-е месца сярод 53 зборных. Сярод каманд былога СССР Беларусь ідзе пасля Расіі, Украіны і Літвы чацвёртай. А так выглядае дзясятка лепшых футбольных каманд свету: Іспанія, Галандыя, Германія , Бразілія, Аргенціна, Англія, Уругвай, Партугалія, Егіпет, Чылі. Усяго ў рэйтынгу 207 зборных.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Жывая зямля

ВУЖЫ ПАД КОЛАМІ

На дарозе Лепель—Ушачы, якраз непадалёку стыку раёнаў, на толькі што заасфальтаваным участку гінуць вужы, што мігруюць на зіму. На працягу якіхсьці 250 метраў я налічыў каля васьмідзесяці раздушаных коламі паўзуноў.

Звычайна масавая міграцыя паўзуноў адбываецца ў сярэдзіне верасня, напярэдадні, а па народных прыкметах — у дзень праваслаўнага Узвіжання. На гэтым участку абапал дарогі захаваліся балоты, і калі была гравійка, вужы пераадольвалі яе хутка. Цяпер жа, калі асфальт за дзень награецца, рэптыліі часта застаюцца пагрэцца. Служба аховы прыроды Ушацкага раёна павінна абазначыць гэты кавалак шляху папераджальнымі знакамі, каб спыніць гібель гэтага віду жывёл.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.



ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ІНДАНЭЗІІ РАСІЙСКІЯ ІНЖЫНЕРЫ АТРУЦІЛІСЯ ТЭХНІЧНЫМ СПІРТАМ

У целях траіх расійскіх інжынераў, якія памерлі 13 верасня ў Інданэзіі, знойдзены сляды метанолу.

На атручванне метылавым спіртам паказваюць і рэчыўныя доказы: побач з целамі былі знойдзены ёмістасці, у адной з якіх знаходзіўся алкагольны напой, а ў другой — алкагольны напой, разведзены метанолам. Раней таксама выказвалася здагадка, што Сяргей Варонін, Аляксандр Палтарак і Віктар Сафонаў былі атручаныя. Па словах экспертаў, двое расіян, шпіталяваных 14 верасня з сімптомамі атручвання, таксама, па ўсёй бачнасці, спажылі метанол, але ў меншай колькасці — у бальніцы застаецца толькі адзін з іх, другі пацярпелы ўжо выпісаны. Усе расіяне, якія атруціліся, уваходзілі ў склад групы спецыялістаў АКБ «Сухой», якая абслугоўвала шэсць закупленых у Расіі знішчальнікаў Су-27СКМ і Су-30МК2.

ТУРЭЦКАЕ СУДНА ЎРЭЗАЛАСЯ Ў ПРЫЧАЛ

На грэчаскім востраве Кос у прычал урэзалася турэцкае судна Aegean Cat.

На борце судна знаходзіліся 213 пасажыраў, галоўным чынам турысты-брытанцы, і шасцёра членаў экіпажа, грамадзян Турцыі. У выніку сутыкнення 25 чалавек атрымалі раненні, яны дастаўлены ў бальніцу вострава, пяцёра пацярпелых знаходзяцца ў цяжкім стане.

У НЬЮ-ЁРКУ МАШЫНЫ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ ПРЫВЯЛІ ДА СВАРАК

Непаладкі ў працы новых электронных машын для галасавання прывялі да шматлікіх сварак і канфліктаў на выбарчых участках у Нью-Ёрку.

Выбарчыя ўчасткі на праймерыз у горадзе Нью-Ёрк і некалькіх акругах штата Нью-Ёрк павінны былі адкрыцца 14 верасня. Аднак на некаторых участках супрацоўнікі выбарчых камісій не змаглі наладзіць работу машын для галасавання, што прывяло да чэргаў выбаршчыкаў. У цэлым не менш за 71 выбарчы ўчастак пачаў працу са спазненнем. Мэр Нью-Ёрка Майкл Блумберг усклаў адказнасць на службоўцаў, якія займаліся падрыхтоўкай выбараў. На закуп новага абсталявання для нью-ёркскіх выбарчых участкаў у 2010 годзе было выдаткавана каля 50 мільёнаў долараў.

АД УКРАІНЫ ПАТРАБУЮЦЬ ГРОШЫ ЗА ЗБІТЫ ЛАЙНЕР

Авіякампанія «Сібір» мае намер спагнаць з Украіны новую кампенсацыю ў сувязі з інцыдэнтам амаль дзесяцігадовай даўнасці, калі ППА выпадкова збілі пасажырскі лайнер Ту-154М над Чорным морам.

Расійскі перавозчык ініцыюе адначаленне судовага разгляду. З гэтай мэтай кіраўніцтва авіякампаніі падало супраць Мінабароны і Дзяржказначэйства Украіны іск у Гаспадарчы суд Кіева. У якасці кампенсацыі расіяне спадзяюцца атрымаць 15,32 мільёна долараў. Сума іску складаецца з кошту знішчанага лайнера — 6,37 мільёна; 197,4 тысячы, выдаткаваных на расследаванне катастрофы; 17,4 тысячы страхоўкі; 4,83 мільёна страчанай выгады ў сувязі са стратай паветранага судна і яшчэ 3,9 мільёна ў якасці кампенсавання маральнай шкоды. На дадатковыя выплаты разлічваюць і сваякі загінулых у выніку катастрофы пасажыраў. Трагедыя адбылася 4 кастрычніка 2001 года, калі ўкраінскія вайскоўцы падчас вучэнняў на палігоне ў Феадосіі выпусцілі ракету, якая трапіла ў лайнер авіякампаніі «Сібір», што выконваў рэйс па маршруце Тэль-Авіў — Новасібірск. У выніку лайнер падарваўся, а 78 чалавек, якія знаходзіліся на яго борце, загінулі.

ДУХІ СПЫНІЛІ ЦЯГНІК... БЕГЕМОТАМ?

У Мазамбіку чыгуначныя зносіны на лініі, якая злучае порт Бейра з Замбіяй, часова былі спыненыя пасля сутыкнення цягніка з бегемотам. Толькі нядаўна гэтая чыгунка была адноўлена пасля доўгіх гадоў грамадзянскай вайны і разрухі.

Жывёла загінула. Ад сутыкнення пацярпеў і чыгуначны састаў. Надоечы іншы цягнік урэзаўся ў Мазамбіку ў статак кароў на лініі, якая вядзе ў суседняе Каралеўства Свазіленд. Мясцовыя жыхары лічаць, што ўсё гэта адбываецца нездарма. Па іх вераваннях, духі продкаў угневаліся, што аднаўленне працы чыгункі не было абстаўлена неабходнымі абрадамі, і таму менавіта з-за іх адбываюцца сутыкненні цягнікоў з жывёламі.

ВЯСЕЛЛЕ ПА-БЕЛАРУСКУ СТАНОВІЦЦА МОДНЫМ

Ганчар падзяляе кавалак гліны на дзве паловы і дае жаніху і нявесце. Маладыя пішуць на іх свае імёны. Пасля дзве паловы злучаюцца і з гліны ствараецца збанок (гаршчок, бутэлечка — форму выбіраюць маладыя). На атрыманым «посудзе шчасця» жаніх і нявеста пішуць свае пажаданні, пакідаюць малюнкі...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Абрад праходзяць Вольга і Алег НОВІК.

Вось вам і рамантыка, і традыцыі. Прычым нашы, беларускія. І гэта толькі адзін з сімвалічных вясельных элементаў. Такая традыцыя была распаўсюджана на памежжы Беларусі, Латвіі і Літвы: маладыя пасля вяселля ішлі да майстра і рабілі заказ на выраб посуду, з гэтага пачыналася іх сямейная гаспадарка. «Посуд шчасця» жаніхі і нявесты разам з майстрам ствараюць у Траецкім прадмесці, у галерэі рамёствaў «Славутасць», ужо каля дзесяці гадоў.

— Адрадзіць абрад падказаў адзін з нашых майстроў. Мы вырашылі абыграць гэта, зрабіць сучасны матэрыял. Доўга працавалі над тэмай, вывучалі этнаграфію, перабіралі энцыклапедыі, было сабрана шмат матэрыялу пра традыцыі беларусаў, пра вясельныя абрады», — распавядае вядучы спецыяліст галерэі «Славутасць» Марына Каржанеўская.У выніку абрад, які называецца «Посуд шчасця» ці «Начынне шчасця», увабраў у сябе некалькі вясельных элементаў. Маладыя тут не проста замаўляюць посуд, а як бы спраўляюць вяселле па-беларуску, няхай і ў скарочанай форме.

За той час , што яны праводзяць у галерэі, даведваюцца пра многія беларускія традыцыі, без якіх раней не абыходзілася вяселле. «Даволі часта людзі і не ўяўляюць, які гэта глыбінны пласт, і якая тут моцная энергетыка», — заўважае Марына Дзмітрыеўна.

Вядома, некаторыя элементы старадаўніх абрадаў працягваюць існаваць і ў сучасных вяселлях. Яны захавалі традыцыйную форму, а змест абрадаў нам часта невядомы (а нашы продкі ведалі, што ўсім дзеям надаецца пэўны сэнс). Вы не хочаце, каб ваша вяселле прайшло па банальнай схеме «загс-фатаграфаванне-застолле»? Можа, варта ўзгадаць і пра традыцыі?

Падчас вяселля можна было рабіць прагнозы на тое, якім будзе жыццё маладой пары. Напрыклад, куфар «падказваў» бацькам жаніха, як ставіцца да маладой нявесткі. У ім ляжаў пасаг нявесты — рэчы, зробленыя яе рукамі. З самага юнага ўзросту яна спасцігала ўсе сакрэты, якімі павінна валодаць гаспадыня. Да 16-17 гадоў, калі дзяўчыну ўжо маглі выдаць замуж, яна павінна была напоўніць куфар, падрыхтаваць падарункі родным і сябрам мужа. Потым куфар везлі ў дом жаніха.

СТАР.2

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.09.2010 г. (для б/н разлікаў)		*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*	
1 долар ЗША 3 025,00	1 чэшская крона 160,12	USD 30,7407	
▲ 1 еўра 3 936,13	1 польскі злоты 1000,48	10 UAH 38,8263	
1 латвійскі лат 5 547,41	▼ 1 расійскі рубель 98,40	1000 BYR 10,1589	
1 літоўскі літ 1 138,50	1 украінская грыўня 382,07	EUR 39,9107	

Агенцтва Уладзіміра Грачова

Плацдарм падрыхтаваны

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЦВК зарэгіструе групы і выдасць зборшчыкам подпісаў пасведчанні ў 5-дзённы тэрмін пасля падачы заявы аб рэгістрацыі. Так што фактычна з 30 верасня па 29 кастрычніка ініцыятыўныя групы будуць старацца здабыць для свайго «кандыдата» 100 тыс. подпісаў. Толькі такая колькасць аўтографаў электарату дазваляе прэтэндаваць на ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах. Падпісныя лісты трэба будзе скіраваць у выбаркамы адпаведных узроўняў не пазней за 29 кастрычніка. Яшчэ 10 дзён выбаркамы пакідаюць сабе ў распараджэнні на праверку сапраўднасці атрыманых подпісаў.

Да 13 лістапада ахвотнікі пазмагацца за прэзідэнцкі пост павінны будуць прадаставіць у ЦВК дэкларацыю аб падатках і маёмасці ды іншыя дакументы, неабходныя для рэгістрацыі кандыдата ў прэзідэнты. Да 23 лістапада стануць вядомымі імёны зарэгістраваных кандыдатаў. Ну а далей, аж да асноўнага дня галасавання, ідзе самае цікавае — агітацыя. Якая ў гэтую кампанію абяцае быць больш прыкметнай, чым заўжды. Ужо хоць бы таму, што ў змаганні за перамогу кандыдаты змогуць скарыстацца большым арсеналам «зброі».

Упершыню кандыдаты ў прэзідэнты атрымаюць магчымасць стварыць уласны фінансавы фонд. Яго дазволена папоўніць максімум на 3 тыс. базавых (105 млн рублёў) і толькі ўнёскамі беларускіх грамадзян і арганізацый. «Выбары — справа нацыянальная», — акцэнтуе кіраўнік ЦВК. І дзяржава дае кандыдату, на думку Лідзіі Ярмошынай, «значна больш», чым фінансавы фонд: апроч 2300 базавых велічынь (80,5 млн), вылучаных з бюджэту, ён атрымлівае яшчэ бясплатны эфірны час на радыё і тэлебачанні, а таксама магчымасць апублікаваць сваю праграму ў прэсе. Тым не менш, старшыня Цэнтрвыбаркама сказаў, што новыя дадатковыя магчымасці для кандыдатаў «зробяць перадвыбарную кампанію больш разнастайнай»...

Калі ў нас будуць празрыстыя скрыні?

З вылучэннем сваіх прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных камісій палітпартыям, грамадскім аб'яднанням і працоўным калектывам варта паспець да 26 верасня ўключна. Вылучацца могуць і грамадзяне шляхам падачы заявы. Камісіі будуць утвараныя не пазней за 29 верасня адпаведнымі прэзідыумамі мясцовых Саветаў і выканкамамі.

Да 17 кастрычніка па ўсёй краіне ўжо з'явяцца ўчасткі для галасавання. Сваіх прадстаўнікоў у склад участковых камісій, паводле слоў сакратара ЦВК Мікалая ЛАЗАВІКА, які знаёміў калег з каляндарным планам, можна будзе вылучаць па 31 кастрычніка. Туды звычайна «конкурс» самы вялікі, што зразумела: гэта ж святая святых — месца, дзе лічаць галасы. Да 3 лістапада мы даведаемся, хто туды патрапіў.

Цэнтрвыбаркам зацвердзіў таксама патрабаванні да скрыняў для галасавання, якія заўжды выклікаюць нараканні ў міжнародных назіральнікаў. Аднак па-ранейшаму рэгламентуюцца толькі памеры, наяўнасць проразі ў скрыні і магчымасць яе апячатвання. Матэрыял жа урны пакідаецца на выбар арганізатараў:

— На пытанне, калі ў нас будуць празрыстыя скрыні, адказ заўжды адзін — **калі ў тых, хто робіць гэтыя скрыні, з'явяцца грошы!** Вось, напрыклад, у Столінскім раёне ўсе скрыні празрыстыя: там зэканомленыя пры правядзенні выбараў грошы скіравалі не на прэміяванне, а на выраб скрыняў. А там, дзе хочуць зэканоміць, скрыні робяць з фанеры, якую дае мясцовая школа ці ЖЭК. Мы нікому не навязваем ступень празрыстасці скрыні, галоўнае, каб яна апячатвалася, — падкрэсліла Лідзія Ярмошына.

Нягледзячы на тое, што грошай на празрыстыя скрыні (такія звыклыя замежным выбаршчыкам) у многіх кутках Беларусі дагэтуль няма, агульныя выдаткі на айчынныя выбары, паводле інфармацыі ЦВК, супастаўныя з еўрапейскімі краінамі.

— Падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы на аднаго выбаршчыка патрацілі 1 еўра, у Славакіі — 1,5. У нас каля 7 млн выбаршчыкаў, значыць, на кожнага пойдзе каля 1,3 еўра. Абсалютна еўрапейская лічба, — заключае Л.Ярмошына.

Погляд збоку

Міжнародным назіральнікам у Беларусі, здаецца, раздолле:

— Мы не кантралюем іх перасоўванні па краіне, паколькі даём магчымасць свабодна назіраць за правядзеннем выбараў, — падкрэсліў **сакратар ЦВК Мікалай ЛАЗАВІК**, знаёмячы калег з палажэннем аб парадку дзейнасці міжнародных назіральнікаў.

Паводле яго слоў, міжнародныя назіральнікі маюць права назіраць за ўсімі без выключэння этапамі выбараў, сустракацца з кандыдатамі ў прэзідэнты, іх даверанымі асобамі, публічна выказваць сваё меркаванне аб ходзе правядзення выбараў на наступны пасля галасавання дзень.

ЦВК плануе запрасіць для назірання за прэзідэнцкімі выбарамі сваіх замежных калег. Кіравацца будуць прынцыпам узаемнасці: паклічуць тых, у каго на выбарах пабывалі самі. Калег з Расіі, як запэўніла Л.Ярмошына, таксама запросяць.

Што да тутэйшых назіральнікаў, то ўжо сёння можна прагназаваць актывізацыю партый у гэтым кірунку. Ім цяпер дазволена скіроўваць не толькі партыйцаў, але і сваіх прадстаўнікоў — тых, хто не мае членскага білета. А значыць, можна будзе «ахапіць» куды больш участкаў. Сваіх прадстаўнікоў для назірання за выбарамі могуць вылучаць таксама працоўныя калектывы і грамадскія аб'яднанні. Узяць удзел могуць і грамадзяне. Назіраць за ходам выбараў маюць права таксама парламентарыі, дэпутаты мясцовых Саветаў (апошнія толькі на тэрыторыі той адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, дзе яны абраныя) і даверяныя асобы кандыдатаў. Ды і самі кандыдаты могуць прысутнічаць пры падліку галасоў.

Лепта даверу

Па ваш подпіс у падтрымку таго ці іншага кандыдата могуць прыйсці ўжо 30 верасня. Хаджэнне па выбаршчыках працягнецца да 29 кастрычніка. Каб, крый Божа, не патрапіць у гэты час на вуду махляроў, памятайце: зборшчык подпісаў павінен мець пры сабе дакумент, які засведчвае асобу (пашпарт), і пасведчанне ЦВК, якое ўпаўнаважвае яго збіраць подпісы. Дарэчы, у гэтую кампанію Цэнтрвыбаркам абяцае зрабіць іх ламінаванымі, каб, як выказалася старшыня Цэнтральнай камісіі Лідзія Ярмошына, «не абтрапаліся за 30 дзён збору подпісаў». Для большай пільнасці вы можаце яшчэ зверыцца са спісам членаў ініцыятыўных груп на сайце ЦВК (rec.gov.by), ён з'явіцца там адразу ж пасля іх рэгістрацыі.

Вы ў стане дапамагчы вылучэнню кандыдата сваім подпісам, калі вам ужо споўнілася 18 гадоў і вы валодаеце выбарчым правам. Памятайце, што вы можаце «распісацца» больш чым за аднаго патэнцыйнага кандыдата, аднак не маеце права аддаць, скажам, два подпісы аднаму прэтэндэнту. У падпісным лісце павінны быць звесткі пра магчымага кандыдата, інакш подпісы прызнаюць несапраўднымі. Зборшчык подпісаў можа азнаёміць вас з матэрыяламі пра кандыдата, аднак не мае права іх раздаваць. Афіцыйная агітацыя пачнецца ўсё ж пазней...

Датэрміновае галасаванне нікуды не знікне і сёлета. Выразіць сваё волевыяўленне можна будзе не толькі ў асноўны дзень галасавання, але і загадзя — з 14 па 18 снежня...

Нас чакае тры месяцы відовішчных баталій, а імёны патэнцыйных байцоў стануць вядомымі ўжо зусім хутка...

Зоя ВАРАНЦОВА.

Филиалу «Экспериментальная база «Жодино» Республиканского дочернего унитарного предприятия по племенному делу «Заречье»

Срочно требуются на работу:

Трактористы-машинисты на энергонасыщенные трактора МТЗ-3022, МТЗ-1522, К-700.

Высокая заработная плата. Предоставляется жилье.

Контактный телефон: 8 (029) 1334210 — директор Владимир Васильевич.

«ТРЭБА ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ ПАДЫХОДЫ ДА АПЛАТЫ ПРАЦЫ ГРАМАДЗЯН», —

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Мы адстойвалі апошні варыянт. Прэзідэнт краіны падтрымаў нас і даў адпаведную каманду ўраду. Такім чынам удалося захаваць працоўныя месцы, у той час як у Еўропе тысячамі людзей павыкідвалі на вуліцу і асабліва ніхто не клапаціўся пра іх лёс. Гэта я лічу адным з асноўных дасягненняў.

«Летась у Федэрацыю прафсаюзаў звярнулася каля 90 тысяч чалавек»

У асноўным людзі скардзяцца, што іх правы парушылі: некага пазбавілі прэміі, камусьці наогул найманьнік не афарміў працоўную кніжку. Было дастаткова шмат зваротаў і адносна кантрактнай сістэмы.

— Пасля таго, як Прэзідэнт у маі падпісаў Указ аб магчымасці пераходу работнікаў з працоўнага кантракта на доўгатэрміновы або бестэрміновы працоўны дагавор, — падкрэсліў Леанід Козік, — спекуляцыі на гэтую тэму спыніліся. Мы, дарэчы, цяпер выпрацоўваем з Урадам інструкцыі і нарматыўныя акты, неабходныя для ўдасканалення гэтых працэдур. І прафсаюз тут таксама будзе сачыць, каб у дакументах адлюстроўваліся ў першую чаргу інтарэсы работнікаў.

Леанід Козік пераканаў таксама, што прадстаўнікі прафсаюзных арганізацый па-ранейшаму, хоць гэта і не ўсім даспадобы, будуць удзельнічаць ва ўсіх пасяджэннях як рэспубліканскага, так і мясцовага ўзроўню.

— Толькі такім чынам мы зможам спыніць прыняцце рашэння, якое несправядліва пагоршыць становішча працаўніка, — адзначыў старшыня федэрацыі. — Больш за тое, на мой погляд, адстойваць сваю пазіцыю падчас перагавораў значна больш эфектыўна, чым бунтаваць на вуліцы з плакатам у руках.

Леанід Козік адзначыў, што прафсаюзы яшчэ працуюць не на поўную сілу.

— Мы павінны актывізаваць сваю работу, — кажа прафсаюзны лідар. — Напрыклад, мы можам паўплываць на зніжэнне траўматызму на вытворчасці. Паводле статыстыкі, кожны трэці пацярпелы быў нападпітку. Калі б член прафсаюза не дапусціў гэтага чалавека да працы, то няшчасце можна было папярэдзіць. Акрамя таго, трэба брацца за маштабную мадэрнізацыю прадпрыемстваў. Пры падтрымцы ўрада гэта ў руках нашых членаў прафсаюза — канструктараў, тэхнолагаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў. Я глыбока перакананы, толькі грошы, выдаткаваныя на тэхнічнае перабсталяванне, найбольш хутка здольныя даць аддачу пры вытворчасці прадукцыі.

«Няўжо вы думаеце, што я буду агітаваць прафсаюзы за таго, хто проста балбоча?..»

Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі гатова падтрымаць дзейнага Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку на прэзідэнцкіх выбарах, якія пройдуць 19 снежня, — не раздумваючы, адказаў на пытанне журналіста Леанід Козік.

— Яшчэ ў снежні, вазьміце газету «Беларускі час», мы заяўлялі, што будзем падтрымліваць на прэзідэнцкіх выбарах дзейнага кіраўніка дзяржавы. У маі пацвердзілі сваю пазіцыю. Калі трэба будзе, і подпісы збяром у яго падтрымку. Адкрыта пра гэта гаворым і цяпер. Я ведаю Аляксандра Рыгоравіча шмат гадоў. Я сам чалавек ад сахі і такарнага станка. Бачу яго рэальныя справы. Слухаю і астатніх прэтэндэнтаў на пасаду кіраўніка дзяржавы, але іх рэальных спраў пакуль не бачна. Няўжо вы думаеце, што я буду агітаваць прафсаюзы за таго, хто проста балбоча? Трэба падтрымліваць таго кандыдата, які сапраўды працуе, робіць рэальныя справы для народа.

Надзея ДРЫЛА.

Абзац

◢ Хакеісты мінскага «Дынама» атрымалі трэцюю запар перамогу ў чэмпіянаце КХЛ, абыграўшы ў гасцях навасібірскую «Сібір» — 4:2.

◢ **Кіраўнік падраздзялення РУП «Магілёўэнерга» загінуў ад удару электрычнага току падчас мантажных работ на падстанцыі ў Шклоўскім раёне. 43-гадовы начальнік групы падстанцый быў смяротна траўмаваны ў памяшканні закрытых размеркавальных устройстваў падстанцыі элетрасетак у вёсцы Александрыя.**

◢ Пацыенты Гомельскай абласной бальніцы знайшлі ў сваіх талерках ртуць. Хворыя, што лечацца ў лор-аддзяленні спецыялізаванай клінічнай бальніцы, паведамілі пра тое, што падчас прыёму ежы ў сваіх талерках яны знайшлі ртуць. Работнікі падраздзялення МНС знайшлі ртуць у трох талерках — усяго больш за 1 г. Падчас праверкі акалічнасцяў здарэння высветлілася, што ў пякарскай шафе трэснула колба ртутнага тэрмометра.

◢ **У Мінскай вобласці два грузавыя цягнікі сутыкнуліся са статкам кароў. Інцыдэнт адбыўся на 421-м км перагону Пухавічы—Талька (паблізу вёскі Блужа Пухавіцкага раёна). У 3 гадзіны ночы грузавыя цягнікі Мінск—Асіповічы і Асіповічы—Мінск збілі 27 кароў, што належалі мясцоваму сельгаспрадпрыемству. Рух цягнікоў затрымаўся на гадзіну. Усяго ў статку было 200 кароў. Іх пасвілі 3 чалавекі на адлегласці 5 км ад чыгункі. Праводзіцца праверка.**

◢ Каля 55% еўрапейцаў выказалі негатыўныя адносіны да адзінай валюты па выніках фінансавага крызісу. Такія вынікі апытання, праведзенага Германскім фондам Маршала (ЗША) і італьянскай даследчай арганізацыяй Compagnia di San Paolo. Часцей за ўсё негатыўныя выказванні пра еўра ў краінах еўразоны гучалі ў Францыі (60%), Германіі і Іспаніі (па 53%) і Партугаліі (52%). Толькі Нідэрланды і Славакія выказаліся ў падтрымку еўра (52% і 64 % апытаных адпаведна). Тым не менш рэспандэнты не хочуць адмаўляцца ад ідэі адзінай валюты, наадварот, сцвярджаюць, што Еўропе неабходна павышаць згуртаванасць і кансалідавацца ва ўсіх відах дзейнасці.

◢ **У Самары міліцыянер на паказальных стрэльбах трапіў у журналістку. Паказальныя стрэльбы праводзілі ў навучальным цэнтры ГУУС. Аператара тэлекампаніі «Тэра» Наталлю Орас паранілі падчас інфармацыйна-прапагандысцкай акцыі «Адзін дзень на службе ў міліцыі». Няшчасны выпадак адбыўся, калі стральба завяршылася і начальнік курса агнявой падрыхтоўкі даў каманду свайму памочніку прыняць зброю са сталоў. У гэты час дзяўчына вяла здымкі. Калі міліцыянер узяў некалькі пісталетаў, каб прыняць іх, адбыўся стрэл. Дзяўчыну шпіталізавалі ў хірургічнае аддзяленне клінічнай бальніцы. Яна параненая ў сцягно.**

Поўны абзац

◢ У Славеніі вядучы праграмы тэленавінаў аскандаліўся ў прамым эфіры, апынуўшыся перад камерай без штаноў. Інцыдэнт адбыўся падчас праграмы 24UR, якая выходзіць на славенскім камерцыйным канале Pop TV. Пасля таго, як вядучы скончыў чытаць навіны, ён адсунуў свой стол, каб паразмаўляць з калегай. Пры гэтым мужчына не заўважыў, што камера яшчэ працуе. Як толькі стол перастаў загараджваць ногі, гледачы змаглі ўбачыць, што з адзення на дыктары толькі кашуля, пінжак і трусы. Пры гэтым і сам вядучы, і яго супрацоўніца паводзілі сябе зусім свабодна, не выказваючы ніякіх эмоцый у сувязі з незвычайным уборам.

◢ **Першы ў свеце «дэтэктыўны» гатэль адчыніўся ў Германіі. Гатэль у горадзе Хілесхайм афармлены ў стылі папулярных кніжных і кінематаграфічных дэтэктыўных твораў. Ён налічвае ўсяго 10 нумароў, кожны з якіх, а таксама гасцёўня, уяўляюць сабой дакладныя копіі месцаў злачынстваў, апісаных у раманах Конан Дойля і Агаты Крысці. Тут можна ўбачыць «парасон міс Марпл» і «люльку Шэрлака Холмса», а таксама іншыя рэчы і прадметы, што сустракаюцца ў славутых дэтэктывах двух апошніх мінулых стагоддзяў. На сценах вісяць таксама партрэты пісьменнікаў і рэжысёраў, якія пісалі ці здымалі ў дэтэктыўным жанры. Двухмесны нумар са сняданкам у такім гатэлі абыдзецца ў 79 еўра ў суткі. Усім наведнікам абяцаюць запамінальную ноч, якая будзе суправаджацца падазронымі гукамі ў стылі дэтэктывaў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ВЯСЕЛЛЕ ПА-БЕЛАРУСКУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Маладая, калі ўваходзіла ў хату мужа, павінна была паказаць, што яна шмат чаго можа. Тое, што шчыра дорыць, зроблена яе рукамі. Гэта сведчыла, якой яна будзе гаспадыняй. Таму куфар быў неад'емнай часткай вяселля, — распавядае Марына Каржанеўская. Вось і ў абрадзе, што праходзіць у Траецкім прадмесці, без яго не абыходзіцца. На куфар саджаюць нявесту. Прынамсі, трэба яшчэ ўмець на яго ўдала сесці. Раней падчас такіх «пасядзелак» радня мужа магла рабіць выснову, што за нявестка прыйдзе ў хату. Калі туліцца на самым краю куфра, вочы долу апускае, саромеецца — тады ёй можна памыкаць, а калі села падбачэнілася, важна, з усмешкай на ўсіх паглядае, мужа побач з сабой трымае, — то адзначалі — такой не пакіруеш. Ды і па жаніху можна было меркаваць, што за муж з яго выйдзе. Калі побач з нявестай стаіць — значыць будзе яе падтрымліваць, гаспадарку маладым весці разам. А калі проста нявесту на куфры кіне і ўбок адыдзе — відаць, такому зручней усе хатнія справы перакінуць на жонку. Вось такая народная мудрасць.

Няхай куфар у сучасным абрадзе, што праходзіць у галерэі, напоўнены не самой нявестай, і ручнік, з якога робіцца брама, пад якой

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

маладыя загадваюць жаданне, не самаробны. Але тут маладыя знаёмяцца з сапраўднымі традыцыйнымі рэчамі. Так на ручніках — старадаўняя вясельная сімволіка.

— Ручнік — гэта не проста кавалак палатна, не аручка. Гэта істота, у ім — магутная энергетыка. Нашы продкі рабілі ручнікі з нейкім пасылам. Напрыклад, калі вёсцы пагражала няшчасце, хвароба, жанчыны збіраліся ўсім светам і з заходу сонца да світання ткалі ручнік — абыдзённік. І людзі расказваюць, што тады праблемы абыходзілі іх. Тое ж самае і з вясельным ручніком, — заўважае Марына Дзмітрыеўна. — Вельмі радуе, калі маладыя прыносяць ручнік, які застаўся ад бабулі ці прабабулі. Ён можа быць і не з вясельным матывам, але такі намолены, старадаўні, мае сваю энергетыку, бачна, што маладыя надаюць гэтаму вялікую ўвагу.

Прынамсі, раней яшчэ да вяселля дзяўчына магла вышываць некалькі ручнікоў. Калі яна адчувала, што ёй усур'ёз зацікавіўся хлопец — вышывала на палатне птушак, што ада на адной ходзяць. Калі адносіны не складуцца — вышытыя птушачкі разлятаюцца ў розныя бакі. Але ў маладых, што ўдзельнічаюць у абрадзе, на ручніку птушачкі глядзяць адна на адну, а ў цэнтры вышытыя дрэва альбо вазон — сімвал новай сям'і. Між іншым, часам маладыя замаўляюць сабе імянны вясельны ручнік (ён ствараецца спецыяльна для іх, побач з вясельнай сімволікай вышываюцца імёны жаніха і нявесты і дата іх вяселля).

Даволі часта маладыя пары замаўляюць абрад на беларускай мове. Так, у хуткім часе павінна адбыцца вяселле беларускай дзяўчыны і рускага хлопца. Прычым хлопец заўважыў: «Калі гэта беларускі абрад, няхай ён праходзіць на беларускай мове. Я думаю, што маім гасцям, якія прыедуць з Расіі, гэта будзе цікава і прыемна. Калі яны што і не зразумеюць, я патлумачу».

Відаць, малады чалавек адчувае, што ўсё мае значэнне. На родной мове абрад «грае» зусім па-іншаму. Вясельныя абрады ў беларускім духу тут праводзяцца амаль кожны тыдзень, часам па некалькі пар на дзень. Хто ведае, можа праз некаторы час адродзіцца цікавасць да нацыянальных вясельных касцюмаў. Прынамсі, традыцыйнае галаўное ўбранне нявесты могуць прымераць ужо і зараз. Вы б бачылі, як саламяны вяночак мяняе нявест. Яны — сапраўдныя князёўны!

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

СКУТАРЫСТ ЗАГІНУЎ ПАД ФУРАЙ

Страшная і недарэчная аварыя адбылася ўчора ў Мінску. Пад коламі фуры загінуў 22-гадовы кіроўца скутара.

Дарожна-транспартнае здарэнне адбылося на вуліцы Ванеева, 29. Скутарыст рухаўся з боку 2-га Веласіпеднага завулка ў кірунку вуліцы Дзянісаўскай па сярэдняй паласе. Па нявызначаных пакуль прычынах не ўтрымаўшы раўнавагу, ён упаў са скутара на левую паласу, дзе у той момант ехала фура. Трапіўшы пад задняе правае кола 3-тоннага аўтамабіля, хлопец 1988 г.н. загінуў на месцы.

Здарэнне адбылося якраз за святлафорам, і пра перавышэнне хуткасці кіроўцамі гаворкі не ідзе, расказала «Звяздзе» старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Ленінскага РУУС Таццяна Красій. Увогуле, паводле папярэдніх звестак, ніхто з кіроўцаў правілаў не парушаў: фура рухалася ў левай паласе, бо збіралася выконваць левы паварот, скутарыст рухаўся ў сярэдняй, бо правая паласа была занятая прыпаркаванымі аўтамабілямі. Кіроўца фуры з 20-гадовым стажам нават не ўбачыў, як скутарыст упаў, але адразу спыніўся, бо адчуў, што аўтамабіль на штосьці наехаў. Кіроўца скутара быў у матацыклетным шлеме, праўда, гэта яго не ўратавала — пад кола ён трапіў галавой. Кіроўцы аўтамабіляў, якія рухаліся ззаду, сцвярджаюць, што за момант да здарэння кіроўца скутара замахаў рукамі, магчыма, гэтыя жэсты азначалі, што ён збіраецца перастроіцца ў левую паласу.

АДАІ Ленінскага раёна нагадвае, што аварыі з удзелам матацыклаў і скутараў адбываюцца ледзь не штодзённа. У сувязі з гэтым кіроўцы гэтых транспартных сродкаў павінны быць надзвычай уважлівымі, па магчымасці рухацца ў крайняй правай паласе і не грэбаваць матацыклетнымі шлемамі, а з надыходам халоднага надвор'я перасаджвацца на аўтамабілі ці грамадскі транспарт.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ШТО ПАСЕЕШ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— ...Гарлачыкі лепш высаджваць у азярцо на глыбіні ад 50 сантыметраў да 1,2 метра, — чую побач параду ад прадаўца пакупніцы раслін для вадаёма.

Зацікавіўся, а падысці бліжэй не магу: пакупнікі змяняюць адзін аднаго. Прадавец нарэшце толькі і паспявае на маю просьбу даць візітоўку. Там указаны інтэрнэт-сайт, дзе можна знайсці патрэбную інфармацыю. Пасля вяртання з выставы дзеля цікавасці зазірнуў на яго. Ёсць каталог водных, цыбульных, клубнецыбульных і іншых дэкаратыўных раслін, простыя парады, як самому выкапаць невялікае азярцо. Дарэчы, гэта быў не апошні прадавец, які не змог паразмаўляць з намі.

...Ідзём на ярка-жоўтыя «плямы» — кусты хрызантэм. Іх вырошчваюць у сялянска-фермерскай гаспадарцы «Дудчанка» ў Валожынскім раёне. Назва — ад прозвішча гаспадара.

— А вы хто? — пытаемся ў прадаўца Ірыны.

— Жонка свайго мужа — Дудчанкі, — смяецца ў адказ. — Рудская маё прозвішча. А хрызантэмы вырошчваў сын Сяргей — захацеў падзарабіць. Хрызантэмы мы на выставу прывезлі ўпершыню, гэта сартавы матэрыял. Адзін кусцік каштуе 12 тысяч.

Яшчэ Ірына прадае ўласныя, вырашчаныя ў цяпліцы лімоны. На выстаўленым узоры — плод памерам прыкладна з кулак. Гатунак — польскай селекцыі, каштуе 20 тысяч рублёў. Пладаносіць можа ўжо ў першы год, час выспявання зялёнага плода — 8-9 месяцаў. Пладовыя буйныя, у дарослай расліны могуць важыць да кілаграма.

Аляксандр БЕРНАТОВІЧ дэманструе кава-машыну за 7,7 мільёна рублёў: адзін дотык — і будзе кава.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Індывідуальны прадпрымальнік Людміла Канстанціновіч прывезла з Самахвалавічаў на продаж раянаваныя, што важна, айчынныя гатункі саджанцаў яблыні, грушы, слівы, вішні, чорнай парэчкі, дэкаратыўных раслін. Расказвае, пакуль няма пакупнікоў, што добра разыходзяцца летнія гатункі яблыні «Каваленкаўская», «Алена», «Белы наліў», «Антонаўка» па 15—20 тысяч рублёў — у залежнасці ад узросту — за саджанец. Даволі папулярныя ў дачнікаў гібрыдныя гатункі сліў — персікавыя і абрыкосавыя — «Камета» і «Хуткаплодная» — прадаюцца па 20 тысяч.

— Мы ж не толькі прадаём: падкажам кожнаму пакупніку і як ямку выкапаць, і што пакласці ў яе, і чым апрацаваць. І ў цане саступім. Толькі людзей тут малавата. А шкада, бо пасадачны матэрыял вельмі добры — гарантавана прыжывецца, — распавядае, ужо адгукаючыся на пытанні наведнікаў, Людміла Уладзіміраўна. — Хацелася б, каб такія выставы праводзіліся часцей.

...Застаецца толькі дадаць для тых чытачоў, хто зацікавіўся мерапрыемствам: форум будзе працаваць па 17 верасня.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Ну і ну!

САМАСУД ЗАКОНЧЫЎСЯ КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВАЙ

Жыхар аднаго з дамоў па вуліцы Фолюш у Гродне, выгульваючы ўвечары сабаку, звярнуў увагу на два аўтамабілі, прыпаркаваныя на спартыўнай пляцоўцы. І так разлаваўся, што вырашыў правучыць парушальнікаў.

Ён вярнуўся дамоў, узяў завостраную пад шыла адвёртку і... Чалавека, які драпаў машыны і прабіваў шыны, заўважылі жыхары дома, што па суседству са спартпляцоўкай, і выклікалі супрацоўнікаў міліцыі. «Мсціўцу» затрымалі, калі ён, седзячы на кукішках, прабіваў чарговую пакрышку, здзяйсняючы самасуд, замест таго каб выклікаць ДАІ. Заведзена крымінальная справа па ч.1 арт.339 Крымінальнага кодэкса Беларусі «Хуліганства», паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ИП Милькевич Евгений Эдуардович (УНП 690514096) прекращает деятельность. Претензии принимаются в течение двух месяцев со дня опубликования данного объявления по тел.: 8 029 6639052.

Калектыў Інстытута філасофіі НАН Беларусі выказвае шчырае спачуванне загадчыцы Цэнтра гісторыка-філасофскіх і кампаратыўных даследаванняў Вользе Аляксандраўне Паўлоўскай з прычыны смерці МАЦІ.

ОАО «Белорусская валютно-фондовая биржа»
проводит закупку услуги на разработку проекта по модернизации средств телефонной связи на основе голосового шлюза Cisco AS5350 с использованием потока 30B+D (EDSS-1). За дополнительной информацией обращаться по тел. 209 41 00.
В случае Вашей заинтересованности просим в срок до 22.09.2010 г. представить коммерческие предложения по факсу 209 41 10.

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»
(организатор торгов УП «Гомельоблсоюзпечать»)

извещает о проведении *20 октября 2010 года* открытого аукциона
по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле
по улице Гагарина, 20, кабинет 2-18

№ п/п	Гос. номер	Наименование оборудования	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, без НДС, бел. руб.
1	5503 ЕАВ	Легковой седан Фольксваген Венто – 1997 г. двигатель – бензин, объем двигателя – 1,781 л, колесная формула – 2х4	5 900 000	500 000
2	8537 ЕА	Газ-3307 грузовой фургон – 1999 г. двигатель – бензин, объем двигателя – 4,25 л, колесная формула – 4х2	8 400 000	800 000
3	8538 ЕА	ГАЗель-2705 –1999 г. – грузопассажирский Темно-коричневый , двигатель – бензиновый, объем двигателя – 2,445 л	5 400 000	500 000

Продавец: УП «Гомельоблсоюзпечать», контактный телефон:74-51-45. **Имущество расположено по адресу:** ул. Ланге, 2а, г. Гомель, 246050.

Шаг аукциона – 5 %. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-18** в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения ***по 18 октября 2010 г. включительно***. Подача документов по почте не допускается.

При подаче заявления в адрес организатора аукциона представляются:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем - копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом - доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представителем иностранного инвестора - легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык; представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (лоты №№ 1-3) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца р/с №3012000740011 филиал ОАО «БПС-Банк» по Гомельской области, МФО 151501360, УНП 400010817, ОКПО 01195187.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Затраты, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» и Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30 марта 2009 г.

Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 51 45, 74 17 34

РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»
● оценка имущества (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, вреда от залития, пожара и др.)
● организация и проведение аукционов

извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «АТЭК» г. Витебск

ЛОТ: кап. строение (здание дорожно-контрольного пункта-13 (ДКП-13), инв. № 200/С-64891, пл. 27,9 кв.м, по адресу: Витебская область, Витебский район, Бабиничский с/с, М8/Е95, 78-й км, 2, начальная цена продажи 19 801 128 руб. с учетом НДС. Для обслуживания выделен земельный участок площадью 0,0099 га, кадастровый номер 221200000001000682. Официальное извещение опубликовано в информационно-аналитическом бюллетене «Конкурсные торги в Беларуси и за рубежом» от 10.08.2010 № 29.

Аукцион состоится **13 октября 2010 в 10.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по 12.10.2010 (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников с 09.30 до 10.00 по месту проведения аукциона. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

16 верасня 2010 г. № 31 (225)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Чалавечны падыход

Як спрадвеку спрачаюцца, што з'явілася раней — курыца ці яйка, так і наконт дэпутацкай місіі няма еднасці: што важней — заканатворчасць ці праца ў акрузе? Адны кажуць: парламентарый павінен займацца нарматыўнымі актамі, а праблемы насельніцтва няхай возьме на сябе ЖЭС. Другія схільныя лічыць, што абралі «слугу народа», які абавязаны дапамагаць ва ўсім — ад няспраўнага крана да перагляду судовай справы і атрымання кватэры. У нечым рацыю маюць абодва бакі...

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Анфім МІХАЛЕВІЧ для сябе вызначыўся: работа з выбаршчыкамі — першаступенная. Законы ж ствараюцца для іх і з іх падачы! З-за таго, відаць, на яго працоўны стол і кладуцца стосамі лісты з падзякамі выбаршчыкаў. І ёсць за што: жыхары Чашніцкага, Лепельскага, Бешанковіцкага раёнаў пасля звароту да свайго абранніка атрымалі рэальную дапамогу. Таму пры падтрымцы спадара Міхалевіча паспрабуем абвергнуць некалькі тыповых зманаў.

Зман першы. Дзяржава толькі «спажывае» і недастаткова аддае ўзамен

Пагадзіцеся, уявіць уладную «машыну», якая выціскае ўсе сокі з «ячэек грамадства» і кожнага яе ўдзельніка паасобку, а пасля ставіцца да іх як да адпрацаванага матэрыялу, няцяжка. Але ж давайце паглядзім на намаганні канкрэтнага прадстаўніка ўлады на канкрэтнай тэрыторыі.

Раней новалукамчанам даводзілася даваць круг у 27 км, каб трапіць у сталіцу. Цяпер, пасля звароту да свайго дэпутата, дабірацца стала куды зручней, бо з'явілася новая дарога з асфальтавым пакрыццём «Мялешкавічы—Барсукі». А жыхары аграгарадка Бачэйкава ў Бешанковіцкім раёне з радасцю сочаць за будаўніцтвам доўгачаканага праваслаўнага храма. На Лепельшчыне па просьбе бацькоў набылі аўтобус, каб вазіць маленькіх жыхароў аддаленых вёсак раёна ў школу. У кожнай добрай справе ўгадваецца дабро для пэўнага чалавека.

— Днямі ў Чашніках з дапамогай старшыні рэспубліканскага дзяржаўнага аб'яднання ДТСААФ генерал-маёра Анатоля Сцепука адкрытая аўташкола. Такім быў наказ выбаршчыкаў свайму дэпутату, і ён выканаў.

І ў вырашэнні пытанняў Новалукомскага хлебазавода, які працаваў на зношаным састарэлым абсталяванні, парламентарыю таксама бачыцца праблема пэўнага чалавека:

— Мы ж разумеем, што мадэрнізацыя азначае павышэнне рэнтабельнасці, а значыць і рост заробку працаўнікоў, паляпшэнне іх дабрабыту. Безумоўна, важная і якасць прадуктаў харчавання для насельніцтва. Як тут не дапамагчы?! Прадпрыемства атрымала інвестыцыйны на 250 млн ад міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

Праблемы на месцах, паводле ўражанняў дэпутата, як правіла вырашаюцца. Сацыяльная напружанасць здымаецца.

— Прадстаўнікі мясцовай улады — людзі адказныя, унікаюць у праблему. Гэта, безумоўна, і старшыня Лепельскага райвыканкама Пётр Шыкшнян, і кіраўнік Бешанковіцкага раённага выканкама Леанід Пянькоўскі, і старшыня Чашніцкага раённага выканаўчага камітэта Уладзімір Булай. Так, цяжкасці ёсць, аднак пытанні знаходзяцца на асаблівым кантролі. Мне ўвогуле імпануе вось такі напрамак у вырашэнні спраў: у цэнтры ўвагі ўлады — чалавек і яго надзённыя патрэбы. Гэта вельмі дальнабачны падыход. Калі дапамагаць чалавеку ў вырашэнні яго праблем, стварацца камфортны асяродак, то ў яго і настрой цудоўны, і працуе ён плённа, з большай ахвотай, і ўладу разумее.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ІГРАЙ, СТАРАСТА!

Ігнат Леанавец кажа: «Хочацца для людзей нешта добрае рабіць», і, калі яго ўсёй вёскай выбіралі на грамадскую пасаду старасты, пагадзіўся адказваць за парадак і выгляд вёскі.

— Некалі наша Дзераўная была вялікім населеным пунктам, цяпер жа са 140 жыхароў 75 — пенсіянеры. Цяжка назіраць, як гіне інфраструктура: ФАП ужо зачынілі, на мяжы закрыцця паштовае аддзяленне, — з пачуццём страты і крыўды дзеліцца пенсіянер.

У мінулым, яшчэ да Чарнобыля, «дэрэвэнцы», як называюць сябе жыхары вёскі, славіліся лепшымі на Століншчыне і Піншчыне зборшчыкамі лекавых зёлак, свой асноўны грашовы «дадатак» мелі ад нарыхтоўкі «балотнай расы», «трылісніка», сабельніка, хвашчанкі, святаянніку, браткоў, багону і журавін. Жаноцкае насельніцтва па зёлкавай частцы было больш спрытным. Мужчыны выязджалі на сезонныя працы — будаваць правінцыяльную Расію. І Ігнат Леанавец зарабляў гэткім чынам на будоўлях Башкірыі. А дома працаваў лесніком, на розных працах у калгасе, загадваў клубам. І заўсёды іграў на гармоніку ці баяне, навучыўшыся гэтаму самастойна і вельмі рана. Цяпер ён апошні ў Дзераўной музыка, часта выступае ў клубе, перад жывёлаводамі і паляводамі, бавіць вечары з суседзямі пад песні мінулых гадоў. Ён і не скрывае, што адказвае за духоўны ўздым сваіх аднавяскоўцаў. Бо вёска для яго — вялікая сям'я.

— Да мяне звяртаюцца па ўсіх жыццёвых пытаннях, я ж ад імя вёскі стукаюся ў дзверы сельскага Савета ці райвыканкама, — кажа Ігнат Піліпавіч і прыгадвае, што ў Дзераўной апошнім часам часта знікае электрычнасць і яму прыходзіцца літаральна «даставаць» раённыя электрасеткі. — І са скандалістамі не баюся разбірацца, стаўлю іх на месца. А яшчэ раблю абходы падворкаў і сачу за іх санітарным станам.

Цяпер працы ў гэтай памежнай з Украінай вёсцы, акрамя лясніцтва, няма. Нарыхтоўшчыкі зёлак забылі сюды дарогу. А вёсцы хочацца не проста выжываць — жыць дастойна. Староста Леанавец імкнецца падтрымліваць «баявы» дух Дзераўной.

Анатоль КЛЯШЧУК, Фота аўтара.
Столінскі раён.

Ні «бытоўкі», ні культуры?.. Гэта часова

Пасёлак Асінторф з насельніцтвам 871 чалавек — цэнтр аднайменнага сельсавета. Населены пункт вядомы як «першая ластаўка» беларускай энергетыкі. Яшчэ ў 1918 годзе была падпісана пастанова аб здабычы торфу для патрэб чыгункі і Дубровенскай тэкстыльнай фабрыкі. Ужо потым, у 1927-м пачалося будаўніцтва беларускай электрастанцыі. І былая вёска Юр'еў Востраў атрымала новую назву ад слоў «торф» і «Асінаўскія балоты». На здабычы торфу тады працавала ажно больш за 10 тысяч чалавек, якія жылі ў 11 пабудаваных пасёлках.

— Сёння ў пасёлку ёсць сярэдняя школа, садок, бальніца сястрынскага догляду, амбулаторыя, аптэка, паштовае і банкаўскае аддзяленні, прамысловая і тры харчовыя крамы, музычная школа, кавярня, лазня, музей баявой славы, — расказвае **старшыня Дубровенскага райвыканкама Анатоль ЛУКАШОЎ**. — Сёлета запланавана пераўтварыць пасёлак у аграгарадок.

...Калі ідзеш па Асінторфе, адразу заўважаеш будынак, на даху якога растуць дрэвы. Гэта былы камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва, які не выкарыстоўваецца. Потым высвятляецца, што і з культурным жыццём у населеным пункце таксама праблемы. Чым заняцца людзям у вольны час, калі нельга наведаць Дом культуры ці бібліятэку, якія знаходзяцца на рамонце?

— Калі мы гаворым пра аграгарадок, тады трэба зрабіць так, каб у ім была ўся неабходная сацыяльная інфраструктура, — адзначыў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ**, звяртаючыся падчас выязнога пасяджэння аблвыканкама да чыноўнікаў. — Каб населены пункт у гэтым сэнсе нічым не адрозніваўся ад горада. Ужо да наступнага года трэба надаць пасёлку сучасны выгляд.

Адказныя асобы аблвыканкама і мясцовая ўлада павінны прывесці ў парадак і ўвесь жыллёвы фонд. У пасёлку 17 шматкватэрных дамоў з усімі прыкметамі цывілізацыі і каля 200 — сядзібнага тыпу. Чыноўнікам даручана заасфальтаваць дарогі ў самім населеным пункце і на пад'ездах да яго, адрамантаваць і памяняць агароджы.

Дзе ўзяць на ўсё грошы? Улічваючы, што мясцовае торфапрадпрыемства «Асінторф» у 2007 годзе далучана да РУП «Віцебскэнерга», энергетыкі павінны дапамагчы жыхарам пасёлка чым магчыма.

У пасёлку пражывае 450 чалавек працаздольнага ўзросту. Каля трохсот працуюць тут жа. А больш за 100 чалавек, як адзначыў старшыня райвыканкама, знаходзяцца на выязных заробках: хто ў Расіі, хто ў Мінску. А дзе яшчэ ўладкавацца, калі на тым жа прадпрыемстве «Асінторф» занятыя ўсяго 52 чалавекі? Там яшчэ толькі плануюць павялічыць здабычу торфу. У лясніцтва, на ўчастак жыллёва-камунальнай гаспадаркі працаўладкавацца таксама няпроста.

Каб забяспечыць мясцовых «гастарбайтараў» работай, вырашана прадумаць магчымасць стварэння новых прадпрыемстваў. Чаму б не рабіць, напрыклад, шклаблокі або не апрацоўваць драўніну? Ёсць прапанова стварыць тут лясгас ці арганізаваць вытворчасць мэблі, вырабляць дошкі ці пялеты, якія можна экспартаваць.

Дарэчы, на торфапрадпрыемстве пасля доўгага перапынку праведзена мадэрнізацыя, закуплена новае абсталяванне. Торф яшчэ ж і добрае паліва. А ў вобласці якраз распрацаваная спецыяльная праграма перавозу кацельных на яго мясцовыя віды. І ў сельскай гаспадарцы торф прымяняецца разам з іншымі ўгнаеннямі. Увогуле з яго можна вырабляць каля дваццаці відаў прадукцыі. Так што ў 2011 годзе «Асінторф» плануе працаваць з рэнтабельнасцю.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Асінторф — Віцебск.

ПРАЦА СА ЗВАРОТАМІ ГРАМАДЗЯН

ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА АБСАЛЮТНАЙ КАНКРЭТЫКІ

За 8 месяцаў бягучага года колькасць зваротаў жыхароў Міншчыны ў абласны выканаўчы камітэт у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на 23 працэнты. Аднак з гэтага зусім не вынікае, што выканкамы і Саветы базавага і пярвічнага ўзроўню не спраўляюцца са сваімі задачамі.



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Адна з прычын росту колькасці зваротаў — сёлетнія выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Практыка паказвае, што такія значныя палітычныя падзеі заўсёды павышаюць сацыяльную актыўнасць грамадзян. Яно і зразумела: для кандыдатаў гэта час напружанай барацьбы за галасы выбаршчыкаў, за дэпутацкія крэслы, а для саміх выбаршчыкаў — цудоўная магчымасць з дапамогай народных абраннікаў вырашыць свае праблемы. І ўсё ж галоўны фактар, які абумовіў павелічэнне колькасці зваротаў грамадзян у выканкамы, спецыялізаваныя службы і правяраючыя органы ўсіх узроўняў — узмацненне кантролю і павышэнне патрабаванняў да якасці работы са зваротамі з боку кіраўніка дзяржавы.

— Калі людзі звяртаюцца ў органы ўлады, значыць, яны давяраюць уладзе і менавіта тут разлічваюць атрымаць рашэнне сваёй праблемы, — патлумачыла **начальнік аддзела пісьмаў і арганізацыі прыёму грамадзян упраўлення справамі Мінаблвыканкама Алена МЕЛЯШКЕВІЧ**, — таму колькасны паказчык нельга разглядаць як асноўны крытэрый ацэнкі работы дзяржслужачых.

Патрабаванне Мінаблвыканкама да чыноўнікаў пярвічнага і базавага ўзроўню было вельмі жорсткім: пазбавіцца ад размытых «абяцанняў».

Для вывучэння эфектыўнасці работы выканаўчых і распарадчых органаў па рашэнні сацыяльна значных пытанняў насельніцтва і павышэння якасці работы са зваротамі грамадзян спецыяльна створаная міжведамасная працоўная група правяла ў 7 раёнах Мінскай вобласці адпаведны маніторынг. Падчас маніторынгу, які складаўся з трох этапаў, былі задзейнічаны ўсе формы работы: прыём грамадзян (без папярэдняга запісу), «гарачыя тэлефонныя лініі» і інш. Вельмі выніковым і прадуктыўным аказалася ананімнае апытанне насельніцтва, калі людзі давалі ацэнку работы органаў улады на месцах па рашэнні іх праблем.

Пры аналізе работы са зваротамі грамадзян асаблівую ўвагу камісія звяртала на калектыўныя і паўторныя звароты.

Сёлета за 8 месяцаў колькасць калектыўных зваротаў жыхароў Мінскай вобласці ў аблвыканкам павялічылася на 130. Яны, як правіла, тычыліся праблем глабальнага характару, якія патрабуюць значных аб'ёмаў фінансавання. Гэта ў першую чаргу пытанні водазабеспячэння, стану жылфонду, капітальнага рамонту дамоў, добраўпарадкавання дарог, выканання тэрмінаў будаўніцтва ў ЖБК, а таксама землекарыстання ў садаводчых таварыствах.

— Увогуле, вельмі шмат зваротаў прыходзіцца на долю «садаводаў», якія могуць дзесяцігоддзямі весці «дачныя войны» з суседзямі па ўчастку за паўметра памежнай зямлі, — пацвердзіла Алена Аляксандраўна. — Нават указ № 50 не дапамог вырашыць зямельныя пытанні ў садаводчых таварыствах.

Для таго, каб знізіць колькасць калектыўных зваротаў, падкрэсліла Алена Меляшкевіч, работу са зваротамі грамадзян неабходна будаваць у рамках цэласнай сістэмы работы з насельніцтвам. Маецца на ўвазе арганізацыя прыёмаў грамадзян, сустрэч з насельніцтвам, сходаў грамадзян, правядзенне адзіных Дзён інфармавання, «гарачых» і прамых тэлефонных ліній.

— Гэта праверэная часам традыцыйныя формы работы, якія выдатна сябе зарэкамендавалі, — адзначыла начальнік аддзела пісьмаў Мінаблвыканкама. — Аднак жыццё становіцца ўсё больш дынамічным, і грамадзянам трэба прадастаўляць магчымасць вырашаць іх праблемы больш аператыўна, што дазваляе зрабіць «электронная прыёмная», створаная на сайце Мінаблвыканкама. Там жа размешчана старонка юрыдычнага аддзела, дзе даюцца адпаведныя кансультацыі насельніцтву. Гэта таксама вельмі запатрабаваная сёння форма работы.

У прынцыпе, знізіць працэнт зваротаў (у тым ліку і калектыўных) дапаможа павышэнне ўзроўню інфармаванасці насельніцтва. Ёсць планавыя мерапрыемствы па рамонце жылфонду, па добраўпарадкаванні дарог, па замене сецяў водазабеспячэння... І ўся гэтая інфармацыя павінна своечасова даводзіцца да насельніцтва. **Не дастаткова проста гаварыць аб сённяшніх праблемах — людзі павінны дакладна ведаць — калі, у якія тэрміны яны будуць вырашаны.**

Другая паказальная лічба, якая сведчыць аб якасці работы з насельніцтвам дзяржслужачых Мінскай вобласці, — колькасць паўторных зваротаў. Тут наглядаецца станоўчая дынаміка скарачэння, прычым значнага. Калі яшчэ 2 месяцы таму яна складала мінус 72 звароты ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года, то сёння — зменшылася да мінус 259 (удвая менш, чым было летась!).

— Прыведзеная лічба заслугоўвае ўвагі, бо сведчыць пра тое, што звароты грамадзян не проста разглядаюцца, а вырашаюцца ўзнятыя ў іх праблемы, — падкрэсліла Алена Меляшкевіч.— Гэта самае галоўнае ў такой рабоце: пытанні павінны вырашацца!

Калі праблему нельга вырашыць у адпаведнасці з законам «Аб зваротах грамадзян» тэрмін (15 дзён, калі не патрабуецца дадатковага разгляду, і 30 дзён, калі ёсць неабходнасць у зборы інфармацыі ці выездзе на месца), тады пытанне ставіцца на кантроль і не здымаецца з яго да поўнага вырашэння.

— Некарэктна гаварыць аб невырашальных пытаннях. Проста некаторыя з іх не могуць быць вырашаны з прычыны неадпаведнасці існуючай у краіне нарматыўна-прававой базе.

Часам патрабаванні грамадзян выходзяць за межы разумнага і адэкватнага бачання сітуацыі, тады ўзнікаюць неабгрунтаваныя скаргі. Такія факты былі выяўленыя і міжведамаснай групай падчас маніторынгу. Напрыклад, у Мінскім раёне грамадзянка атрымала ад сельгасарганізацыі бясплатнае жыллё і прад'явіла неабгрунтаваныя патрабаванні да яго якасці. Камісія міжведамаснай групы выехала на месца і ацаніла ўмовы пражывання як нармальныя, адпаведныя ўсім існуючым нормам. Але жанчына ўсё роўна працягвае хадзіць па чыноўніцкіх кабінетах з надзеяй даказаць адваротнае.

Сёння пры аналізе работы органаў улады з насельніцтвам на першы план выходзіць якасць разгляду зваротаў, выніковасць — ці была вырашана праблема, з якой прыйшоў да чыноўніка грамадзянін. Падчас праверкі былі выяўлены негатыўныя факты чыноўніцкіх адказаў-абяцанняў — «зробім пры наяўнасці фінансавання». Такая зручная адпіска насамрэч нікога ні да чаго не абавязвае.

— У такім выпадку патлумачце людзям: калі з'явіцца фінансаванне, калі будзе зроблена тое, што неабходна. Задача вызначана: тыя звароты, якія нельга вырашыць сёння, — ставіць на кантроль. І калі паабяцалі правесці капітальны рамонт дома ў 2010-м годзе, то, калі ласка, правядзіце яго менавіта ў 2010-м, каб не было такіх сітуацый, у якой апынуліся жыхары дома № 9 па Другім завулку Чкалава горада Маладзечна. З 2006 года жыльцы пачалі звяртацца ва ўсе мясцовыя органы ўлады з просьбай зрабіць капрамонт (дом пабудаваны ў 1957 годзе). У кастрычніку 2007 года людзям паабяцалі ўключыць іх дом у графік рамонту на 2008-ы. На паўторны зварот у снежні 2008 года паступіў адказ, што план рамонту на 2009 год ужо сфарміраваны і работы па доме № 9 перанесены на 2010 год. А ўжо ў красавіку 2010 года жыльцам паведамілі, што з-за недастатковага фінансавання капрамонт будзе выкананы ў 2011 годзе. Гэта вельмі красамоўны факт, які паказвае — што з'яўляецца прычынай зваротаў грамадзян у вышэйстаячыя інстанцыі. У сувязі з гэтым патрабаванне Мінаблвыканкама да чыноўнікаў пярвічнага і базавага ўзроўню было вельмі жорсткім: пазбавіцца ад такіх размытых «абяцанняў» і прытрымлівацца абсалютнай канкрэтыкі.У адказе на зварот абавязкова павінен быць указаны тэрмін выканання, а сам зварот — пастаўлены на ўлік.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

«МАЛОЧНЫЯ» СТРАТЫ І ПРЫБЫТКІ

Колькасць уласных падсобных гаспадарак грамадзян, якія пастаянна пражываюць у сельскай мясцовасці, няўхільна змяншаецца: напрыклад, у параўнанні з 2000 годам іх стала менш на 175 тысяч. За гэты час знізілася, адпаведна, і вытворчасць прадукцыі на сялянскіх падворках, рэзка скарацілася колькасць жывёлы. Такі спад можна патлумачыць аб'ектыўнымі прычынамі: старэннем вяскоўцаў, нежаданнем моладзі абзаводзіцца падсобнай гаспадаркай, павышэннем узроўню жыцця... Але справа не толькі ў гэтым. Жаданне ці нежаданне аддаваць свае сілы і час дадатковай сельскагаспадарчай працы залежаць часта ад пазіцыі мясцовай улады, ад яе стаўлення да клопатаў людзей. Памятаючы, што летась вялікая колькасць нараканняў насельніцтва была выклікана менавіта дрэннай арганізацыяй закупак малака, мы вырашылі прысвяціць чарговы «адкрыты форум» гэтай тэме.

Валерый БАБКО, старшыня Райцаўскага сельскага Савета дэпутатаў Карэліцкага раёна:

— Зборам лішкаў малака на тэрыторыі сельсавета займаецца СВК «Свіцязянка-2003». Кароў у насельніцтва засталося мала — усяго 70, а гадоў дваццаць таму было 600. Прычына скарачэння статку не ва ўмовах — для тых, хто трымае жывёлу, умовы ў нас, я лічу, створаныя нармальныя. Прычына ў жаданні, дакладней, нежаданні людзей браць на сябе такую ношу. На карове ж моцна не разбагацееш, хіба толькі на дзвюх-трох.

Штодзень малаказборшчыкі ездзяць па вёсках на вазах, збіраюць малако ў бідоны і прывозяць на пункты прыёму. Потым туды прыязджае малакавоз, забірае сыравіну і вязе ў Навагрудак на завод. Схема даўно адпрацаваная, і лепш, на мой погляд, не прыдумаеш. Ва ўсялякім выпадку, скаргаў ад насельніцтва на нейкія збоі не паступала. Іншая рэч, людзям часам падаецца, што ім занізілі тлустасць. Але нашы пункты прыёму малака забяспечаны новай апаратурай для вымярэння тлустасці, шчыльнасці і наяўнасці розных прымесяў. Ды і ў малаказборшчыкаў вока спрактыкаванае. Калі ўзнікаюць падазрэнні наконт сумленнасці таго ці іншага гаспадара, адразу бяруць пробу малака і вязуць на аналіз у лабараторыю. Увогуле ж проба бярэцца 1—2 разы на тыдзень з кожнага падворка.

Ці ўсё зроблена для арганізацыі збору малака? Думаю, так. Кожны, хто пажадае, можа здаць яго хоць заўтра, варта толькі напярэдадні патэлефанаваць. Ніякіх праблем.

Ірына АНДРАЙЧУК, старшыня Хмелеўскага сельскага Савета дэпутатаў Жабінкаўскага раёна:

— Тэндэнцыя да змяншэння насельніцкага статка ў нас захоўваецца — сёлета засталося 89 кароў. Чаму? Таму што малако і малочныя прадукты якіх заўгодна відаў прадаюцца ў вясковых магазінах. Трымаюць буйную жывёлу пераважна пажылыя людзі, і хутчэй за ўсё па звычцы — да каровы ж прывыкаеш, як да члена сям'і.

Закупам малака займаецца ў нас сельгаспрадпрыемства, і сёння праблем з гэтым практычна не ўзнікае. Не тое што летась, калі «Савушкін прадукт» перыядычна вяртаў нам насельніцкае малако з-за наяўнасці ў ім антыбіётыкаў. Мы ўвесь час праводзілі тлумачальную работу з насельніцтвам, хадзілі па хатах, па хлявах, глядзелі, хто як доіць, як захоўваецца гігіена... Бралі пробы на аналіз, нават у Мінск некаторыя вазілі... Сёлета праблем з якасцю малака ўжо не ўзнікае, людзі прызвычаіліся да больш строгіх патрабаванняў.

Малако забірае вадзіцель малакавоза разам з лабарантам. Калі ўзнікаюць спрэчныя моманты, лабарант абавязкова бярэ пробу малака на аналіз (у астатніх выпадках — выбарачна), а тлустасць выстаўляецца кожнаму па яго сярэднім паказчыку за месяц. Пытанне, можна сказаць, адрэгуляванае, сур'ёзных нараканняў ад людзей няма. Калі нейкія непаразуменні ўзнікаюць, стараемся ўсё вырашыць разам з кіраўніком сельгаспрадпрыемства... Ды і раённая ўлада трымае гэту тэму на пастаянным кантролі.

Іна ЗМУШКО, старшыня Дудзіцкага сельскага Савета дэпутатаў Калінкавіцкага раёна:

— Наш сельсавет прыгарадны, а таму вызначаецца найменшай у раёне колькасцю кароў — іх усяго 128. Калі вясковец не трымае карову, значыць, яго даходы дазваляюць яму набываць малочную прадукцыю ў краме. Ён сам вырашае, трымаць яму жывёлу ці не. Ну а ў выпадку станоўчага адказу на гэтае пытанне, мясцовая ўлада яму ўсяляк садзейнічае. Сёння ўзяць у банку льготны крэдыт на набыццё буйной жывёлы — не пытанне. Вось днямі наша ўпраўленне сельскай гаспадаркі зноў папрасіла правесці з насельніцтвам тлумачальную работу наконт гэтага.

Некалі лішкі малака ў нашых людзей збірала сельгаспрадпрыемства, потым адпаведныя функцыі перадалі сельскаму Савету. А з 2007 года зборам малака ў раёне пачалі займацца прадпрымальнікі (дзякуючы ў першую чаргу старшыні раённага Савета дэпутатаў, які ўшчыльную займаўся гэтым пытаннем).

На мой погляд, у выніку лепш стала ўсім. З аднаго боку, з сельскага Савета знялі велізарны аб'ём работы, з другога — цяпер няма ніякіх непаразуменняў (то колькасць літраў не сыходзілася, то па якасці ўзнікалі пытанні). Людзей у прыватныя малаказборшчыкі падбіраюць адказных. Забяспечваюць кожнага спецыяльнымі бочкамі, якія ўсталёўваюцца на аўтамабіль, і прыборамі для кантролю тлустасці. Малаказборшчык сам перыядычна правярае тлустасць і робіць адпаведныя запісы, адвозіць малако на завод у Калінкавічы, атрымлівае там грошы і разлічваецца з людзьмі... І яшчэ не было выпадку, каб прадпрыемства вяртала нам сыравіну назад.

Я думаю, што гэта цудоўны варыянт і для нас, і ўвогуле для сельсаветаў, дзе аб'ёмы малака, атрыманага з падворкаў, не надта вялікія... Там жа, дзе людзі здаюць памногу малака, сельскаму Савету выгадна самому займацца зборам — можна зарабіць рэальныя дадатковыя грошы ў бюджэт.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЧАСОВЫ ДОМ, або Выдаткі, якія апраўдваюцца

Паводле ўсіх «стандартаў», Любанскі раён можна назваць сярэднім, прынамсі, насельніцтва амаль у 35 тысяч чалавек — паказчык яшчэ не крытычны. Аднак казаць аб поўнай адсутнасці тут дэмаграфічных праблем таксама нельга. Як і практычна ва ўсіх «сельскагаспадарчых» рэгіёнах, колькасць насельніцтва Любаншчыны пакрысе скарачаецца. І адначасова — расце колькасць пенсіянераў.

Кампрамісны варыянт

Задума стварыць аддзяленне кругласутачнага знаходжання для пенсіянераў і інвалідаў ў пасёлку Урэчча з'явілася невыпадкова. Падстаў аказалася некалькі, але, напэўна, галоўная — наяўнасць свабодных будынкаў, што засталіся незапатрабаванымі пасля выводу адсюль буйных вайсковых частак. Пакінутыя будынкі паступова прыходзілі ў заняпад. Для пераабсталявання памяшкання колішняй санроты пад дом часовага пражывання састарэлых людзей у абласным і раённым бюджэтах спатрэбілася адшукаць пад мільярд рублёў.

Адкрыццё аддзялення раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва менавіта па-за межамі Любані тлумачыцца яшчэ адной прычынай. Большасць пенсіянераў і інвалідаў, якія не маюць дзяцей або жывуць ад іх далёка, з'яўляюцца вяскоўцамі.

— Прыстасавацца да гарадскіх умоў жыцця ім было б больш цяжка, асабліва калі ўлічыць, што сярэдні ўзрост жыхароў аддзялення — каля 80 гадоў, — кажа дырэктар раённага тэрытарыяльнага цэнтра Іна Усік. — Таму «кампрамісны» варыянт пасёлка падаваўся па-сапраўднаму аптымальным: з аднаго боку, тут ёсць уся неабходная інфраструктура, а з іншага — больш звыклы для вяскоўцаў лад жыцця. Магчыма, гэтым тлумачыцца і наступны факт: на пражыванне ў аддзяленні існуе попыт, усе 40 месцаў практычна заўсёды запоўненыя.

У якасці канстатацыі: пераважная большасць састарэлых, якія трапляюць у аддзяленне, усё ж маюць дзяцей. Вось толькі некаторыя «дзеці» занадта захапляюцца «моцнымі» напоямі. Аднак п'янства сваякоў — не адзіная прычына, з-за якой сталыя людзі аказваюцца ў «чужых» сценах.

— Я жыла з сынам, але сын страціў працу, і стала зусім цяжка — у рэшце рэшт, так і патрапіла сюды, — распавядае жыхарка аддзялення кругласутачнага знаходжання Таццяна Цімафееўна Каўгарэня. — Са сваёй вёскі Зялёнкі з'язджаць было цяжка, часам нават думала, што лепш ужо памерці. Але потым прызвычаілася, і цяпер мне нават падабаецца. Бо ўмовы тут добрыя, а яшчэ ёсць магчымасць спакойна займацца любімымі справамі — плесці дыванкі, даглядаць за жывымі кветкамі ці рабіць штучныя.

Пражыванне ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання, зноў жа, часовае. Паводле агульнага правіла, у ім можна заставацца не больш за шэсць месяцаў у год — на ўвесь гэты час пенсіянерам і інвалідам гарантуецца месца ў адным з пакояў, харчаванне, медыцынскія паслугі. Аднак у любым правіле ёсць выключэнні. Некаторыя жывуць тут пастаянна. І пры гэтым катэгарычна адмаўляюцца пераязджаць у «звычайныя» дамы-інтэрнаты ў суседніх раёнах.

Адзін дасужы, ды не дужы

Стварэнне аддзялення кругласутачнага знаходжання — гэта грошы. Аднак выдаткі апраўдваюцца. Пражыванне ў аддзяленні абыходзіцца танней, чым у тым жа доме-інтэрнаце. У дадатак пры пераездзе старога адзінокага чалавека на часовае месца жыхарства ў тэрытарыяльны цэнтр ёсць магчымасць нават крыху зэканоміць — скажам, на рамонтах дамоў ці забеспячэнні палівам.

— Акрамя чыста эканамічных момантаў, не трэба забывацца пра галоўнае: пераезд у сацыяльную ўстанову паблізу ад сваіх родных мясцін старыя людзі сапраўды пераносяць менш хваравіта, — зазначае намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Тамара Антанавіч. — Таму на Міншчыне ўжо працуюць шэсць такіх аддзяленняў у Бярэзінскім, Любанскім, Мінскім, Мядзельскім, Слуцкім і Чэрвеньскім раёнах, а ў наступным годзе гэты спіс папоўніць і Клецкі. У дадатак да 2015 года ў вобласці з'явіцца ўстанова цалкам новага кшталту — дом-інтэрнат павышанай камфортнасці. Зразумела, што пражыванне ў ім будзе платным. Аднак няма сумненняў у тым, што падобны інтэрнат стане запатрабаваным.

Галоўнае захапленне Таццяны Каўгарэні — кветкі.

Між тым, пераезд у сацыяльную ўстанову — варыянт сапраўды крайні. Прычым часцяком шанцы абысціся без гэтай кардынальнай меры ёсць.

— Калі старому чалавеку становіцца цяжка спраўляцца з хатнімі справамі, а тым больш, калі гэты чалавек жыве адзін, мы прапануем, каб да яго прыходзіў сацыяльны работнік, — распавядае начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Любанскага райвыканкама Марыя Алейнік. — Прычым з улікам таго, што адзін сацыяльны работнік можа зрабіць не ўсё, мы аб'ядналі іх у мабільныя брыгады — такая брыгада створаная ў кожным сельсавеце. У выніку ж з'явілася магчымасць сумеснымі намаганнямі выконваць больш складаныя пажаданні пенсіянераў і інвалідаў — напрыклад, просьбы паклеіць шпалеры ці скласці дровы.

Месца сустрэчы не змяняюць

Але аказанне паслуг на дому — далёка не ўсё. Населеныя пункты, дзе з усёй «інфраструктуры» ёсць хіба што аўталаўка, часцяком маюць асаблівую патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы. Бо большасць жыхароў у такіх вёсках — пенсіянеры.

— У нашай вёсцы Дварэц пражывае ўсяго 80 чалавек, пры гэтым 44 з іх ужо на пенсіі, — кажа старшыня Малагарадзяціцкага сельскага Савета Міхаіл Камінскі. — Зразумела, што пры такой раскладцы ніякіх сацыяльных аб'ектаў у Дварцы няма. Але гэта не значыць, што вяскоўцам тут нічога не патрэбна. Таму ў свой час было прынятае рашэнне: адчыніць у будынку былога мясцовага клуба дом сацыяльных паслуг. Раз у месяц у гэтым доме ладзіцца прыём урача, раз у два месяцы праводзяцца сходы з удзелам прадстаўнікоў сельвыканкама і сельгаспрадпрыемства, міліцыі, пажарных і супрацоўнікаў сацыяльнай службы, і тут жа праходзяць невялікія канцэрты, арганізоўваюцца выставы народных умельцаў. Адразу ж давялося пераканацца, што справа гэта вартая. Асабліва калі ўзяць пад увагу, што адлегласць ад вёскі Дварэц да райцэнтра — з паўсотні кіламетраў.

Безумоўна, наяўнасць адміністрацыйнага будынка — момант вельмі важны, аднак зусім не абавязковы. У в. Татарцы Соснаўскага сельсавета пайшлі крыху іншым шляхам — тут домам сацыяльных паслуг стала хата... вясковага старасты.

— Калі дом сацыяльных паслуг бярэцца даглядаць сацыяльны работнік, то мы можам прапанаваць прынамсі маленькае матэрыяльнае заахвочванне — дзве базавыя велічыні ў квартал, — адзначае Марыя Алейнік. — Аднак калі гаспадаром у такім доме становіцца вясковы староста ці дэпутат сельскага Савета, то ніякіх выплат не робіцца ўвогуле. Але людзі гаспадараюцца ахвотна. І гэтаксама ахвотна ідуць на стварэнне дамоў сацыяльных паслуг сельсаветы. На першы погляд, наважыцца на такі крок ім няпроста, ад самага пачатку вядома, што той жа сельвыканкам будзе ўтрымліваць дом сацыяльных паслуг менавіта на сваім балансе. Аднак практыка паказвае: вялікіх выдаткаў тут няма. Утрымліваць дом дапамагаюць і мясцовыя сельгаспрадпрыемствы, і самі вяскоўцы. Бо ці не кожны разумее: усё гэта — перш-наперш для іх.

Сяргей ГРЫБ.

Любанскі раён.

НОВАЯ ФОРМА... СА СТАРЫМ ЗМЕСТАМ?

Чаму жыльцы пакуль не спяшаюцца ў домаўладальнікі

Юрый Дудкін каля «сваіх» дамоў.

На рэспубліканскім семінары ў Слуцку падводзілі вынікі агляду тэхнічнага стану жыллёвага фонду ў гарадах сярод ЖЭСаў і асацыяцый домаўладальнікаў. Па тэхнічным стане дамоў і добраўпарадкаванні прыдворовых тэрыторый адным з лепшых прызнана асацыяцыя ўласнікаў сумеснага домаўладання «Маладосць—Орша», якой кіруе Юрый ДУДКІН.

— Гэта пакуль першае і адзінае домаўладанне ўласнікаў як у горадзе Оршы, так і Віцебскай вобласці. Існуе яно на працягу пяці гадоў. Аб'ядноўвае на сучасным этапе 490 кватэр шматпавярховых дамоў у новым мікрараёне. Дамы нядаўна пабудаваныя, у кватэрах жывуць у асноўным маладыя сем'і. Таму ў назве асацыяцыі выкарысталі слова «маладосць».

Юрый таксама малады, яму 31 год. Пяць гадоў таму купіў у новым мікрараёне кватэру і прапанаваў арганізаваць у сваім доме асацыяцыю домаўладальнікаў — як альтэрнатыву ЖЭСам. Тады і выбралі яго кіраўніком. Паступова ў склад асацыяцыі ўвайшло яшчэ пяць дамоў.

Грошы кватэранаймальнікаў за камунальныя паслугі паступаюць на разліковы рахунак асацыяцыі. Пасля гэтага ў першую чаргу аплачваюцца паслугі абслуговых прадпрыемстваў: спецаўтабазы, водаканала і іншых. Потым вызначаная сума грошай выдзяляецца на заробак персаналу (13 чалавек). А тое, што засталося, траціцца на гаспадарчыя патрэбы: матэрыялы і рамонт. Пры гэтым сродкі, што паступаюць на капітальны рамонт, не выкарыстоўваюцца па дробязях, а мэтанакіравана накопліваюцца.

— Заяўкі на дробязны рамонт сцякаюцца да старшага па дому ці — па званках — у нашу кантору. Рамонты пад'ездаў праводзяцца практычна штогод, у крайнім выпадку, пры недахопе сродкаў, хоць сцены стараемся пафарбаваць, — тлумачыць Юрый. — За апошнія два гады накоплівалі грошы на рахунку, каб добраўпарадкаваць дзіцячую і спартыўную пляцоўкі каля сваіх дамоў. Дзіцячую сёлета абсталявалі, а спартыўнай запланавалі заняцца на наступны год.

За пяць гадоў дзейнасці асацыяцыі домаўладальнікаў Юрый Уладзіміравіч паспеў разгледзець і станоўчы, і негатыўны бакі такой формы абслугоўвання.

У кватэранаймальнікаў — членаў асацыяцыі — адказнасць за своечасовую аплату камунальных паслуг вышэй, бо ўсе ведаюць, што на гэтыя грошы ўтрымліваюцца ў належным парадку дамы, добраўпарадкоўваюцца тэрыторыі вакол іх. У шасці шматпавярховіках менш за дзясятак неплацельшчыкаў. Гэта кватэранаймальнікі, якія сапраўды аказаліся неплацежаздольнымі з-за крытычных жыццёвых абставінаў. Звычайна ж сям'я не можа сабе дазволіць жыць у доме за чужы кошт, бо тады іншыя жыльцы не дадуць праходу: альбо плаці за пражыванне, альбо з'язджай. У асацыяцыі домаўладальнікаў адказнасць за вынік сваёй работы адчуваюць і сантэхнікі, і дворнікі, і электрыкі — бо кантроль з боку жыльцоў і адміністрацыі вышэй, чым у ЖЭСах. Выконваюць як след свае абавязкі старшыя па дому і па пад'ездах: смялей робяць заўвагі жыльцам, калі тыя вядуць сябе не па-гаспадарску.

Падрыхтоўка будынкаў да зімы, у тым ліку і ацяпляльнай сістэмы, праводзіцца сіламі свайго абслуговага персаналу і з дапамогай свайго абсталявання, каб зэканоміць на сродках. Людзі стараюцца рабіць гэта, зноў жа, якасна, бо самі жывуць у гэтых кватэрах.

Але адразу напрошваецца пытанне: калі работа ў асацыяцыі домаўладальнікаў прыносіць плён, то чаму вопыт не распаўсюджваецца далей — па горадзе і вобласці?

— У першую чаргу таму, што асацыяцыя апошнія гады адчувае недахоп сродкаў — на тое ж добраўпарадкаванне тэрыторый і бягучы рамонт. Трэба зрабіць дзіцячыя пляцоўкі каля кожнага дома, бо ў маладых сем'ях падрастаюць малыя дзеці. А мы здолелі абсталяваць за апошнія два гады толькі адну пляцоўку, — кажа Юрый Уладзіміравіч. — Не хапае сродкаў і на якасныя матэрыялы для паўсядзённых рамонтных работ. Сантэхнікам, дворнікам плацім столькі, колькі і ў дзяржаўных ЖЭСах. І паступова набліжаемся — у горшым разуменні гэтага слова — да ўзроўню іх работы. Жыльцы іншы раз так і кажуць: аднолькава, што ЖЭС, што асацыяцыя. Яны, дарэчы, таксама не ўсведамляюць сябе цалкам уласнікамі і жывуць па-ранейшаму, як прывыклі. Калі за апошні месяц у бухгалтэрыі налічылі за ваду на тысячу рублёў больш, чым у суседнім ЖЭСе, то жыльцы выказалі мне як кіраўніку пратэст, не зважаючы на падлікі па расходзе вады.

Каб падняць аўтарытэт домаўладальнікаў, трэба знайсці шлях для прытоку сродкаў у асацыяцыю, лічыць Юрый Дудкін. У верасні тут плануюць распачаць аказанне платных паслуг жыльцам. Не факт, што такая дзейнасць раскруціцца, сцвярджае кіраўнік, бо для гэтага трэба мець у штаце спецыялістаў высокага ўзроўню, тых жа класных сантэхнікаў. А яны пойдуць у штат, калі там прапануюць адпаведны заробак. Якраз гэта асацыяцыя домаўладальнікаў і не можа забяспечыць.

Напэўна, не толькі свядомасць людзей яшчэ не дарасла да псіхалогіі сапраўдных домаўладальнікаў... Галоўнае, што не створаны эканамічныя прадпасылкі, каб можна было зарабляць у камунальнай сферы. Таму і нецікава тут працаваць ні прыватнаму капіталу, ні самім жыльцам.

Вольга ШУТАВА. Фота аўтара.

«МАЛОЧНЫЯ» СТРАТЫ І ПРЫБЫТКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Анатоль ХАЛОПІЦА, старшыня Юшавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Нясвіжскага раёна:

— У нас закупкамі лішкаў малака ў насельніцтва займаецца менавіта сельскі Савет. Ёсць свой малакавоз, які мы набылі за грошы ад «малочнага» прыбытку (часткова дапамог аблвыканкам). Ёсць свае вадзіцель, малаказборшчык, лабарант і бухгалтар, якія абслугоўваюць каля 115 падворкаў (а агульнае пагалоўе — 147 кароў). Кожны дзень малаказборшчык аб'язджае ўсе населеныя пункты, перыядычна бярэ пробы малака на аналіз і перадае лабаранту. За дзень правяраецца каля трыццаці пробаў. Па паказчыках і аплата — апарат жа не падманеш...

Мы даўно ўжо так працуем, але паколькі пагалоўе насельніцкай жывёлы ўвесь час скарачаецца, адпаведна змяншаецца і наш прыбытак. Пакуль яшчэ ён ёсць, хоць і невялікі. Хапае (пасля выплаты заробку, падаткаў, набыцця паліва) яшчэ і на рамонт малакавоза, і на дробныя расходы, тыя ж канцылярскія. Без прыбытку мы гэтым не займаліся б... Але калі ў людзей застанецца нейкіх 60—70 кароў, дык нават на бензін не заробім. Бо фінансава ў гэтай справе нам ніхто не дапамагае, абапіраемся толькі на свае сілы.

Малако возім у Нясвіж, за кожную здадзеную тону атрымліваем 120 тысяч рублёў (дарэчы, гэтая цана даўно не мянялася). У нашым раёне шмат сельскіх Саветаў займаецца закупкамі малака. Безумоўна, гэта складана — само сабой нічога ж не робіцца. Трэба тры разы на месяц разлічыцца з людзьмі за здадзенае малако, прычым наяўнымі грашыма — інакш кажучы, тры разы прывезці гэтыя грошы і раздаць... А пастаянныя пытанні з тлустасцю, з антыбіётыкамі, з вяртаннем малака!.. Ды яшчэ з малаказборам, з палівам, з запчасткамі... З іншага боку, калі б не займаліся гэтым, дык сядзелі б без грошай. Цяпер на месцах прымаюцца рашэнні аб перадачы функцый па закупе малака калгасам. Але я сказаў, што ў блізкім часе не збіраюся гэта рабіць. Бо ў іншым месцы грошай мы дакладна не знойдзем.

Аляксандр ПІНЦЭВІЧ, старшыня Слабодкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна:

— Пакуль што зборам лішкаў малака ў нас займаецца непасрэдна сельскі Савет. Два зборшчыкі штодзень аб'язджаюць усе вёскі на гужавым транспарце. Ёсць дамоўленасць з сельгаспрадпрыемствам «Кісялевічы», дзе мы перыядычна робім аналіз пробаў. Там жа вырашаюцца і спрэчныя моманты па якасці малака. Далей здаём яго праз Бабруйскі пункт збору на Асіповіцкі малаказавод.

Пытанні сёлета ўзнікалі ў сувязі з наяўнасцю антыбіётыкаў у малацэ аднаго з населеных пунктаў — заўсёды ж знаходзяцца гаспадары, якія лечаць карову самастойна і здаюць малако, не зрабіўшы папярэдніх аналізаў. Але на працягу двух апошніх месяцаў мы шчыльна папрацавалі з людзьмі. На адным з апошніх сходаў вырашылі: калі вяртанне малака адбудзецца па віне канкрэтнага малаказдатчыка, то ўвесь вернуты аб'ём будзе перакладзены на яго «плечы» — з яго вылічаць гэтыя літры. Да слова, апошнім часам па тым населеным пункце не было ніводнага вяртання.

І ўсё ж я лічу, што сельскі выканаўчы камітэт — гэта ў першую чаргу орган дзяржаўнай улады, а не суб'ект гаспадарання. Цяпер вось думаем над тым, каб перадаць функцыі па зборы малака ад насельніцтва прыватнаму прадпрымальніку. Але, незалежна ад таго, хто працягне гэтым займацца, па многіх пытаннях людзі ўсё роўна будуць звяртацца да нас.

Наталля УЛАДЗІМІРАВА.

Чалавечны падыход

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Зман другі. Законы ствараюцца ў Мінску і не маюць нічога агульнага з рэальным жыццём на месцах

— Я заўжды цікаўлюся меркаваннем сваіх выбаршчыкаў па законапраектах, якія разглядаюцца ў парламенце, — кажа намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях. — Мне паступіла шмат цікавых слушных прапаноў, напрыклад, па Кодэксе аб адукацыі.

Жыхары Лепельшчыны, напрыклад, просяць прыбавіць у школьным раскладзе яшчэ адну гадзіну на вывучэнне замежнай мовы (каб было не менш за тры ў тыдзень). Тамтэйшыя рацыяналізатары прапануюць і адмысловую сістэму па размеркаванні грошай. Вызначыць нарматыў фінансавання — колькі грошай варта вылучаць на адукацыю аднаго вучня. Прычым нарматыў гэты, на іх погляд, павінен вар'іравацца ў рэгіёнах: для сталіцы — адна сума, для райцэнтра — іншая.

Узаемаінфармаванне дэпутата і выбаршчыкаў не спыняецца і пасля ўвядзення законаў у дзеянне.

— Вельмі важна даводзіць новаўвядзенні да ведама насельніцтва, — адзначае парламентарый. — Вось напрыклад, што датычыць прадпрымальнікаў. У Чашніцкім раёне прадпрымальніцтва знаходзіцца пакуль, так бы мовіць, на шляху станаўлення. У Лепельскім — больш развітае. І над многімі пытаннямі, з якімі яны звяртаюцца да мяне, якраз і працуе Урад. Да прыкладу, падатковыя льготы, спрашчэнне бухгалтарскага ўліку і гэтак далей. Не менш важна атрымліваць інфармацыю з месцаў, каб ацаніць, як спрацоўвае закон, што яшчэ можна ўдасканаліць.

Зман трэці. У дзяржаўным апараце правая рука не ведае, што робіць левая

— Работа з насельніцтвам у нас цяпер дакладна арганізаваная. Усё адладжана такім чынам, каб праблемай займаліся непасрэдна на месцы. І менавіта кампетэнтная структура, якая непасрэдна за гэты кірунак дзейнасці адказвае. Гэта дазваляе вырашаць пытанні больш аператыўна, спрашчае работу ўсіх службаў, павышае эфектыўнасць іх функцыянавання. У чалавека няма неабходнасці прастойваць у чарзе ўвесь дзень, каб патрапіць на прыём і паскардзіцца на зламаную фортку. Навошта шукаць дапамогі, скажам, у вобласці, калі яе могуць аказаць у раёне — значна больш хутка і лёгка?!

А ўжо ў ачагу вялікай бяды работа ўсіх галінаў улады праходзіць супольна.

— На стадыі разгляду таго ці іншага пытання межы паміж галінамі ўлады сціраюцца, — упэўнены Анфім Міхалевіч. — Самым з праблемамі рэгіёна не застаецца ні дэпутат парламента, ні дэпутат мясцовага Савета, ні старшыня выканкама. Гэта наша агульная цаліна, і мы ўздымаем яе талакою.

Парламентарыю без мясцовых уладаў, на думку спадара Міхалевіча, не абысціся:

— Супрацоўніцтва дэпутата парламента з мясцовымі ўладамі вельмі важнае. Ужо хоць бы таму, што на пасяджэннях выканкаму прымаюць падзаконныя акты. А гэта ці не самае галоўнае! Такія дакументы вызначаюць, як будзе рэалізоўвацца закон, якія калізіі і супярэчнасці яго выкананне можа выклікаць, — дзеліцца з намі Анфім Міхалевіч. — Удзел у сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў, прысутнасць на іх мерапрыемствах дазваляе быць у курсе актуальных праблем мясцовасці і збіраць прапановы з месцаў адносна заканадаўчых зменаў.

Цяпер дэпутаты ўсе разам змагаюцца за большую самастойнасць мясцовых бюджэтаў.

— Так атрымліваецца, што сродкі бюджэту асядаюць у галаўным прадпрыемстве, а мясцовыя філіялы застаюцца ні з чым, — са шчырай заклапочанасцю расказвае народны абраннік.

Выказаўся пра набалелае ён і міністру фінансаў падчас разгляду законапраекта аб бюджэце на наступны год. І атрымаў станоўчы адказ: прынятае прынцыповае рашэнне — на месцах змогуць распарадзіцца гэтымі сродкамі. Дарэчы, дэцэнтралізацыя асобных расходаў — адна з прыкметных рыс новага бюджэту. Вось вам і яшчэ маленькая сумесная перамога ў сваёй акрузе.

Зоя ВАРАНЦОВА.

СЕЛЬСКІ САВЕТ СА СВАІМ КАМЕНЕМ

На тэрыторыі Сялявіцкага сельсавета Слонімскага раёна з'явіўся камень з інфармацыйнай дошкай.

На дошцы паведамляецца, што выканаўчы камітэт быў арганізаваны ў 1941 годзе. У склад сельсавета ўваходзяць 6 вёсак.

Тут жа заходзіцца інфармацыя пра тое, што на тэрыторыі сельсавета жылі беларускі паэт Валянцін Таўлай, нарадзіўся літаратуразнаўца Янка Саламевіч, а таксама доктар філалагічных навук, паэт Мікола Арочка. Дарэчы, апошні з іх ужо шмат гадоў жыве ў роднай вёсцы Вецявічы, а Янка Саламевіч — у Мінску.

Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.

ПРЫТРЫМЛІВАЦЦА АБСАЛЮТНАЙ КАНКРЭТЫКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Аналіз выявіў, што пераважная большасць пытанняў, з якімі грамадзяне звяртаюцца ў органы ўлады больш высокага ўзроўню, магла быць вырашана на месцы, на ўзроўні раёна, горада, сельсавета. Аднак старшыні сельвыканкамаў сёння аказаліся не гатовыя працаваць у межах новага прававога поля, вызначанага Указам № 21.

— Згодна з гэтым дакументам, уся інфраструктура тэрыторыі сельсавета (сістэмы водазабеспячэння і водаадвядзення, дарогі, электрасеткі і г.д.) перададзена на баланс спецыялізаваных службаў. Калі раней да старшыні сельвыканкама прыходзілі са скаргай на стан «нічыйнай» дарогі, ён як першая асоба сельсавета, нават не маючы сродкаў, шукаў спосаб яе ўпарадкаваць (звяртаўся па дапамогу ў базавы СВК, у ДРБУ і г.д.). Сёння старшыня піша пісьмо балансаўтрымальніку (у ДРБУ, ці ў іншую спецыялізаваную арганізацыю), рэгіструе зварот і ... здымае пытанне са свайго кантролю. Маўляў, гэта ж цяпер не яго клопат. Гэта даволі сур'ёзная сітуацыя, якая склалася сёння, таму Мінаблвыканкам даў устаноўку старшыням пярвічнага звяна ўлады — не здымаць пытанне з кантролю да выканання заяўкі. Адпаведна, спецыялізаваныя службы, куды накіравана заяўка, павінны трымаць справаздачу перад мясцовым органам улады наконт вырашэння праблемы.

Нягледзячы на ўзмацненне кантролю за работай са зваротамі грамадзян, выпадкі фармалізму і валакіты, на жаль, цалкам выключаць нельга і сёння. Аднак не трэба забывацца на «рычагі ўздзеяння», якія прымяняюцца да неруплівых чыноўнікаў. Толькі за неналежнае выкананне сваіх службовых абавязкаў (парушэнне парадку разгляду зваротаў грамадзян, фармалізм) да 21 службовай асобы вобласці Мінаблвыканкамам былі прыменены меры дысцыплінарнага спагнання. Райвыканкамамі прыцягнуты да адказнасці 78 службовых асобаў.

Напрыканцы размовы Алена Меляшкевіч падкрэсліла, што патрабаванні да работы са зваротамі грамадзян узрастаюць — адпаведна павінна ўзрастаць і адказнасць чыноўнікаў.

Інга МІНДАЛЁВА.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Толькі для жанчын

ЦІШЭЙ ЕДЗЕШ... ТАНЕЙ БУДЗЕШ

Журналістка «Звязды» выпрабавала на сабе «залатое правіла» пахудзення

Наталля КАРПЕНКА

Прызнаюся шчыра — я не збіралася пісаць гэты артыкул. І, напэўна, наўрад ці рызыкнула б зрабіць яго набыткам грамадскасці, калі б не настойлівыя пытанні знаёмых і калег накшталт «як табе гэта ўдалося?».

Адразу хачу папярэдзіць: усё, напісанае далей, не падмацавана ніякімі навуковымі тэорыямі ці даследаваннямі і з'яўляецца ўсяго толькі вынікам досведу (ці лепш сказаць, эксперыменту) аднаго чалавека — аўтара гэтых радкоў — у барацьбе з лішняй вагой. (А, як вядома, што для аднаго добра — для іншага можа ўвогуле не падысці.)

Памыляецца той, хто лічыць, што нашы асабістыя праблемы — вынікі нейкіх вонкавых абставінаў. Насамрэч, усё, што з намі адбываецца ці, наадварот, не адбываецца — гэта працяг нашага ладу жыцця, звычак і асаблівасцяў характару. Лішнія кілаграмы ў большасці выпадкаў з'яўляюцца «працягам» звычкі памногу есці, падоўгу сядзець ці ляжаць, мала рухацца, ігнараваць фізічныя нагрузкі, часта карыстацца паслугамі пунктаў хуткага харчавання. Пра гэта ўжо столькі напісана, што не варта паўтарацца.

Гадоў... цацаць таму мая вага не перавышала 54—55 кілаграмаў. Яна трымалася на адным узроўні дастаткова працяглы час, прычым без асаблівых намаганняў з майго боку. Я не была фанатам спартзалы, не любіла зарадку і ела ўсё запар, прычым тады, калі хацелася. Аднак кілаграмы не прырасталі — дзякуючы, напэўна, добраму абмену рэчываў і спецыфіцы прафесіі (журналіста, як вядома, ногі кормяць, а падчас хуткай хады адпаведна спальваюцца і калорыі).

Але з цягам часу прафесійныя «дыстанцыі» станавіліся ўсё больш кароткімі, затое стрэсы — больш частымі. А для жанчыны самае эфектыўнае лякарства ад стрэсу — гэта кавалак любімага торта, з'едзены на ноч перад тэлевізарам. Словам, за адносна невялікі прамежак часу (6—7 гадоў) я ўмудрылася набраць каля 20 кілаграмаў. Не скажу, што яны надта абцяжарвалі жыццё, але да прыемнага набытку таксама не адносіліся. Са звыклага айчыннага 44-га памеру я дастаткова хутка пераскочыла ў 48-ы, потым — у 50-ы і, нарэшце, у 52-і... У працэсе высветлілася, што ўсё жаночае адзенне падзяляецца на два віды: тое, якое падкрэслівае вартасці, і тое, якое хавае недахопы. Прычым у гардэробе адной жанчыны яны чамусьці не сумяшчаюцца...

Але гэта яшчэ можна было неяк перажыць. Іншая рэч — дактары. Не згаворваючыся, неўрапатолаг і гастраэнтэролаг недвухсэнсоўна намякнулі, што многія і многія праблемы са здароўем напрамую залежаць ад вагі, і далікатна параілі стрыножыць апетыт. «А інакш у наступны раз мы з вамі сустрэнемся з больш сур'ёзнай нагоды», — падліў масла ў агонь эндакрынолаг, абводзячы чырвоным кружочкам паказчык узроўню цукру ў аналізе маёй крыві.

Кожны, хто хоць аднойчы спрабаваў змагацца з уласнай вагой, ведае, які гэта нялёгкі і пакутлівы працэс. На працягу апошніх гадоў я неаднойчы выпрабоўвала на сабе самыя разнастайныя спосабы пахудзення, пачынаючы ад кефірнай дыеты Ларысы Долінай і заканчваючы 9-дзённай дыетай Лаймы Вайкуле (тры дні — толькі рыс, яшчэ тры дні — белае курынае мяса і тры дні — яблыкі). Прыйшла да высновы, што ўсе яны — калі не поўнае глупства, дык удар па здароўі і псіхіцы дакладна. Ну, **немагчыма тыдзень сядзець на адным кефіры, перыядычна клюючы вараную рыбку ці бульбінку, і пры гэтым захоўваць адэкватнае светаўспрыманне.** Да таго ж, пасля сямідзённага галадання апетыт разгараецца так, што страчаныя 5-6 кілаграмаў вяртаюцца імгненна, прыцягнуўшы за сабой яшчэ парачку.

Зусім выпадкова (хоць у жыцці, на мой погляд, не бывае выпадковасцяў), гартаючы адно з расійскіх выданняў, патрапіла на інтэрв'ю з Таццянай Дзячэнка, дачкой Барыса Ельцына, дзе яна падрабязна распавядала пра тое, як перамагла лішнюю вагу. Магчыма, я не звярнула б увагі на чарговы «піяр», калі б артыкул не аздабляліі адпаведныя фотаздымкі Таццяны Барысаўны «да» і «пасля». Розніца была ўражвальная... Дзячэнка расказала журналістам, што дамовілася з некалькімі сваімі сябрамі раз на тыдзень сустракацца ў каго-небудзь дома, дзе кожны павінен «прылюдна» станавіцца на вагі. Фішка заключаецца ў тым, што ў наступны раз абавязкова неабходна важыць менш, чым у папярэдні. Таго, хто праштрафіцца (прыбавіць у вазе), чакае пакаранне, якое агаворваецца і прапануецца кожнаму загадзя, яшчэ перад пачаткам «гульні». Пакаранні хоць і жартоўныя, але не вельмі прыемныя — напрыклад, адзін з удзельнікаў эксперыменту, які за тыдзень не здолеў скінуць ні грама, вымушаны быў цэлы месяц ездзіць на працу на ярка-руковым аўто.

Такі падыход да вырашэння праблемы з лішняй вагой падаўся мне эфектыўным, і я вырашыла ўзяць яго за аснову (праўда, адкінуўшы прылюднае ўзважванне і «штраф»).

Цяпер пра матывацыю. **У справе пахудзення яна — адна з галоўных умоў поспеху. Абавязкова павінна мець месца сур'ёзная прычына, з-за якой ты збіраешся пачаць новае жыццё.** Прычынай могуць стаць праблемы са здароўем, зайздрасць, пачуццё непаўнавартасці, крыўда, жаданне камусьці спадабацца... Ды што заўгодна! Галоўнае, каб гэта было моцным штуршком, пасля якога арганізм настроіцца на «баявы лад».

Другая (пасля матывацыі) неабходная ўмова для дасягнення мэты — вагі. Пажадана набыць у краме самыя дакладныя, тыя, што будуць выдаваць «паказчыкі» не толькі ў кілаграмах, але і ў грамах. Вагі — гэта гарант аб'ектыўнасці, яны не ілгуць, як бы хто на гэта ні разлічваў. Затое здольныя выдаць «бонус» за першыя страчаныя грамы — у выглядзе вашага прыўзнятага настрою.

Я не памылілася, гаворачы менавіта пра «грамы». **Скідваць вагу «кілаграмамі» не проста бессэнсоўна, а і небяспечна.** Спецыялісты-дыетолагі недарэмна сцвярджаюць, што галівудскія актрысы, якія даводзяць сябе да неймавернай худзізны паскоранымі тэмпамі, вось-вось пачнуць выміраць. За апошнія некалькі гадоў сярэднестатыстычны памер галівудскай «зоркі» ўпаў з 6-га (наш 46-ы) да нулявога (наш 40-ы). Тыя ж дыетолагі настойліва раяць усім, хто хоча пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў, набрацца цярпення і забыць пра слова «хутка» — каб не ўводзіць у стан шоку свой арганізм. Аптымальным варыянтам лічыцца пахудзенне на 3-4 кілаграмы ў месяц, не больш. Такім чынам за паўгода можна скінуць як мінімум 18 кілаграмаў.

Спытайце ў любой сярэднестатыстычнай жанчыны: ці хацела б яна пахудзець? Дзевяць з дзесяці адкажуць «так», прычым незалежна ад уласнай камплекцыі. Але... пастаўце перад якой-небудзь з іх мэту пахудзець на 18—20 кг — і яна пакруціць пальцам ля скроні, бо на першы погляд задача падаецца невыканальнай. Насамрэч гэта і рэальна, і выканальна, прычым выканальна без вялікіх ахвяраванняў з пункту гледжання фізічнага і псіхічнага здароўя.

Калі «раскінуць» 18 кілаграмаў на шэсць месяцаў (выходзячы з патрабаванняў дыетолагаў), а атрыманую лічбу падзяліць яшчэ на 30 дзён, атрымаецца ўсяго 100 грамаў. Менавіта столькі (ці прыкладна столькі) давядзецца «скідваць» кожны дзень. За тыдзень павінна сысці грамаў 700. (Гэта, як вы разумееце, не абавязковыя лічбы, а ўмоўныя, прыведзеныя ў якасці прыкладу. Але асабіста я арыентавалася менавіта на іх.)

Не варта кожны дзень выцягваць з-пад ложка запаветную скрыначку з вагамі, **але першапачатковую, стартавую лічбу зафіксаваць неабходна.** А далей — рабіць штодзённыя ўзважванні (і, адпаведна, іх фіксацыю), пажадана ў адзін і той жа дзень тыдня і час. І карэктаваць свой рацыён (даруйце за гэты заалагічны тэрмін) у залежнасці ад зафіксаванай лічбы. Зразумела, што ў нейкія дні ці тыдні арганізм будзе страчваць больш, у нейкія — менш, але ў цэлым дынаміка абавязкова павінна прысутнічаць (для чаго і патрэбныя рэгулярныя ўзважванні). Калі дынамікі няма, гэта азначае, што вы або «няправільна» харчуецеся, або мала рухаецеся.

Харчаванне — гэта, напэўна, самы складаны момант, таму што змяніць свае звычкі вельмі цяжка. А ўсе табу толькі падагравоць жаданне з'есці забаронены кавалак. Памятаючы пра гэта, **я пакінула ў сваім «спісе дазволеных прадуктаў» дастаткова шырокі асартымент, але значна зменшыла аб'ём порцый і павялічыла частату ўжывання ежы.** Такім чынам, з рацыёну былі выключаны: цукар, шакалад, здобныя хлебабулачныя вырабы, тарты, пірожныя, марожанае, чыпсы, сокі, кола і іншыя салодкія напоі, а таксама ўсё вэнджанае, вострае і марынаванае, маянэз і кетчуп, тлустае мяса і каўбасы, часткова — сметанковае масла. Смажанае давялося замяніць на тушанае і варанае. Трохразовае харчаванне — на пяціразовае...

І працэс пайшоў! Прычым на працягу дня, нават па першым часе, я практычна не зведвала пачуцця моцнага голаду. У маім халадзільніку засталося мноства простых і, галоўнае, карысных прадуктаў, са праўдны смак якіх я аціаніла толькі пасля таго, як выкрасліла ўсе непатрэбныя. «І чым ты толькі жывеш?!» — здзіўляліся мае знаёмыя, не разумеючы, як можна існаваць без маянэзу і салаты аліўе, без смажанай бульбы і сыравэнджанай каўбасы, без гамбургераў і сасісак з кетчупам. Ды нармальна! На змену ранейшым прысмакам прыйшлі: нятлустае курынае мяса, рыба, яйкі, сыр, творг і іншыя малочныя прадукты, гародніна (але не бульба) ва ўсялякіх камбінацыях, ненаварыстыя супы і разнастайныя кашы (на малацэ, але без масла). На дэсерт — разынкі, курага, чарнасліў, бананы ці яблыкі, кампоты з сухафруктаў і мёд (не больш за 2 чайныя лыжкі ў дзень). Маё дзённае меню выглядала прыкладна так: сняданак — талерка аўсянай кашы на малацэ, 150 г нятлустага тварагу з разынкамі, зялёная гарбата без цукру; другі сняданак — банан; абед — кавалак нятлустай запечанай рыбы, зялёная салата з алеем, чорная гарбата з двума сухарыкамі (ці бутэрброд з сырам); полудзень — несалодкі ёгурт або шклянка кефіру; вячэра (не пазней за 19.00) — 1 яйка, салата з памідораў і 1 яблык.

Цяжкім выпрабаваннем стала адмова ад салодкага, тых жа торцікаў і шакаладу. Паступова я прывучыла сябе глядзець на кавалак торта не як на ежу, а як на прадмет, які аддаляе мяне ад галоўнай мэты (пахудзення). Часта, стоячы ў краме каля паліцы з печывам ці пірожнымі, я не знаходзіла ў сабе сілы справіцца са спакусай. Купляла парачку пірожных і прыносіла дадому. Але там... хуценька скормлівала набытае сваім хатнім.

Дарэчы, калі вы ўжо аб'явілі родным і сваякам, што селі на дыету, бо хочаце пахудзець, не здзіўляйцеся, калі яны раптам пачнуць з усіх сіл вас падкормліваць. А ў дадатак замучаюць парадамі, жартамі і кпінамі. Людзі — такія істоты... Ім падабаецца бачыць у іншых адлюстраванне сваіх слабасцяў. Падпарадкоўвацца не розуму, а страўніку — гэта агульначалавечая слабасць, а значыць, ваш крок будзе ўспрыняты як выклік. Так што спашліцеся лепш на адсутнасць апетыту, алергію ці дысбактэрыёз. Гэта спрацуе і пазбавіць ад неабходнасці нешта тлумачыць ці, яшчэ горш, апраўдвацца.

Любая дыета, якой бы ашчаднай ні была, патрабуе сістэмнасці і пэўнай канцэнтрацыі волі. Без «зрываў», безумоўна, не абыходзіцца. Я таксама часам «зрывалася» і ела што-небудзь забароненае, але... у вельмі невялікай колькасці і не часцей, чым адзін-два разы на тыдзень. А раніцай наступнага дня спакойна вяртралася да ранейшага «строгага рэжыму». Прыйшла да высновы, што ў гэтай справе ўвогуле не варта нервавацца і спяшацца. Цішэй едзеш — далей будзеш. Моцнае галаданне прыводзіць да сур'ёзных праблем са страваваннем і зачастую... да немінучай прыбаўкі ў вазе. **Як ні дзіўна, чым часцей ты ясі (правільную ежу), тым большая верагоднасць, што ў лішняй вагі не застанецца шанцаў.** Пры 5-6 разовым харчаванні мы прымушаем страўнік актыўна працаваць і не стваряем сітуацый, пры якіх арганізм гатовы (у мэтах самаабароны) ператварыць у тлушч нават ваду.

Сваю «марафонскую дыстанцыю» я пачынала паўгода таму, у сакавіку, са стартавай вагі 73 кг. Дынаміка была наступнай: 15 сакавіка — 71,6; 22 сакавіка — 71,2; 7 красавіка — 70,2; 21 красавіка — 69,0; 29 красавіка — 68,0; 16 мая — 67,3; 30 мая — 65,5 і г.д. Нічога звышнатуральнага. Калі зніжэнне вагі замаруджвалася, хадзіла дадому з працы пешшу, хуткім крокам... Цяпер, дарэчы, раблю гэта практычна пастаянна. Раніца пачынаецца з нескладаных фізічных практыкаванняў (абавязкова прыемных). Калі паспяваю, прымаю кантрасны душ (таксама без фанатызму, па прынцыпе «вельмі цёплы-летні»).

Што яшчэ? Апошні раз узважвалася напачатку верасня — 56,5 кг. На мінулым тыдні наведала сваіх дактароў: ціск і ўзровень цукру стабілізаваліся. Халестэрын, праўда, яшчэ крыху перавышае норму. Магчыма, давядзецца на нейкі час адмовіцца ад цвёрдага сыру і сметанковага масла, якое я часам дадаю ў кашу замест малака. Аднак гэта мяне абсалютна не палохае... Больш актуальнай цяпер стала праблема змены гардэроба. Але прызнаюся шчыра: яшчэ ніколі развітанне са старымі рэчамі не прыносіла мне столькі задавальнення...

ЦЯПЕРАШНІ ЎСПЛЁСК ПРАСТУДНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ — ТОЛЬКІ РЭПЕТЫЦЫЯ?

Верасень распачаўся ў гэтым годзе з рэзкага пахаладання — асабліва адчувальнага пасля працяглага лета з анамальнай спякотай. Сінхронна з паніжэннем тэмпературы пачала павялічвацца і колькасць людзей, якія кашляюць і чхаюць. А тут яшчэ і некаторыя метэаролагі «парадавалі» сваім прагнозам на будучую зіму, маўляў, зіма 2010—2011 гадоў будзе адной з самых суровых у Еўропе за апошняе тысячагоддзе. Праўда, ёсць і іншыя меркаванні наконт будучай зімы...

Прагнозы эпідэміёлагаў таксама моцна адрозніваюцца. Па словах Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Расійскай Федэрацыі Генадзя Анішчанкі, эпідэмія грыпу чакаецца на тэрыторыі Расіі ў лістападзе. Па звестках Навукова-даследчага інстытута грыпу РАМН, у гэтым годзе ахоп вірусам свінога грыпу будзе шырэйшы, чым сезонным грыпам. Справа ў тым, што да сезоннага вірусу за многія гады ў грамадзян выпрацаваўся калектыўны імунітэт, а перад свіным грыпам большасць не маюць аховы. Да таго ж імунітэт расіян падарваны анамальнай спякотай. Зараз на тэрыторыі Расіі назіраецца ўсплёск вострых рэспіраторных вірусных інфекцый у Кастраме, Пскове, Астрахані, Валгаградзе, Іркуцку, Кемераве, Чувашыі і Ямала-Ненецкай акрузе.

Украінскія медыкі чакаюць эпідэмію ўжо напрыканцы кастрычніка. А іх беларускія калегі прагназуюць эпідэмічны пад'ём у традыцыйныя для нашай краіны тэрміны — у студзені—лютым, праўда, не выключаюць, што ён можа сфарміравацца і ў снежні. Нагадаем, што летась, падчас пандэміі свінога грыпу, грыпозная хваля накрыла беларусаў напрыканцы кастрычніка, а пік эпідэмічнага пад'ёму прыйшоўся на лістапад.

Загадчыца эпідэміялагічнага аддзялення Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Алена Фісенка лічыць, што ў гэтым сезоне большасць мінчан перахворэюць на ВРВІ ў перыяд з канца верасня да пачатку красавіка і толькі 10 працэнтаў захворванняў прыпадуць на кароткі прамежак часу, які называецца эпідэмічны — звычайна ён доўжыцца ў сталіцы каля месяца. Але такой цяжкасці працякання захворвання і такой колькасці захварэлых за кароткі адрэзак часу, як летась, не чакаецца. Гэта звязана з тым, што ў беларусаў ужо ёсць пэўны імунітэт да віруса А(H1N1), паколькі ад 40 да 50 працэнтаў насельніцтва ў той ці іншай форме мелі з ім кантакт. Мяркуецца, што А(H1N1) будзе паводзіць сябе як вірус сезоннага грыпу, а цыркуляваць ён будзе на працягу яшчэ некалькіх бліжэйшых гадоў.

Эксперты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у сваю чаргу, не выключаюць, што ў пасляпандэмічны перыяд падчас лакалізаваных успышак рознага маштабу могуць назірацца істотныя ўзроўні перадачы віруса А (H1N1). Падчас пандэміі А (H1N1) выціснуў іншыя вірусы грыпу і стаў дамінуючым, але цяпер сітуацыя змянілася. Многія краіны паведамляюць аб змешаным складзе вірусаў грыпу, што тыпова для сезонных эпідэмій. Эксперты СААЗ таксама не выключаюць, што вірус свінога грыпу па-ранейшаму можа выклікаць цяжкую форму захворвання (вірусныя пнеўманіі) у маладых людзей і цяжарных жанчын. Групы, якія лічыліся падчас пандэміі групамі высокай рызыкі, верагодна, такімі і застануцца ў бліжэйшы час. Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўжо выпусціла дадатковыя рэкамендацыі для пасляпандэмічнага перыяду, якія ўключаюць парады па эпідэміялагічным і вірусалагічным маніторынгу, вакцынацыі і аказанні медыцынскай дапамогі.

У беларускай сталіцы, дарэчы, ужо распачалася вакцынацыя супраць грыпу за сродкі грамадзян. Ва ўстановы аховы здароўя паступілі дзве вакцыны — французская «Ваксігрып» і расійская «Грыпол Плюс». Чакаецца таксама паступленне вакцын «Флюарыкс» (Бельгія) і «Інфлювак» (Нідэрланды). Кошт прышчэпкі ў залежнасці ад выкарыстоўваемай вакцыны і іншых умоў вар'іруецца ад 25 да 60 тысяч рублёў. Медыкі разлічваюць, што платную вакцынацыю ў 2010 годзе ў Мінску пройдуць 160 тысяч чалавек. А за кошт бюджэтных сродкаў прышчэпкамі будуць ахоплены 210 тысяч мінчан. Бясплатна прышчэпкі будуць рабіць людзям з высокай рызыкай развіцця постгрыпозных ускладненняў і інфіцыравання грыпам. Вакцыны для імунізацыі на бясплатнай аснове паступяць ва ўстановы аховы здароўя ў трэцяй дэкадзе верасня.

Спецыялісты тлумачаць, што зараз у сталіцы цыркулюе «грымучая сумесь» розных вірусаў. Усяго медыкам вядомыя каля 200 рэспіраторных вірусаў, якія выклікаюць прастуду, і кожнаму з нас дастаецца свой, хоць сімптомы ва ўсіх падобныя: гэта насмарк, дрыжыкі, павышэнне тэмпературы. У верасні пасля завяршэння сезона масавых водпускаў і школьных канікулаў адбываецца ўзаемаабмен вірусамі ў дзіцячых і дарослых калектывах. Таму цяперашні ўсплёск прастудных захворванняў з'яўляецца традыцыйным для гэтага часу года. І чуткі пра нейкі злосны вірус, які прымусіў многіх з нас і кашляць, і чыхаць, не больш чым выдумкі...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ёсць пытанне

Ці можна адмовіцца ад пробы Манту?

— Падскажыце калі ласка, ці могуць адмовіць прыняць дзіця ў дашкольную ўстанову, калі ў яго не зробленыя ўсе прышчэпкі? Калі могуць адмовіць, то на якой падставе?

Як тлумачаць спецыялісты аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, адмовіць у прыняцці непрышчэпленага дзіцяці ў дзіцячы сад могуць толькі ў тым выпадку, калі на момант яго паступлення там будзе аб'яўлены каранцін у сувязі з рэгістрацыяй у дзіцячым калектыве выпадкаў вакцынакантралюемай інфекцыі, а таксама будуць дакладныя звесткі, што дзіця не хварэла на гэтыя інфекцыі. Такая мера скіраваная, у першую чаргу, на абарону непрышчэпленага дзіцяці, якое не мае імунітэту супраць гэтых інфекцый.У іншых выпадках падстаў, каб адмовіць у прыёме непрышчэпленага дзіцяці ў дашкольную ўстанову, няма.

— Ці існуюць супрацьпаказанні для пробы Манту? У прыватнасці, як хутка можна рабіць пробу Манту пасля перанесенага інфекцыйнага захворвання? І ці магу я адмовіцца ад правядзення проб Манту майму дзіцяці?

Згодна з артыкулам 45 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя», бацькі маюць права адмовіцца (у пісьмовай форме) ад любога абследавання ці медыцынскага ўмяшання ў дачыненні да іх дзіцяці як яго законныя прадстаўнікі, у тым ліку і ад правядзення пробы Манту. Аднак ці варта гэта рабіць? Проба Манту, як тлумачаць спецыялісты аддзела эпідэміялогіі РЦГЭ і ГЗ, з'яўляецца важным сродкам ранняй дыягностыкі туберкулёзу. Для правядзення пробы Манту выкарыстоўваецца алерген туберкулёзных ачышчаны вадкі для ўнутрыскурнага прымянення. Згодна з інструкцыяй па медыцынскім прымяненні прэпарата, маецца шэраг **проціпаказанняў для правядзення туберкулінавых проб**. Гэта *скураныя захворванні, вострыя, хранічныя інфекцыйныя і саматычныя захворванні ў перыяд абвастрэння, алергічныя станы (бранхіяльная астма, ідыясінкразія з выражанымі скурнымі праявамі, рэўматызм у вострай і падвострай фазах), эпілепсія, наяўнасць каранціну па інфекцыйным захворванні* ў дзіцячым калектыве. Правядзенне дыягнастычнай пробы Манту павінна ажыццяўляцца не раней чым праз месяц пасля знікнення вышэйзгаданых клінічных сімптомаў і завяршэння каранціну па інфекцыйным захворванні ў дзіцячым калектыве. Інтэрвал паміж любой прафілактычнай прышчэпкай, біялагічнай дыягнастычнай пробай і пробай Манту павінен складаць не менш як месяц. З мэтай вызначэння супрацьпаказанняў урач ці медыцынская сястра ў дзень правядзення туберкулінавых проб павінна праводзіць апытанне і медыцынскі агляд асобаў, якія падлягаюць туберкулінавай дыягностыцы.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В СОБСТВЕННОСТЬ В г. ГРОДНО

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Расходы по подготовке земельно-кадастровой документации (руб.)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1.	Земельный участок У-15*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1029	440100000001005608	1 219 305	15 500 000	1 550 000
2.	Земельный участок У-16*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1046	440100000001005607	1 188 102	15 500 000	1 550 000
3.	Земельный участок У-17*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1103	440100000001005606	1 188 102	15 500 000	1 550 000
4.	Земельный участок У-20*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1096	440100000001005603	1 188 102	15 500 000	1 550 000
5.	Земельный участок У-21*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0993	440100000001005602	1 188 102	15 500 000	1 550 000
6.	Земельный участок У-22*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1000	440100000001005601	1 188 102	15 500 000	1 550 000
7.	Земельный участок У-23*	м-н «Барановичи-5,6»	0,1023	440100000001005600	1 157 869	15 500 000	1 550 000
8.	Земельный участок У-25*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0998	440100000001005598	1 157 869	15 500 000	1 550 000
9.	Земельный участок У-38*	м-н «Барановичи-5,6»	0,0998	440100000001005592	1 157 869	15 500 000	1 550 000
10.	Земельный участок У-53К*	м-н «Южный-4»	0,1128	440100000003004042	1 610 806	21 000 000	2 100 000
11.	Земельный участок У-54К*	м-н «Южный-4»	0,1195	440100000003004043	1 610 806	21 000 000	2 100 000
12.	Земельный участок У-55К*	м-н «Южный-4»	0,1163	440100000003004044	1 610 806	21 000 000	2 100 000
13.	Земельный участок У-56К*	м-н «Южный-4»	0,1161	440100000003004045	1 610 806	21 000 000	2 100 000
14.	Земельный участок У-57К*	м-н «Южный-4»	0,1181	440100000003004046	1 610 806	21 000 000	2 100 000

*Земельный участок победителю аукциона предоставляется на праве собственности. Инженерные коммуникации на участках отсутствуют.

Организатор аукциона: ГП «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1) Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет 3012000006896 в фил. 426 АСБ «Беларусбанк», код 199, УНП 590727594 получатель – ГП «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.

Физическое лицо: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2) Платеж за объект осуществляется по безналичному расчету в течение 10-ти рабочих дней с момента вынесения решения горисполкома о передаче земельного участка победителю аукциона.

3) Победитель аукциона обязан в течение 10-ти рабочих дней с даты принятия решения горисполкома о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы по подготовке земельно-кадастровой документации в городской бюджет.

4) Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

Аукцион состоится 30 сентября 2010 года, в 16.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2. Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2, каб. № 57, в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Заявления принимаются с 16 сентября по 24 сентября 2010 г.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720546. Адрес сайта: **www.gorod.grodno.by**

ВОСЬ ДЫК ПЕРАВАГА!

Раніцай 15 верасня ў Гродне адбылося ДТЗ, якое выклікала заторы і атрымала шырокі рэзананс.

Ля плошчы Дзекабрыстаў «Фальксваген» урэзаўся ў спадарожны «Сітраен». Пасля сутыкнення машыны павяло ў розныя бакі. «Сітраен» развярнуўся, зламаў металічную агароджу і заскочыў на газон. А «Фальксваген» занесла на паласу сустрэчнага руху. Пасля ўдару ў слуп яго адкінула на сярэдзіну вуліцы. Лёгкія траўмы атрымалі абодва кіроўцы і пасажыр «Фальксвагена».

ДТЗ здзейсніў вадзіцель таксаматорной фірмы. Яму крыху больш за 22 гады. За апошні год з нечым таксіст дзевяць разоў прыцягваўся да адказнасці за парушэнне Правілаў дарожнага руху. На гэты раз быў нецвярозы. Якой была хуткасць «Фальксвагена» да ДТЗ, сказаць цяжка, аднак пасля аварыі стрэлка спідометра застыла на адзнацы «68».

Прыехаўшы на месца здарэння, прадстаўнік таксаматорнай фірмы паспяшаўся сарваць з кузава аўтамабіля яе назву. Аднак наклейкі з нумарам тэлефона фірмы і надпісам «Перавага відавочная», а таксама шыльдай «Хуліган» на ім засталіся.

Алег ДУК,
старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 29 сентября 2010 года проводит 14-й открытый повторный аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км наработка в м/ч, (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
99.	Экскаватор ЭОВ-4421 № 911605 на КрАЗ-255 ш. 706332 дв. 15972, двигатель спец. установки СМД-14 № 150917, 3 кат.	г. Гродно, в/ч 51171	1991	11641 км 887,3 м/ч	110 000 000	11 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, в 11.00 **29 сентября 2010 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 **27сентября 2010 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **29 сентября 2010 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357, в Октябрьском отд. ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел. (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

Номер лота по порядку	Целевое назначение земельного участка	Начальная цена (руб.)	Размер задатка (руб.)	Расходы, связанные с формированием и регистрацией земельных участков (руб.)	Условие проведения аукциона	Характеристика земельного участка	Кадастровый номер
1.	Для проведения соревнований по автомотоспорту и строительства стоянки юго-западнее д. Думановщина	6 406 120	640 612	1 998 355	Наличие не менее двух участников	Площадь 6,3994 га	№ 720800000001000740

ПРИМЕЧАНИЕ: Аукцион состоится 21.10.2010 года в 15.00 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. М. Горького, 41, 2-ой подъезд, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Последний день приема заявлений –15.10.2010 года до 17.00. Информация о земельном участке по контактному телефону в г. Бобруйске 52 70 24, 52 05 34.

1. Для участия в аукционе юридическое лицо, гражданин или индивидуальный предприниматель (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);

- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка (10 % от начальной цены) на внебюджетный расчетный счет финансового отдела Бобруйского райисполкома р/с 3642081821248 в филиале 703 АСБ «Беларусбанк», код 760, УНП 700003308, назначение платежа 04002;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальный предприниматель – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представитель или уполномоченное должностное лицо юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представитель или уполномоченное должностное лицо иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представитель иностранного гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

2. Срок аренды земельного участка – 10 лет.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предметом аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отс

ЗВЯЗДА 16 верасня 2010 г.

Кароткая гістарычная даведка

ААТ «Баранавічыдрэў» заснавана ў 1946 годзе і выпускала будаўнічыя дэталі. У 1994 годзе ПДА «Баранавічыдрэў» было рэарганізавана ў Адкрытае акцыянернае таварыства, а праз два гады прадпрыемства ўключылі ў склад Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

ЯКАСЦЬ – АСНОВА ПОСПЕХУ

Генеральны дырэктар ААТ «Баранавічыдрэў» Мікалай АСОС: «Наша прадукцыя з натуральнага матэрыялу і ў яе заўсёды будуць прыхільнікі»

Сталяр-станочнік Ігар РАМАНОЎСКІ працуе на высокапрадукцыйным станку.

Дрэваапрацоўчы цэнтр — складаное высокадакладнае абсталяванне, па зададзенай праграме ён выконвае мноства аперацый. Такая тэхніка даручана вопытнаму аператару Івану СКАРАХОДУ.

Уся драўніна, якая ідзе на выраб вокнаў і дзвярэй, праходзіць строгі радыелагічны кантроль. Такія замеры з дапамогай сучаснага абсталявання праводзіць начальнік цэнтральнай лабараторыі Алена ЖЫДЗІК.

Намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Вера ШЭЛЕСНАЯ прадстаўляе навінку вытворчасці — энергаберагальны аконны блок з камбінаваных матэрыялаў.

Аптымізму не губляем

Генеральны дырэктар Мікалай Асос апавядае пра стан спраў на прадпрыемстве.

— Мікалай Станіслававіч, праблема са збытам прадукцыі існуе?

— Наша прадпрыемства вырабляе аконныя і дзвярныя блокі. Сёння на рынку менавіта гэтая прадукцыя сутыкаецца з каласальнай канкурэнцыяй. Рынак захапілі вытворцы вокнаў з ПВХ. Аналагічная сітуацыя і з дзвярыма. На Брэстчыне існуе канкурэнцыя. Толькі ў Баранавічах 2 прадпрыемствы вырабляюць тыя ж вокны і дзверы.

— І як выжываеце?

— Ставім стаўку на якасць — гэта па-першае, а па-другое — наша прадукцыя з натуральнага матэрыялу. А хіба пластмасавыя вокны можна параўнаць з драўлянымі. Стараемся манеўраваць і з цаной.

— Але ж у наш час людзі ўсё часцей замяняюць драўляныя вокны на вокны з ПВХ.

— Мода. Але не сакрэт, што багатыя аддаюць перавагу вокнам з дрэва, а ўсе астатнія ставяць пластмасавыя. Вокны з драўляных блокаў больш цёплыя і ў экалагічным плане значна чысцейшыя, чым пластмасавыя. А па даўгавечнасці дадуць фору апошнім — прастаяць 25-30 гадоў.

— Згодзен. У маёй кватэры драўляныя вокны стаяць ужо 38 гадоў, і я мяняць іх не збіраюся, а калі што, то пастаўлю драўляныя — я прыхільнік усяго натуральнага. А каму вы пастаўляеце сваю прадукцыю?

— У асноўным нашу прадукцыю купляюць будаўнічыя арганізацыі Беларусі, Расіі, Казахстана і невялікі працэнт адпраўляем ва Украіну. Для сацыяльнага жылля мы пастаўляем шчытавыя дзверы, але вырабляем дзверы і з масіву.

— А разавы заказ у вас можна зрабіць?

— Калі ласка, робім і індывідуальныя заказы. Мы выпускаем усё, што магчыма вырабіць на нашым абсталяванні (дарэчы, нямецкай вытворчасці). Напрыклад, найбольш перспектыўныя сёння энергаэфектыўныя вокны.

— Але, напэўна, ёсць і праблемы?

— А ў каго іх няма. Напрыклад, не хапае абаротных сродкаў. Удзельны працэнт энергарэсурсаў у вытворчасці давалі высокі — 10-11%. А хацелася б знізіць яго да 5%. Хаця наша кацельная працуе на адходах: апілках, кары, шчэпах. Разам з гэтым затрымак зарплаты на прадпрыемстве няма, пытанне аб скарачэнні штатаў не стаіць, а наадварот, набралі дадатковую рабочую сілу. На балансе прадпрыемства аздараўленчы лагер «Лясная казка», клуб, сталовая і другія сацаб'екты — сацыяльную сферу захоўваем.

— А сыравінай прадпрыемства забяспечана, тымі ж лесаматэрыяламі?

— Працуем напрамую з лясгасамі. А тут — толькі плаці. Раніцай грошы — вечарам крэслы. Вось такая схема працы.

— І апошняе. Будаўніцтва ў нас называюць лакаматывам эканомікі. Вы згодны з гэтым?

— Безумоўна, будоўля якраз той лакаматыў, які цягне эканоміку. Працуюць прадпрыемствы (у тым ліку і наша), якія завязаны з вырабам будматэрыялаў. І ўвогуле, чалавеку найперш патрэбен свой куток — жыллё, а затым ён набывае мэблю, халадзільнік, тэлевізар...

Так што ў будучыню мы глядзім з аптымізмам.

Прадукцыя ААТ «Баранавічыдрэў»

Прадпрыемства з'яўляецца адным з буйнейшых у Беларусі па вытворчасці сталярных вырабаў.

Сучаснае высокадакладнае абсталяванне дае магчымасць вырабляць якасную прадукцыю. Безумоўна, вялікую ролю адыгрывае прафесіяналізм работнікаў прадпрыемства. Поспех залежыць і ад упраўленчага апарату, яго вопыту. Генеральны дырэктар дасканала ведае вытворчасць, бо свой працоўны шлях пачынаў тут жа. Немалаважна і тое, што Мікалай Станіслававіч мае свой погляд на рыначную эканоміку.

А цяпер звернем увагу на прадукцыю прадпрыемства.

Не буду загружаць чытача тэхнічнай інфармацыяй, у якой неспецыялісту цяжка разабрацца. Скажу, што вокны, якія выпускаюцца на прадпрыемстве, выкарыстоўваюцца прыбудаўніцтве прэстыжных аб'ектаў не толькі ў Мінску, але і за межамі Беларусі. На ААТ «Баранавічыдрэў» вырабляецца звышцёплае акно з кампазітыўных матэрыялаў. Дзякуючы выкарыстанню пенаполіўрэтана, двухкамерных шклопакетаў, запоўненых аргонам, пакрыццяў шкла, якія прапускаюць інфрачырвонае выпраменьванне ўнутр, але не даззваляюць цяплу пакідаць кватэру, цеплаахоўная здольнасць такога акна аказалася ўдвая вышэй, чым у звычайнага. А гэта надзвычай важна, бо падчас ацяпляльнага сезона страты цеплавой энергіі праз вокны складаюць у нашых дамах да 20 % сумарных цеплавых стратаў будынкаў. Вось чаму ўзнікла неабходнасць вырашыць пытанне па зніжэнні цеплапарадачы праз аконныя канструкцыі. Звышцёплае акно значна лепш затрымлівае і шум.

Прадпрыемства мае магчымасць прапанаваць спажыўцам аконныя і балконныя блокі з палепшанымі цеплафізічнымі дадзенымі. Дарэчы, новыя цеплазберагальныя вокны знешне нічым не адрозніваюцца ад еўравокнаў.

А зараз ад аконных блокаў мы пяройдзем да дзвярных.

У цэху дзвярных блокаў вырабляюцца філянговыя дзверы з масіву сасны. Натуральны матэрыял, класічны дэкор аздаблення, адсутнасць пампезнасці — гэта візітная картка дзвярэй, якія выпускае ААТ «Баранавічыдрэў». Трэба адзначыць, што і элементы ўзорнага шкла, устаўленыя ў дзверы, падкупляюць далікатнасцю.

Пакупнікі ўсё часцей аддаюць перавагу дзвярам з натуральнага дрэва і экалогія тут адыгрывае не апошнюю ролю.

Акрамя ўчастка філянговых дзвярэй, ёсць участак фанераваных — тут выпускаюць два віды дзвярных блокаў:

♦ дзвярныя блокі фанераваныя (гладкі шпон)

♦ дзвярныя блокі фанераваныя мембранныя (з устаўленымі філёнгамі).

На прадпрыемстве ёсць лесапільны і тарны цэхі. Тут акрамя распілоўкі лесаматэрыялаў выпускаюць профільныя пагонныя вырабы і дошкі для падлогі, абшыўку, плінтус, налічнікі і поручні. У год тут выпускаецца больш 57 тыс. кубаметраў піламатэрыялаў.

На ААТ «Баранавічыдрэў» створана комплексная сістэма кантролю. Яна дзейнічае на ўсіх этапах вытворчасці: ад нарыхтоўкі драўніны да выхаду гатовай прадукцыі.

З 2006 года на прадпрыемстве ўкаранілі сістэму менеджменту якасці.

Прадукцыя ААТ «Баранавічыдрэў» высакаякасная і экалагічна чыстая, надзейная і зручная ў карыстанні.

Сацыяльны пакет

Як бы ні складвалася эканамічная сітуацыя на прадпрыемстве, а кіраўніцтва яго заўсёды імкнулася максімальна падтрымаць сваіх работнікаў — стварыць спрыяльныя ўмовы для работы і для адпачынку. На ААТ «Баранавічыдрэў» удалося захаваць аб'екты, на якіх могуць адпачыць не толькі работнікі, але і іх дзеці.

База адпачынку «Лясная казка» працуе круглы год. У гэтым аздараўленчым лагеры кожнае лета набіраецца сілаў 150 дзяцей. «Лясная казка» знаходзіцца на беразе возера Гаць, а гэта адзін з самых жывапісных куткоў у Баранавіцкім раёне. Кіраўнік прадпрыемства Мікалай Асос лічыць, што і надалей неабходна падтрымліваць традыцыі ў сацыяльнай сферы, якія склаліся яшчэ да таго, як ён узначаліў калектыў.

Не засталіся забытымі і ветэраны. Яны рэгулярна атрымліваюць ад прадпрыемства матэрыяльную падтрымку.

Калектыў маладзее. Сярэдні ўзрост работнікаў у межах 38 гадоў. І не дзіўна, што на ААТ «Баранавічыдрэў» рэгулярна праводзяцца спаборніцтвы па футболе, баскетболе, валейболе... Неаднаразова спартыўныя каманды перамагалі на першынстве вобласці. Каб былі спартыўныя дасягненні, неабходна для гэтага мець адпаведныя ўмовы, а яны на прадпрыемстве створаныя.

У 2009 годзе прадукцыя ААТ «Баранавічыдрэў» атрымала дыпломы на конкурсах: «Лепшы будаўнічы прадукт года», «Крыштальнае акно» ў трох намінацыях — «Лідар продажы драўляных вокнаў», «Самае цёплае акно» і «За адказныя адносіны да карпаратыўнага кліента».

Алена ДАЎЖАНОК, Сымон СВІСТУНОВІЧ. Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

УНН 200299909.

Асобы попыт на баранавіцкія дзверы з масіву сасны, пакрытыя шпонам дуба.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА
ААТ «Баранавічыдрэў»
225820, г. Баранавічы
пас. Усходні, 3,
тэл.: (0163) 45 40 20, 45 45 21
www.bardrev.by
bardrev@rambler.ru

Начальнік аддзела тэхкантролю Таццяна НАУМОВІЧ аглядае партыю дзвярэй для сацыяльнага жылля.

На участку, дзе праводзіцца герметызацыя шкла балконных дзвярэй.

ДРУГОЕ ЦВІЦЕННЕ ШКЛОЎСКАЙ ГРЭЧКІ

У Шклоўскім раёне ўбіраюць з палёў грэчку. Нават нягледзячы на тое, што грэчка цяпер зацвіла другім разам, фермеры разлічваюць атрымаць неблагі ўраджай і добра зарабіць на продажы насення.

На полі паблізу вёскі Старая Вадва проста не верыцца, што прыйшла восень. Грэчка пышна цвіце, над полем стаіць гул. Над кветачкамі лятае процьма пчолаў, і, як толькі глушыць матор камбайнер, пчол адразу добра чуваць. Нездарма ў кустах паблізу стаяць вуллі: цёмны грэцкі мёд будзе смачны.

Апошнім часам ад цяпла і вільгаці грэчка на шклоўскіх палях зацвіла другім разам.

Паводле інфармацыі аддзела раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама, у вобласці грэчку пасеялі на 5900 гектарах. Да гэтага часу ўбрана прыкладна 1,5 тысячы гектараў. Сярэдняя ўраджайнасць — 7,5 цэнтнера з гектара. На гэты паказчык вельмі паўплывалі летняя спякота і засуха. Цяпер жа ад вільгаці і цяпла месцамі пайшоў так званы «падгон» — на раслінах грэчкі з'явіліся свежыя бакавыя расткі з кветкамі.

Гэтае поле і камбайна ім належаць фермерскай гаспадарцы «Уласік»: **фермер Аляксандр УЛАСІК** сёлета засеяў грэчкай 85 гектараў, што складае чвэрць ад усёй яго зямлі.

— Спяшаемся ўбіраць, бо прагназуюць дажджы, — тлумачыць фермер. — Шчыра скажу, калі сеялі грэчку — спадзяваліся на лепшы вынік, спачатку нават меркавалі пра рэкордны ўраджай. Не спраўдзіліся надзеі, але і цяпер ніякага страху няма.

— Ніхто не чакаў, што Шклоўшчыну так спаліць, — скардзіцца на ўмовы надвор'я **намеснік начальніка ўпраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні Шклоўскага райвыканкама Мікалай ПАЎЛОВІЧ,** які займаецца справамі раслінаводства. — Нават у паўднёвых раёнах Магілёўшчыны здараліся дажджы, а ў нас — ні кроплі ў спякоту.

Аднак апошнімі тыднямі шклоўскія спецыялісты ў справе сельскай гаспадаркі назіраюць першы раз у сваім працоўным жыцці такую з'яву, як восеньскае цвіценне грэчкі. Прайшлі дажджы, бабіна лета прынесла камфортнае цяпло, і наверсе ўжо пасохлай грэчкі з'явіліся зялёнае лісце і пяшчотныя ружовыя кветачкі.

У руках Мікалая Паўловіча вялізны букет грэчкі:

— Глядзіце, цёмныя расліны з буйнымі крупінкамі — гэта грэчка, гатовая да ўборкі. А вось з новых кветак наўрад ці зерне атрымаецца, будзе толькі пустое.

— Напэўна, калі б цяпло яшчэ пратрымалася з месяц, то быў бы новы ўраджай грэчкі, — разглядаюць расліны і хітаюць галовамі мужчыны. — Хоць за гэты час апала б старая, гатовая да ўборкі...

Таму фермер вырашыў не чакаць, а збіраць грэчку, якая цяпер ёсць. Механізатар Іван Шынкевіч гаворыць, што ўбіраць даводзіцца паціху, каб было меней страт: «Грэчка ад цяпла і вільгаці «закаласілася», а так яна цалкам нармальная».

— У нашай гаспадарцы сярэдняя ўраджайнасць грэчкі будзе 7 цэнтнераў з гектара, але зарабіць на ўраджаі ўдасца, — гаворыць Аляксандр Уласік. — Я пакіну частку сабе на насенне, а астатняе выгадна прадам. Дзяржава вытворцаў падтрымала: закупачныя цэны днямі павялічыліся ў паўтара раза. Цяпер купцоў на грэчку шмат!

Увогуле ў Шклоўскім раёне сёлета трэба ўбраць грэчку з 720 гектараў. Працаваць на палях давядзецца яшчэ як мінімум тыдзень, а ўраджайнасць чакаецца да 10 цэнтнераў з гектара.

— За 6 гадоў, пакуль я займаюся грэчкай, толькі аднойчы пашанцавала атрымаць 20 цэнтнераў з гектара, — расказаў Аляксандр Уласік. — Будзем рыхтаваць насенне на наступны год і спадзявацца, што ў новым сезоне нас не зальюць дажджы і не спаліць сонца. Год на год не прыпадае.

Уся сабраная ў Шклоўскім раёне грэчка будзе прададзена на насенне: ужо цяпер за 1 тону шклоўцам прапануюць 3 мільёны рублёў. У асноўным грэчку вырошчваюць фермеры, і гэта культура нават пры цяперашняй сціплай ураджайнасці сапраўды прынясе ім выгаду. Мікалай Паўловіч не мае сумневаў:

— Што ж, кожны мог вырошчваць грэчку, але менавіта ў нашым раёне рызыкнулі. Таму цяпер можна і скарыстацца дэфіцытам і зарабіць на дагаворных цэнах. А на будучы год мы пасеем тысячу гектараў грэчкі.

Так, грэчка, як вядома, сёння на слыху. Яна ёсць далёка не ва ўсіх крамах, а самыя настойлівыя пакупнікі, калі знаходзяць тавар, які неўзабаве стаў дэфіцытным, бяруць адразу дзясятак пакункаў. Попыт на грэчку павялічыўся ў некалькі разоў, і ў Магілёве апошні месяц гэтых крупаў прадалі ўдвая болей ад звычайных аб'ёмаў. Праўда, на рынку ў абласным цэнтры грэчку можна набыць абсалютна свабодна: за 1 кілаграм гандляры просяць 5-6 тысяч рублёў.

На Шклоўшчыне не вераць у дэфіцыт грэчкі.

— Не, я лічу, што гэта штучнае напружанне, — гаворыць фермер Уласік. — Ураджай, вядома, не той, на які разлічвалі. Але ён ёсць, і нам хопіць. Прададзім свой ураджай у Беларусі, цэны тут выгадныя. Грэчка ў краіне павінна быць.

— Не трэба хвалявацца, — пераконвае Мікалай Паўловіч. — Ну колькі чалавеку на год трэба грэчкі? Мяркую — кілаграмаў дзесяць. Нават калі павялічацца цэны на гэтыя крупы, хопіць у нас грошай на дзясятак кілаграмаў. У маёй сям'і не спяшаюцца рабіць запасы, каб не разводзіць жукоў на кухні. Ажыятаж скончыцца — удосталь з'явіцца грэчкі на паліцах.

Ілона ІВАНОВА.
Фота аўтара.

Шклоўскі раён.

Фермер Аляксандр УЛАСІК збірае грэчку з 80 гектараў, і купцы на яго ўраджай ужо ёсць.

Ад прадзеду...

«ВЫЙДУ НОЧЧУ Ў ПОЛЕ З КАНЁМ...» НА 40 ДЗЁН

Конная экспедыцыя з Літвы паўторыць шлях князя Вітаўта да Чорнага мора

Дзесяць непрафесійных вершнікаў пройдуць ад Літвы да Чорнага мора па шляху, якім 600 гадоў таму ехаў вялікі князь ВКЛ Вітаўт. «2000 км гісторыі» — так гучыць назва адмысловага краязнаўчага праекта літоўскіх авантурыстаў: за 40 дзён удзельнікі экспедыцыі плануюць пераадолець 2000 кіламетраў. Праект стартаваў 8 верасня — разам з вершнікамі ў падарожжа выправілася і здымачная група.

Конная экспедыцыя на сваім шляху плануе наведаць больш за 20 важнейшых гістарычных аб'ектаў ВКЛ, дасягнуўшы ў выніку ўкраінскага горада Ачакава. На гэтым тыдні коннікі пераадолелі межы Беларусі. Іх шлях праходзіў праз населеныя пункты Крэва — Гальшаны — Ліда — Навагрудак — Мір — Нясвіж — Слонім — Косава — Ружаны — Брэст.

Ляснік, рэкламшчык, бізнэсмен, землеўласнік, прадпрымальнік... Сацыяльны пласт вершнікаў разнастайны: выклік гісторыі кінулі восем мужчын і дзве жанчыны.

Адна з іх — Нерынга Кулакайтэ — дзеля ўдзелу ў праекце нават згадзілася пакінуць з мужам маленькую дачку. Нерынга — выпускніца Вільнюскай акадэміі выяўленчых мастацтваў, займаецца візуальнымі праектамі. Але аматарка гісторыі ў ёй усё ж перамагае.

— Пакуль у нас не ўзнікала вялікіх цяжкасцяў, мы прытрымліваемся графіка і настроеныя аптымістычна, — гаворыць капітан экспедыцыі, віцэ-мэр Вільнюса Гінтаўтас Бабравічус. — За дзень, як і планавалася, праходзім па 50 км.

Сваё падарожжа ўдзельнікі экспедыцыі пераадольваюць на конях маларослай пароды — жамойцкай, якія вядомыя перш за ўсё сваёю вынослівасцю і кемлівасцю. Кажуць, у часы Вітаўта менавіта на такіх конях і ездзілі ваяры ВКЛ. Але на сёння яна паступова знікае. Выкарыстоўваючы для свайго падарожжа коней гэтай пароды, літоўцы спадзяюцца прыцягнуць увагу грамадскасці да яе захавання.

Ілья ЛАПАТО.

Фота www.2000kmistorijos.lt.

«БЕГ СЯБРОЎСТВА»

Сусветны бег гармоніі (World Harmony Run) — гэта самая працяглая ў свеце эстафета, у якой перадаецца факел як сімвал імкнення чалавецтва да больш гарманічнага і шчаслівага жыцця. Сёлета ён пройдзе на 5 кантынентах. Агульная даўжыня маршрутаў каля 100 тысяч кіламетраў. Упершыню прабег адбыўся ў 1987 годзе, і з таго часу амаль штогод праходзіць у Амерыцы, Еўропе, Азіі, Аўстраліі і Афрыцы. Па ўмовах эстафеты любы чалавек можа далучыцца да яе ў любым месцы маршруту. Да цяперашняга моманту мільёны людзей сталі сведкамі і ўдзельнікамі гэтай знамянальнай падзеі, перадаючы паходню з рук у рукі, ад горада да горада, ад краіны да краіны.

У 2010 годзе Сусветная факельная эстафета World Harmony Run (у Беларусі праходзіць пад назвай «Бег сяброўства») пачалася з унікальнай цырымоніі запальвання паходні ад пылаючай лавы вулкана. Міжнародная каманда з 25 краін свету, у тым ліку з Беларусі, Расіі і Украіны, адправілася на схіл вулкана Пакая недалёка ад горада Гватэмала, каб запаліць факел эстафеты.

Традыцыйна агульны старт Сусветнага бегу гармоніі даецца ў штаб кватэры ААН у Нью-Ёрку. Падчас гэтай цырымоніі ад агульнага агню запальваюць факелы пяці кантынентаў. Далей эстафета стартуе на ўсіх кантынентах. Еўрапейская частка прабегу пачалася 26 лютага ў Дубліне, а азіяцкая галіна прабегу стартавала 24 красавіка ў Хірасіме. У Беларусь удзельнікі эстафеты прыбудуць 16 верасня з Літвы і, прабегшы па тэрыторыі нашай краіны 840 км, адправяцца ў Расію 22 верасня.

Фінішуе бег 27 верасня ў Маскве, куды адначасова прыбудуць удзельнікі азіяцкай і еўрапейскай часткі эстафеты. Так будзе ўстаноўлена ўнікальная сувязь паміж Усходам і Захадам працягласцю 47000 км!

Сусветны бег гармоніі ў розны час падтрымалі самыя вядомыя людзі планеты і нашай краіны: Вячаслаў Фяцісаў, Ірына Радніна, Маці Тэрэза, прынцэса Дыяна, Нэльсан Мандэла, Міхаіл Гарбачоў, каралева Вялікабрытаніі Лізавета, Пол Макартні, Барыс Грабеншчыкоў, Далай-лама, Мікалай Валуеў і многія іншыя. У 2008 годзе Факел Дружбы пабываў на Паўночным полюсе.

У 2010 годзе Сусветны бег гармоніі падтрымлівае ідэю правядзення ААН і ЮНЕСКА Міжнароднага года па аднаўленні адносінаў паміж культурамі. Дэвід Херберн, старшыня 35-й Генеральнай Сесіі ЮНЕСКА, адзначыў, што гэты бег — шанец усім удзельнікам пашырыць свае ўяўленні аб свеце і дакрануцца да іншых культур.

На ўсіх маршрутах эстафеты тысячы дзяцей прымуць удзел у мерапрыемствах, калі каманды бегуноў прыбудуць у школы, каб падзяліцца сваімі надзеямі і марамі аб больш гарманічным свеце.

Марта МАРКАЧЭЎСКАЯ.

КАРДОННЫ МІЛІЦЫЯНЕР СТАІЦЬ КРУГЛАСУТАЧНА

На аўтадарозе Ваўкавыск—Баранавічы, на перасячэнні двух раёнаў — Зэльвенскага і Слонімскага, — нядаўна з'явіўся вось такі супрацоўнік аўтаінспекцыі. Праўда, ён не сапраўдны, а зроблены з кардону. Муляж супрацоўніка ДАІ выраблены ў натуральную велічыню, абклеены каляровай святлоадбівальнай стужкай, таму добра бачны і днём, і ноччу ўсім вадзіцелям, якія едуць па трасе. Здалёк здаецца, што гэта сапраўды выйшаў на дарогу аўтаінспектар. І гэта невыпадкова: кардонны міліцыянер пастаўлены на больш аварыйным участку аўтадарогі.

Сяргей ЧЫГРЫН.

МАЁ ЖЫЦЦЁ, ТВАЁ ЖЫЦЦЁ

У Глыбокім завяршыўся фестываль хрысціянскіх фільмаў Magnificat-2010

Вера ў Бога. У сучасным свеце яе захаванне раўназначнае подзвігу. Чамусьці лічыцца, што верыць — несучасна, неактуальна, нямодна. Маўляў, вера здольная змяніць чалавека... Здольная. Але да лепшага: духоўны чалавек — чалавек моцны. Магчыма, гэтага і баялася савецкая ўлада, руйнуючы храмы і забараняючы службы, крыжы і абразы. Але нават забараніўшы вонкава, ты не забароніш тое, што ўнутры. Вера, у адрозненне ад свецкасці, здольная рабіць цуды.

Манахіня, якая працуе ў Індыі з ВІЧ-дадатнымі людзьмі. Габрэй Ішай, які хацеў скончыць жыццё самагубствам, але паверыў у Хрыста. Святар, які завяшчаў свае рагавіцы двум слепым дзецям... Гэтыя гісторыі праўдзівыя і незвычайна моцныя. І ва ўсіх ёсць агульнае зерне — вера ў Бога. VI Міжнародны каталіцкі фестываль хрысціянскіх дакументальных фільмаў і тэлепраграм «Magnificat», які завяршыўся днямі ў Глыбокім, аб'яднаў пад сваім крылом больш за чатыры дзясяткі стужак. І кожная з іх — гісторыя веры, роздум для чалавека.

БЛАКАДНАЯ ВЕРА

Стваральнікі фільма «Блакадная вера» атрымалі прыз «За лепшую тэлепраграму». Серыя «Блакадны Ленінград» з фільма «Блакадная вера» прысвечана жыццю праваслаўных вернікаў у блакадным горадзе. Расповед пра асабістыя подзвігі, здзейсненыя на фоне сацыяльных узрушэнняў Другой сусветнай вайны. Жахі блакады і актыўнае рэлігійнае жыццё, якое ўжо была не ў сілах забараніць савецкая ўлада...

Сёстры Габрыэля і Алена (кангрэгацыя Сясцёр Францішканак Сям'і Марыі):

— Кожны фестываль дае сілы для паглыблення ўнутранай духоўнасці. Стужкі рознай тэматыкі, таму ўзмацняемся не толькі духоўна, але і гістарычна. Большасць фільмаў сталі для нас нібы духоўнай медытацыяй — з кожнага можна ўзяць думку, якая застанецца ў душы, дапаможа ў жыцці.

ТАЯМНІЦЫ ФАЦІМЫ

Дзевяноста гадоў таму ў Фаціме Дзева Марыя аб'явілася тром маленькім пастушкам. Яна перадала дзецям тры таямніцы, якія звязаныя з ходам гісторыі ў свеце. Дзве з іх ужо збыліся, змест трэцяй да апошняга часу заставаўся загадкаю. Многія спрабуюць разгадаць яе, але ўсё не так проста, з цягам часу загадка пасланняў робіцца ўсё больш складанай... Фільм-расследаванне італьянскага **рэжысёра буйнейшай італьянскай тэлекампаніі «RAI» Элізабеты КАСТАНЬЯ** на фестывалі быў адзначаны адмысловым дыпломам.

— Мая гісторыя пра сакрэты Фацімы ідзе ў глыбіню 1917 года. Можна сказаць, што гэта гістарычна-рэлігійны трылер, — дзеліцца развагамі з карэспандэнтам «Звязды» Элізабета Кастанья. — Гэта зацікавіла мяне, і я спадзяюся зацікавіць гэтым гледачоў.

Даючы ацэнку фестывалю, рэжысёр адзначыла:

— Гэта цудоўна, што ў Беларусі праходзяць такія фестывалі. Іх варта праводзіць хоць бы таму, што яны дазваляюць сутыкацца паміж сабой розным меркаванням. Людзі размаўляюць і супастаўляюць свае думкі. Я вельмі задаволеная, што мне ўдалося паглядзець фільмы з Расіі, Беларусі і Украіны, бо ў Італіі атрымаць уяўленне пра дакументальнае кіно, знятае ў гэтых краінах, дастаткова цяжка. І павінна адзначыць, узровень дакументальных фільмаў, прадстаўленых на фестывалі, дастаткова высокі.

МАЁ ЖЫЦЦЁ, ТВАЁ ЖЫЦЦЁ

Гэты фільм — жывое сведчанне сястры манахіні, якая працуе на поўначы Індыі ў вёсцы, закранутай ВІЧам. Шпіталю там няма, а яна дапамагае 250-ці жанчынам, дзецям і старым, і стала сапраўдным бласлаўленнем для ўсёй вёскі.

Фільм «Тваё жыццё, маё жыццё» рэжысёра Джыджы Калаваналя атрымаў спецыяльны прыз «За раскрыццё тэмы хрысціянскай міласэрнасці».

Рэжысёр Айдас Маркаўскас (Літва):

— У кожным фільме ты знойдзеш дэталь, якую абавязкова забярэш з сабою, кадр ці фразу — няважна, галоўнае, фільм абудзіць нешта ў тваёй душы. У Літве такіх фестываляў няма. Беларускі ж «Magnificat» мае вялікую ідэю і вялікую будучыню. Мне як рэжысёру вельмі падабаецца візуальнасць фестывалю: якасць відэа, гук, зручны ў карыстанні сайт. Але перш за ўсё ён павінен быць не для рэжысёраў, а для гледачоў.

АБРАЗ З ЖЫРОВІЧАЎ. ЦУДАТВОРНАЕ АБЛІЧЧА

У 1470 годзе Багародзіца з'явілася ў Жыровічах і ў знак сваёй прысутнасці на зямлі пакінула людзям маленькі каменны абразок — памерам з дзіцячую далонь. Жыровіцкі абраз Божай Маці — адзін з найбольш шанаваных у свеце. Падлічыць, колькі людзей вылечылася, молячыся перад цудатворным абліччам Жыровіцкай Багародзіцы, немагчыма. Адных яна збаўляла ад смяротных хвароб, а іншыя пасля наведвання манастыра кардынальным чынам змянялі сваё жыццё. Пра веру, сведчанні і цуды дакументальны фільм рэжысёра Людмілы Клінцовай.

Старшыня журы, галоўны рэдактар часопісаў «Наша вера» і «Ave Maria» Хрысціна Лялько:

— Парадаваў экуменічны акцэнт фестывалю. Хрысціяне працуюць над агульнымі праблемамі духоўнасці, шукаючы выйсце з сітуацый, у якія трапляе чалавек, незалежна ад канфесіі. Агульнымі намаганнямі праз сродкі мастацтва мы павінны шукаць шлях да Бога, што і з'яўляецца адной з галоўных задач хрысціянскага мастацтва.

— Хрысціянская тэматыка нашых фільмаў сапраўды вельмі блізкая, — дадае **польскі рэжысёр Кшыштаф ШУРОЎСКІ.** — Важная асаблівасць фестывалю ў тым, што ён экуменічны — адкрыты для ўсіх хрысціянскіх канфесій.

МЭТА ХРЫСЦІЯНСКАГА КІНО — ШУКАЦЬ ШЛЯХ ДА БОГА

— Стан беларускага хрысціянскага кіно паляпшаецца з кожным днём, — **адзначае арганізатар і кіраўнік фестывалю Юрый ГАРУЛЁЎ.** — Вялікі крок наперад зрабіла праваслаўнае кіно, і сёлета ў кінафестывалі ўдзельнічала некалькі вельмі добрых праваслаўных стужак. Паступова мы рухаемся наперад. Радуе, што расце папулярнасць конкурсу. Напрыклад, пяць рэжысёраў з Італіі даслалі сёлета свае стужкі для ўдзелу ў нашым фестывалі. Гэта рэжысёры з той краіны, якая лічыцца самай аўтарытэтнай у сферы хрысціянскага кіно. Калі б мы не былі вядомымі і паважанымі ў свеце, не было б і гэтых фільмаў.

— Уразіла не толькі геаграфія ўдзельнікаў, а і паглыбленне, пашырэнне спектра праблем, якія закранаюцца ў хрысціянскім кіно, — дадае Хрысціна Лялько. — Гэта сведчыць пра тое, што творцы пачалі думаць пра чалавека, пра хрысціянскія шляхі пераадолення чалавечых слабасцяў.

Кожны чалавек сам выбірае свой шлях: верыць альбо думаць, што Бога не існуе. Парадаксальна, але калі жыццё чалавека ідзе размерана, без штуршкоў і перажыванняў, чалавек пра Бога не задумваецца. Але калі нешта здараецца — мы адразу ўзгадваем пра веру. Пачынаем хадзіць у царкву, ставіць свечкі, маліцца. А паступова разумеем: усё, што было дагэтуль — было толькі нашымі ўцёкамі ад Бога, які заўсёды чакае сваіх блудных авечак. І гісторыі з фільмаў «Magnificat» гэта яшчэ раз пацвярджаюць.

Ілья ЛАПАТО.

Глыбокае — Мінск.

Дзве даты

16 верасня

1937 год — нарадзіўся Барыс Іванавіч Луцэнка, беларускі рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1975). Народны артыст Беларусі (1995). Працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Купалы, галоўным рэжысёрам тэатраў імя М. Горкага і Тэатра-студыі кінаакцёра. З 1991 года — мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Паставіў спектаклі за мяжой — у тэатрах Берліна, Вільнюса, Жэневы. Сярод лепшых пастановак: «Зацюканы апостал» і «Таблетку пад язык» А. Макаёнка, «Вяртанне ў Хатынь» А. Адамовіча і інш. На кінастудыі «Беларусьфільм» зняў кінастужка «Раскіданае гняздо».

1745 год — нарадзіўся Міхаіл Іларыёнавіч Кутузаў, славуты рускі палкаводзец, генерал-фельдмаршал. У 1799 годзе жыў у Гродне, займаючы пасаду літоўскага ваеннага губернатара. У вайну 1812 года — галоўнакамандуючы рускай арміяй, якая разграміла войска Напалеона.

Цытата дня

«Як толькі дурань пахваліць нас, ён ужо не здаецца нам такім дурным».

Францыск дэ Ларошфуко (1613—1680), французскі пісьменнік.

НЕ САДЗІСЯ Ў ТАРЦЫ

Так і толькі так ставілі памінальны стол (нагадвае літару «І») — у адзін рад, ад чырвонага кута і да парога. Дазвалялася і ў два рады, але абавязкова без «звязуючага» стала.

● На вугал стала, зарыентаваны ў чырвоны кут, ставілі спецыяльны **знак «прысутнасці»** таго, дзеля каго сабраліся жывыя, — сподак і чарку для нябожчыка.

● Побач (першым), пад абразамі, садзіўся **самы стары мужчына**, а затым (зноў-такі па ўзросце) рассаджваліся ўсе астатнія: **чым далей ад чырвонага кута, тым маладзей.**

● Нормамі звычаёвага права **катэгарычна забаранялася садзіць за памінальны стол членаў роду,** якія не прайшлі ўсе этапы сацыялізацыі: **дзяцей і моладзь перадшлюбнага ўзросту.**

● Неабходна звярнуць увагу яшчэ на адзін важны нюанс пасадкі гасцей за сталом. **На вяселлі ўся радня садзілася сямейнымі парамі, на памінках — паасобку,** дакладней, адзін насупраць аднаго: мужчыны — з правага боку, уздоўж сцяны ад двара, жанчыны — злева ад уваходу, бліжэй да той часткі хаты, функцыянальна-рытуальным цэнтрам якой была печ.

● Да цяперашняга часу захоўвае сваю актуальнасць і **забарона садзіць каго-небудзь у тарцы памінальнага стала. Абрус**, якім засцілалі стол **на вяселле**, на дзень нараджэння ці з нагоды юбілею, **клалі правым бокам,** а **на памінальны** (на «траціны», «дзевяціны», «сарокавіны», «угодкі», на Радаўніцу і Змітраўскія Дзяды) — наадварот, **левым**. Па-рознаму клалі і прыборы: лыжку і відэлец выемкай уверх — на вясельным стале, выемкай уніз — на памінальным (перавернутая лыжка нагадвае заход сонца).

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

ЗЛОДЗЕЙ ПОБАЧ

Беспрацоўная з Баранавічаў заявіла ў міліцыю, што ў адной з кватэр па вул. Паркавай невядомы ўкраў у яе залатыя пярсцёнак. Следства ўстанавіла, што дзяўчына пацярпела ад свайго брата, які той пярсцёнак і ўкраў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.44	19.24	12.40
Віцебск —	6.32	19.14	12.42
Магілёў —	6.34	19.14	12.40
Гомель —	6.31	19.10	12.39
Гродна —	6.59	19.39	12.40
Брэст —	7.01	19.39	12.38

Месяц

Першая квадра 15 верасня. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Домны, Аляксея, Захара, Івана, Пятра, Яфіма.*

К. *Камілій, Людмілы, Эдзіты, Карнеля, Цыпрыяна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усміхнемся!

Муж ранкам будзіць жонку. Тая:

— Пачакай яшчэ пяць хвілін.

— Ды калі ласка! Але ты, галоўнае, не пераблытай «яшчэ пяць хвілін» і «чорт, зноў спазнілася»!

☺

Па-сапраўднаму прыгожыя жанчыны патрэбныя толькі непітушчым і тым, у каго фантазіі няма.

☺

Настаўніца:

— Дзеці, прыдумайце сказ, у якім слова «выдатна» ўжываецца двойчы.

Маша:

— Тата купіў маме выдатную сукенку, у якой яна выдатна выглядала.

Вовачка:

— Учора за вячэрай мая сястра аббясціла, што цяжарная, а бацька сказаў: «Выдатна, чорт, проста выдатна!»

Альф справу ведае

Кавалак свіной нагі вагой 20 кілаграмаў і вялізны набор субпрадуктаў паспрабаваў скрасці непасрэдна з Гомельскага мясакамбіната беспрацоўны грамадзянін, які пайшоў на справу ў стане моцнага ап'янення.

Яго дзеянні прыпыніла група затрымання Навабеліцкага аддзела аховы. Літаральна праз некалькі хвілін пасля паведамлення аб тым, што невядомы знаходзіцца на тэрыторыі прадпрыемства, міліцыянеры прыбылі на месца разам з сабакам па мянушцы Альф і затрымалі 36-гадовага гамяльчаніна разам з мяснымі здабыткамі. Выкрадзенае «заважыла» амаль на 400 тысяч рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Для всех форм собственности Для любых целей

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Дорожно-строительный трест № 2» 19 октября 2010 г.

№ лота	Наименование объекта	Краткая характеристика	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка (в т.ч. НДС 20 %), бел. руб.
1	Производственно-бытовой корпус	Одно/двухэтажное кирпичное здание с коммуникациями общей площадью 1 022,2 кв.м	515 627 935	51 562 790
	Склад тарного хранения	Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 1 377 кв.м		
	Котельная	Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 320,74 кв.м		
	Здание трансформаторной подстанции	Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 22,95 кв.м		
	Здание склада навеса	Металлическая сетка, общая площадь 136,08 кв.м		
	Насосная над артезианской скважиной	Одноэтажное кирпичное здание общей площадью 5,81 кв.м		
	Гараж	Одноэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 428,33 кв.м		
	Проходная	Двухэтажное кирпичное здание с освещением общей площадью 14,82 кв.м		
	Технологическая емкость – 15 м³ – 2 шт., технологическая емкость – 90 м³ – 2 шт., технологическая емкость – 1 шт., емкость – 15 м³ – 2 шт., емкость 25 м³ – 2 шт.; емкость 400 м³ – 4 шт.; 30 м³, 50 м³, 60 м³ – по 1 шт.			
	Весы автомобильные, внутриплощадочные электро- и тепловые сети, вагон – общежитие ВО-4 , битумохранилище, мазутохранилище, башня Родновского, артезианская скважина, площадка для изготовления бетона – 470 м².			

Адрес объектов продажи: г. Ельск, ул. Ломоносова

Срок подачи заявления	**До 17.00 18 октября 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а
Дата, время, место проведения аукциона	**19 октября 2010 г. в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012035310012 в филиале ОАО «БПС-БАНК» по Минской области, код 331, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий. **Цены указаны с НДС.** Шаг аукционных торгов – 5 %, вознаграждение – 5 % от цены продажи лота
Условие пользования	Объекты продаются в собственность

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. В аукционе имеют право участвовать физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, при условии предоставления следующих документов:
- заявление, соглашение о правах и обязанностях сторон по установленной форме; - копии платежного поручения, подтверждающего внесение задатка в размере, указанном в извещении; - юридические лица должны предоставить – копии учредительных документов и свидетельства о госрегистрации, индивидуальные предприниматели – копию свидетельства индивидуального предпринимателя. При участии в торгах представителя предоставляются: * для юридического лица – документ подтверждающий, полномочия представителя на участие в аукционе и подписание необходимых документов, паспорт представителя; * для индивидуального предпринимателя – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, нотариально заверенную доверенность.

Дополнительная информация по тел.: 77 37 27, 77 52 87 (факс).

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 33 (365)

Яблыкі новага ўраджаю

СУШКА

«Адзін год у нас яблыкі пасля сушкі пакрыліся плесняй, а другі — былі цвёрдымі, як арэх. Як правільна сушыць яблыкі?»

М. ТРУС, *Бярэзінскі раён.*



Для сушкі прыгодныя яблыкі розных гатункаў. Лепш выкарыстоўваць кісла-салодкія гатункі з тонкай гладкай скуркай, шчыльнай мякаццю. Часта для сушкі выкарыстоўваюць апад. Яблыкі старанна мыюць у вадзе, падкісленай воцатам, каб змыць забруджанні і рэшткі ядахімікатаў, якія прымяняліся для барацьбы са шкоднікамі. Яблыкі рэжуць кружочкамі таўшчынёй 5—7 мм або скрылёчкамі. Каб яблыкі з-за дзеяння акісляльных ферментаў не цямнелі ў час падрыхтоўкі да сушкі, іх адразу ж пагружаюць у халодную падсоленую (10—15 г солі на 1 л вады) альбо падкісленую (2—4 г лімоннай кіслаты на 1 л вады) ваду.

Для частага разбурэння ферментаў і паскарэння працэсаў сушкі можна прабаланшыраваць нарэзаныя яблыкі на працягу некалькіх хвілін у кіпячай вадзе, а потым адразу ж астудзіць пад праточнай вадой. Замест баланшыравання долькі яблыкаў можна вытрымаць на працягу 8—10 хвілін на сіце або ў друшляку над парай, а затым астудзіць халоднай вадой.

Сушаць яблыкі ў печы і духавых шафах. Долькі яблыкаў раскладваюць на латках тонкім слоем, змяшчаюць у духоўку і сушаць пры адчыненых дзверцах. Спачатку падтрымліваюць тэмпературу 70—75 градусаў, затым даводзяць да 80—85 градусаў. Калі выпарыцца прыкладна 2/3 вады, тэмпературу зніжаюць да 50—55 градусаў. Працэс сушкі доўжыцца 6—10 гадзін. Затым гатовы прадукт ахалоджваюць на адкрытым паветры, адбіраюць недасушаныя скрылёчкі, якія даводзяць да гатоўнасці асобна. Высушаныя плады пакідаюць на паветры ў цёплым памяшканні на 10—15 гадзін для таго, каб выраўняць у іх вільгаць, пасля чаго раскладваюць у шкляныя слоікі або іншую тару, прызначаную для харчовых прадуктаў, і герметычна закрываюць.

Правільна высушаныя яблыкі эластычныя, пры сцісканні не ламаюцца і не выдзяляюць сок.

Здаровыя парэчкі на агародзе

Чорныя парэчкі вельмі адчувальныя на рознага роду засалення глебы. З-за гэтага яны не пераносяць моцных угнаенняў — такіх, як свежы гной, птушыны памёт, канцэнтраваны раствор мінеральных угнаенняў або густы настой попелу. Пры лішку ўгнаенняў, а таксама пры пападанні ў зямлю вялікай колькасці мыйных сродкаў, кухоннай солі, ржы, сухой фарбы са сцен будоўляў парэчкі лёгка захворваюць.

Пры лёгкім забруджванні глебы першай на парэчках з'яўляецца мучністая раса, потым — антракноз. Пры цяжкім атручванні, асабліва хлорам, кусты паражаюцца вельмі небяспечным захворваннем — махрыстасцю. Веданне гэтых прыродных асаблівасцяў чорных парэчак дае магчымасць вырошчваць іх здаровымі, выконваючы наступныя правілы.

1. На ўчастку іх лепш садзіць як мага далей ад кампосных куч і месцаў для мыцця рук.

2. Чыстае перагнойнае ўгнаенне для чорных парэчак гатуецца асобна з прэлага лісця, травы або гною, але без дабаўлення фекальнага кампосту або харчовых адходаў.

3. Усе угнаенні ўносяцца з восені, каб талыя воды вымылі лішкі соляў, якія былі занесеныя выпадкова.

4. Пры абрэзцы чорных парэчак непажадана карыстацца секатарам. З яго ляза ўзбуджальнікі хваробаў могуць перанесціся з зарадженых раслін на здаровыя. У парэчак даволі мяккая драўніна, таму галінкі, якія старэй за 5 гадоў, належыць выразаць, можна проста выломваць.

5. Са здаровых кустоў пастаянна зразайце і ўкараняйце чаранкі, і пры гэтым размяшчайце маладыя кусты як мага далей ад дарослых.

Што ў попеле?

Не ўсе агароднікі лічаць, што з заканчэннем сезона ўсе работы на агародзе скончаныя. У гэты час дбайныя гаспадары назапашваюць угнаенні. Падобнай рабоце якраз спрыяе час: дзе і калі яшчэ знойдзеце такія запасы арганікі! Можна падрыхтаваць кампост з травы, пустазелля, бацвіння, лісцяў і гэтак далей. Можна сухую траву, галінкі з абрэзаных кустоў, дрэў, ці непатрэбныя кускі бярвення, што засталіся ад будоўлі ці якіх-небудзь гаспадарчых работ , сабраць у кучу і спаліць. Атрымаецца прадукт, патрэбны на любы выпадак.

Попел — вельмі важнае і карыснае ўгнаенне. Яшчэ нашы старажытныя продкі надавалі яму вялікую ўвагу. Было заўважана, што на месцах дрэў, кустоў ці травы, якія згарэлі, выдатна раслі збожжавыя культуры. Але толькі трэба было попел заправіць у глебу, хоць і не вельмі глыбока. На паверхні ён ніяк не можа праявіць сябе: з дажджамі і снегам вымываецца і марна прападае. Даўно было заўважана, што форма захоўвання попелу сухая, яго нельга падмочваць, ставіць у сыраватае месца. Прыводзім каштоўнасць попелу ад згарання розных матэрыялаў.

Самы малакарысны попел ад торфу. У ім кожнага з кампанентаў угнаення намнога менш. Між іншым, торф багаты на азот, але пры згаранні гэты элемент улятучваецца. Значыць, торф трэба сушыць у рыхлых буртах, час ад часу варушыць, каб розныя непатрэбныя «кампаньёны» зніклі. І не паліць.

Найбольш багатыя на элементы сілкавання пры спальванні — гэта сланечнік, салома, грэчка, гарох, фасоля, лубін. У іх даволі значная доля ўсіх макраэлементаў — фосфару, калію і кальцыю. Паўстае пытанне: а дзе азот, які, як адзначаліся не раз, напаўняе расліны? Яго многа ў сухім прадукце, але ў час спальвання поўнасцю знікае.

Як прымяняць попел? Вясной пасыпаць радочкі ля суніцы, увосень класці пад кусты парэчак, агрэсту, маліны — шклянку на квадратны метр. Трэба добра загортваць у глебу на глыбіню 4-6 см. Можна пасыпаць і па паверхні, але рэчыва будзе даступнае найбольш для пустазелля, і толькі праз месяц-другі — для патрэбнай расліны.

У пару вегетацыі добрыя вынікі дае настой попелу ў падкормках (вядро попелу на 200 літраў вады). Калі перад самай падкормкай дадамо 150 г мачавіны (зноў на 200 літраў), памяшаем, то падкормка будзе адменная.

Від згарэлага матэрыялу	Атрыманыя ўгнаенні (у працэнтах)			
	Фосфар	калій	кальцый	мікраэлементы
Бяроза	4—6	10—12	35—40	0,05—0,07
Елка	2—3	6—8	23—26	0,01—0,02
Сасна	2—4	6—8	30—40	0,03—0,05
Сланечнік і салома	7—8	12—13	41—43	0,06—0,09
Трава	4—7	10—13	37—41	0,05—0,08

Уборка сельдэрэю

Многія агароднікі вырошчваюць на агародзе карысную расліну — сельдэрэй, але не заўсёды ведаюць, як убіраць, захоўваць і нават што з яго прыгатаваць. Таму для іх нашы парады.

Каранёвы і чаранковы сельдэрэй вырошчваюць прыкладна аднолькава. Адрозненні ў агратэхніцы пачынаюцца з другой паловы лета, калі ў чаранковага сельдэрэю трэба правесці адбельванне чаранкоў. Часта рэкамендуюць акучваць расліны глебай да лістоў. Можна зрабіць інакш: за два тыдні да ўборкі абгарнуць чаранкі да самых лісцікаў тоўстай паперай або кардонам. Пад зацяненнем яны святлеюць, знікае горыч, паляпшаецца смак і робіцца больш тонкім водар чаранкоў і лістоў.

На пасадках каранёвага сельдэрэю ў гэты час пажадана некалькі разоў адгрэбці зямлю ад караняплода. У выніку абрываюцца тонкія бакавыя карэньчыкі (калі яны пачалі адрастаць), і паверхня караняплода робіцца больш гладкай і роўнай.

Выбарачна здымаць ураджай караняплодаў можна ўжо ў жніўні — для таго, каб спажыць адразу. Канчаткова выкопваць сельдэрэй можна не раней, чым у кастрычніку, таму што нарастанне масы караняплодаў працягваецца да позняй восені. Аднак непажадана пакідаць каранёвы сельдэрэй на градках пры замаразках ніжэй, чым мінус 8 градусаў, таму што ён пасля гэтага дрэнна захоўваецца. Калі расліны ўсё ж падмерзлі, то ўбіраць караняплоды можна толькі тады, калі яны цалкам растануць. Яшчэ некаторыя агароднікі частку пасадак каранёвага сельдэрэю пакідаюць на зіму ў зямлі, каб вясной можна было як мага раней атрымаць зяленіва.

Да канца сезона мочка каранёў сельдэрэю моцна разрастаецца, і вырваць расліны з зямлі рукамі немагчыма, таму пры ўборцы ўраджаю трэба акуратна падкапаць віламі, стараючыся яго не пашкодзіць, абтрэсці ад зямлі, абрэзаць лісты і карані, пакідаючы дробныя ніжнія карані даўжынёй 1—2 см (караняплоды так лепш захоўваюцца).

Асноўную частку ўраджаю можна захоўваць у падвале, склепе, можна ў халадзільніку — тут ў паўпрыкрытых поліэтыленавых пакетах караняплоды добра захоўваюцца пры тэмпературы 2—5 градусаў. Таксама каранёвы сельдэрэй нядрэнна захоўваецца, як і морква — у скрынцы (як мага шчыльней пакласці адзін да аднаго), перасыпаны вільготным пяском, але пры гэтым нельга засыпаць верхавінкі караняплодаў.

Ліставы і чаранковы сельдэрэй у свежым выглядзе захоўваць немагчыма, таму абрэзаныя лісты і чаранкі трэба альбо высушыць, альбо замарозіць, каб есці зімой.

Магчымая таксама выганка сельдэрэю зімой на акне. Для гэтага выкарыстоўваюцца караняплоды невялікага памеру.

Што можна прыгатаваць з сельдэрэю?

З гэтай карыснай агародніны — як караняплода, так і з лістоў — можна прыгатаваць вялікае мноства страў, як самастойных, так і ў спалучэнні з іншымі прадуктамі. У сырым, вараным, тушаным, запечаным, смажаным выглядзе ўсе віды сельдэрэю добра спалучаюцца з морквай, бульбай, рэпчатай і зялёнай цыбуляй, капустай, салодкім перцам, яблыкамі, слівамі, грушамі, грыбамі, сырам, любым мясам і рыбай.

Свежыя або сушаныя лісты сельдэрэю дадаюць у любыя салаты, гатовыя першыя і другія стравы, прычым сухія лісты маюць больш мяккі смак і пах, чым свежыя. Здробненая ў кавамолцы сумесь высушаных лістоў сельдэрэю і цыбулі-парэю ў суадносінах 1:1 з поспехам выкарыстоўваюцца замест мукі для абвальвання перад смажаннем катлет, мяса ці рыбы.

Калі здрабніць зяленіва сельдэрэю, зялёную цыбулю, сыр, зваранае ўкрутую яйка і запраўіць усё маянэзам на гарчычнай аснове або на аснове аліўкавага алею з сокам лімона, то атрымаецца даволі арыгінальны салат.

Самыя смачныя стравы атрымліваюцца з каранёвага сельдэрэю. Натаркаваны на буйной тарцы сельдэрэй дадаюць пры пасероўцы цыбулі з морквай для запраўкі супоў.

Гаспадыням трэба ведаць, што ачышчаныя ад лупін караняплоды сельдэрэю хутка цямнеюць. Таму ў чаканні кулінарнай апрацоўкі іх трэба трымаць пад вадой або пырскаць на іх лімонным сокам.

Варта пакаштаваць і смажаны сельдэрэй. Для гэтага падсоленыя, палітыя лімонным сокам і абваляныя ў муцэ тонкія скрылёчкі сельдэрэю абсмажваюць у алеі да залацістай скарыначкі.

Са свежага або адваранага каранёвага сельдэрэю можна прыгатаваць салаты з яблыкамі і грэцкімі арэхамі, з яблыкамі і саладкім перцам. Калі натаркаваны на дробнай тарцы караняплод сельдэрэю, змяшаны з парэзанай садавіной (яблыкі, грушы, слівы) і сырам, запраўіць маянэзам альбо смятанай, то атрымаецца фруктовая салата. Такія салаты паляпшаюць страваванне, здымаюць цяжар у страўніку.

Не лішнім будзе нарыхтаваць у запас соус з сельдэрэем: начышчаныя і нарэзаныя таматы, яблыкі, караняплод сельдэрэю і цыбулю патушыць да разварвання, працерці праз сіта, дабавіць соль, цукар, прыправы на смак і ўварыць да кансістэнцыі павідла. Затым расклаці ў слоікі і закатаць.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №УМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4525. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

50 ГАДОЎ ДЛЯ КАЛЕКТЫВУ — УЗРОСТ ЮНАЦКІ, НАОГУЛ ЧАС РОСКВІТУ



Дырэктар інстытута Анатоль МІКЛАШЭВІЧ.

Гутарым з дырэктарам інстытута «Гроднасельбудпраект» Анатолем МІКЛАШЭВІЧАМ.

Прыгажуню-запраўку на выездзе з Гродна таксама запраектавалі ў інстытуце.

— За апошнія гады твар Гродзеншчыны прыкметна змяніўся, пахарашэў, і наш калектыў мае да гэтага самае непасрэднае дачыненне. У нас вельмі многа заказаў, галоўным чынам «вясковых», скіраваных на інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці, і перш за ўсё — жывёлагадоўлі. Невыпадкова за апошні час мы прыраслі ў аб'ёмах работ працэнтаў на 20 — 25, калі весці падлік у базавых цэнах 2006 года. І гэта пры тым, што стараемся па меры магчымага зніжаць кошт сваіх праектаў. Такое напружанне звязана перш за ўсё з рэалізацыяй дастаткова буйных дзяржаўных праграм па ўзвядзенні аграгарадкоў, будаўніцтве новых фермаў. Летась, паводле спецыяльнага Указа Прэзідэнта, запраектавалі 14 фермаў. Намячаецца яшчэ адзін этап прэзідэнцкай праграмы, згодна з якім будуць выкананы праекты 17 фермаў.

Шэраг гаспадарак не чакаюць, пакуль іх уключаць у праграмны пералік, а ўжо зараз будуюцца і наогул развіваюцца на ўласныя ці заёмныя сродкі. Такіх ініцыятыўных кіраўнікоў, якія заказваюць нам праектна-каштарысную дакументацыю, нямала, бо людзі бачаць перспектыву і адчуваюць падтрымку дзяржавы.

У вобласці зараз склалася такая цалкам зразумелая сітуацыя, што будынкі свінакомплексаў, узведзеных у 70-я альбо ў пачатку 80-х гадоў, пачынаюць старэць. Калі абследаванне паказвае, што канструкцыя яшчэ дазваляе далейшую эксплуатацыю, то праводзіцца рэканструкцыя, а калі не — па нашым праекце будуецца новае памяшканне. Каб такая перспектыўная справа, як свінагадоўля, надалей развівалася і знаходзілася на належным узроўні.

Актыўна будаваць новыя жывёлагадоўчыя комплексы і фермы, рамантаваць дзейныя з адначасовым прырошчваннем плошчаў вымушае і тая абставіна, што ў сельскай гаспадарцы краіны ў апошні час даволі актыўна ўкараняюцца перадавыя тэхналогіі ўтрымання, кармлення, догляду жывёлы, якія маюць мэтай павелічэнне выхаду прадукцыі і паляпшэнне яе якасці. На малочнатаварных фермах, на свінакомплексах і птушніках многае бярэцца ад еўрапейскіх тэхналогій — нямецкіх, галандскіх, дацкіх, бельгійскіх. Нашы спецыялісты разам са спецыялістамі аблсельгасхарчу і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў выязджалі ў замежныя камандзіроўкі для дэталёвага знаёмства з навінкамі. Пры іх укараненні захоўваецца таксама і ўдасканальваецца тое лепшае, што назапашана айчынным вопытам. Калі мець на ўвазе гэтыя глыбінныя працэсы, то становіцца зразумелым: без далейшага развіцця матэрыяльнай базы не абысціся. Пра яе мы і клапоцімся.

У гэтым сэнсе паказальны прыклад ААТ «Васілішкі», дзе за апошнія гады з нашым удзелам зроблена многа цікавага: здадзеная племферма, пабудаваны рэпрадуктар, шырокім фронтам вядзецца рэканструкцыя свінафермы ў вёсцы Зброжкі, належная ўвага надаецца і развіццю сацыяльнага комплексу.

Мы запраектавалі (яна хутка пачне будавацца) племянную ферму ў Карэліцкім раёне — для свінакомплекса СВК імя Чарняхоўскага. Такіх прыкладаў многа. Даволі часта прымяняецца практыка паралельнага праектавання, што дазваляе захоўваць высокі тэмп работ.

У нашай дзейнасці пераважае вытворчы кірунак, прычым даволі разнастайны. У нас значныя напрацоўкі як па малочна-таварнай вытворчасці, так і па адкорме буйной рагатай жывёлы, па свінагадоўлі (маюцца на ўвазе напрацоўкі ў галіне праектавання і падрыхтоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі). Наколькі гэтыя праекты ўдалыя, можна меркаваць па тым, што ў свой час на рэспубліканскім аглядзе-конкурсе мы атрымалі спецыяльную прэмію Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры РБ за будынак жывёлагадоўчай фермы.

У выніку разам з заказчыкам нашы спецыялісты могуць выбрать менавіта той варыянт — па кампаноўцы, па тэхналогіі, а таксама па кошце, які задаволіць заказчыка. З улікам усіх яго індывідуальных пажаданняў: напрыклад, па планіроўцы, па выкарыстанні імпартных ці айчынных дапольных установак, імпартных ці айчынных помпаў для адкачкі сцёкаў, абсталявання для скрэпернага выдалення гною, іншага тэхналагічнага абсталявання і г.д. Як правіла, тэхнічнае пераўзбраенне ў новых сценах становіцца абавязковым і вядзецца поўным ходам, утрыманне жывёлы адпавядае апошнім рэкамендацыям, так што справа хіба што за абгрунтаванымі парадамі навукоўцаў па народным складзе статкаў, а таксама за самімі жывёлаводамі.

— А чым тлумачыцца той цікавы факт, што пляцоўкі пад новае будаўніцтва даволі часта прапануе не сам заказчык, а выбірае інстытут, прычым гэтым займаецца менавіта дырэктар разам з першымі асобамі абласной «вертыкалі»?

— Такая практыка склалася з-за вельмі патрабавальных адносінаў да гэтай, можна сказаць, працэдуры кіраўніцтва аблвыканкама. Справа сапраўды адказная і нават далікатная. Месца для новага будаўніцтва аб'ектаў, якія ўжо заўтра, магчыма, будуць вызначаць твар жывёлагадоўлі Гродзеншчыны, патрэбна выбіраць з улікам вельмі многіх складнікаў: і каб кармавая база была недалёка і дастатковая; і каб пры гэтым не прычыніць шкоды экалогіі; каб транспартныя артэрыі, тэхналагічныя сеткі і камунікацыі размяшчаліся побач. Пажадана таксама, каб сама пляцоўка была як мага больш роўная, тады эканомяцца значныя сродкі на земляных работах. Прычым знаходзіцца яна павінна не пры населеным пункце, а ў цэнтры кармавой зоны гаспадаркі. Тады не давядзецца бясконца падвозіць кармы на значныя адлегласці трактарамі і вывозіць гной далей ад жылля... Лягчэй і танней падвезці жывёлаводаў з вёскі на ферму і пасля работы — дамоў.

Яшчэ адна складанасць у тым, што на тэрыторыі вобласці засталося шмат хутароў. «Сядзяць» яны на вельмі ўдалых месцах і стваряюць перашкоды той самай працы, пра якую мы гаворым, бо санітарную адлегласць ад іх абавязкова патрэбна вытрымліваць. З аднаго боку «падціскае» аграгарадок ці вёска, з другога — хутарскія гаспадаркі. Вось і круціся, як хочаш! Не выпадкова на такую «рэкагнасцыроўку» вельмі часта едзе першы наменік старшыні аблвыканкама і кліча з сабой.

Як бачыце, цэлая навука. А што датычыцца майго ўдзелу... Дырэктар, вядома, давярае сваім спецыялістам, але і ўхіляцца ад работы таксама не жадае.

Вытворчае жыццё гаспадарак шматграннае, нашы паслугі запатрабаваныя не толькі ў жывёлагадоўлі. Распрацоўваем праекты збожжасушыльных комплексаў — апошнія таксама праграмныя аб'екты і іх будуецца шмат. Зараз паступаюць заказы на заправачныя станцыі — адразу ў некалькіх СВК, бо старыя не адпавядаюць экалагічным патрабаванням і наогул сучасным параметрам. Вопыт праектавання такіх аб'ектаў у нас ёсць, крыху раней запраектаваная намі заправачная станцыя-прыгажуня (пры ўездзе ў абласны цэнтр) была прызнана лепшым архітэктурным творам на Гродзеншчыне і атрымала Гран-пры абласнога агляду-конкурсу.

У «актыве» інстытута — выратавальныя станцыі ў Лідзе і Гродна, пад'яздныя шляхі да жывёлагадоўчых комплексаў і шмат чаго іншага.

Работы ў калектыву шмат. Па праграме дажынак у Лідзе забяспечваем праектна-каштарыснай дакументацыяй рамонт двух ліцэяў —- меліяратыўнага і політэхнічнага. Выйгралі тэндар на сур'ёзныя планіровачныя работы па сядзібным будаўніцтве ў абласным цэнтры, што расцэньваем як давер. Для Белавежскай пушчы выканалі праекты планіровак двух населеных пунктаў, з улікам таго, што будзе нарастаць колькасць наведвальнікаў (бо ў генплане прадугледжаны і агрэсядзібы), а Белавежку зараз надаецца цалкам заслужаная ўвага.

Сёлета нам — 50. Лічым гэты ўзрост юнацкім, бо ў інстытуце працуе шмат моладзі, што прыдае энергіі ўсяму калектыву, у тым ліку і ветэранам. Прыемная дата — нагода, каб аглянуцца на зробленае, ацаніць яго і ісці далей у сваёй творчасці. Менавіта такі падыход бачыцца нам найбольш перспектыўным.

Віншую сваіх калег з прыгожай датай. Гэта былі не лёгкія, але стваральныя гады. І кожны з членаў калектыву ўнёс сваю лепту ў агульны, досыць неблагі вынік. За што шчырае «дзякуй» і пажаданне далейшых поспехаў. А таксама — здароўя, дабрабыту і звычайнага чалавечага шчасця. Са святам!

АД ФЕРМЫ ДА МАЁНТКА КАРАЛЕВЫ БОНЫ

Галоўны архітэктар інстытута Леанід СІЛІЧ:

— Пажадана, каб у любога аб'екта быў уласны архітэктурны твар, з гэтага і зыходзім. Спецыфіка работы архітэктараў і канструктары інстытута, нашы электрыкі, сантэхнікі і г.д.

Прыкмета часу — усе разлікі і чарцяжы выконваем на камп'ютары, з дапамогай спецыяльных праграм, чым дасягаецца і якасць работ, і іх хуткасць, канкурэнтаздольныя тэрміны. Бо заказчык, як вядома, чакаць не любіць. Што такое для нас камп'ютар, пакажу на простым прыкладзе: раней, калі праекціроўшыкі працавалі на кульманах, адзін (толькі адзін) гатовы вялікі ліст выпускалі прыкладна за два дні. А ў пакеце на адзін аб'ект мінімум 10 лістоў тэхналогіі, а калі поўны камплект з усімі часткамі — то і да сотні. Цяпер такі ліст па нашай частцы можна зрабіць за паўгадзіны. Так што камп'ютарызацыя дае высокія тэмпы праектавання. Яна не толькі дазваляе эканоміць час, але і ўлічваць усе карысныя напрацоўкі мінулых праектаў, творча да іх ставіцца і працаваць дакладна, пазбягаючы прыкрых памылак.

Гэтаму служыць таксама і тое, што ўнутры ў аддзеле існуе свая спецыялізацыя: адзін займаецца збожжасушыльнымі комплексамі, другі — птушнікамі, трэці — кароўнікамі, адначасова — санпрапускнікамі, дэзблокамі і г.д. Гэта дазваляе назапашваць і сістэматызаваць веды ў той ці іншай «вузкай» галіне і выкарыстоўваць іх у працы. Эканамічнай часткай праекта таксама займаецца асобны спецыяліст, яна разлічвае затраты на ўзвядзенне комплексаў і іншых аб'ектаў.


1-я група архітэктараў: тэхнік-архітэктар Таццяна ЮРЭВІЧ, вядучыя архітэктары Міхаіл СЯТКОЎ і Ліна СЯНЧЫЛА, тэхнікі-архітэктары Алена АСАЦЫЯНІ і Юлія ТУРЫС.

Галоўны архітэктар Леанід СІЛІЧ.

Такі прэзентабельны выгляд мае станцыя штучнага асемянення ў Шчучынскім раёне.

жам, стварыць фасады, якія запамінаюцца, прымяніць арыгінальныя расфарбоўкі (а сучасныя фарбы даюць магчымасць працаваць і па цэгле, і па тынкоўцы, па бетоне з аднолькавым эфектам). Альбо фрагментарна выкарыстаць сучасныя матэрыялы — новыя тынкоўкі, празрыстыя матэрыялы. Абагаціць сам будынак металачарапіцай, металапрофілем, пластыкам ці вітражнай канструкцыяй... А ўнутры — у даільных памяшканнях, у бытоўках, халадзільных камерах — прымяніць плітку, сучасную сантэхніку. У выніку на аб'ект прыемна паглядзець, асабліва калі гэта комплекс будынкаў, на ўзвядзенне якога затрачаны немалыя сродкі — дзяржаўныя ці прыватнай фірмы.

У большасці сваёй гэта прасторныя памяшканні, там многа святла, бо, акрамя бакавых акон, якія ў кожным асобным выпадку могуць быць размешчаны трохі інакш, прыменена на ўсю даўжыню страхі на месцы канька (вільчака) верхняя падсветка (так званыя ліхтары — аэратары, якія выконваюць яшчэ і функцыі вентыляцыі). А таксама частка асноўнага даху месцамі выканана з празрыстага матэрыялу. Аказваецца, тое патрэбна і самой жывёле, і эстэтычна ўплывае на людзей, што тут працуюць. Гэта той шчаслівы выпадак, калі тэхналогія дапамагае творчасці. Творчы падыход без аглядкі на яе. Вялікасць Тэхналогію архітэктар можа прымяніць яшчэ хіба што на ўваходных групах: на дзвярах, казырках, ганках. А ў астатнім мы цесна звязаны функцыянальнымі задачамі канструкцыі.

На аб'ектах сацкультбыту творчага прастору крышку больш. Сярод таго, што зроблена за апошнія гады, сапраўды няма роўнага знакамітым Васілішкам. І ў цэлым па гаспадарцы, і па асобных яе аб'ектах прычын ганарыцца шмат. Там было належнае фінансаванне, ставіліся высокія задачы — узвядзенне аграгарадка новага тыпу. І нейкіх адміністрацыйных, фінансавых ці любых іншых абмежаванняў мы не адчувалі ў сваёй працы. Вось чаму і цэнтр Васілішак, і асобна ўзятыя будынкі вельмі ўражваюць. Той жа Дом культуры, узведзены па індывідуальным праекце; альбо адміністратыўны будынак пасля рэканструкцыі з вялікімі прыбудовамі; штучнае азярцо на месцы маленькай сажалкі, дзе разы ў тры ці чатыры з дапамогай «Гіправадгаса» павялічаны ўзровень вады. Прастора насычана малымі архітэктурнымі формамі, і азярцо стала любімым месцам адпачынку мясцовых жыхароў, асабліва дзятвы. Як і комплексная дзіцячая і спартыўная пляцоўкі, дзіцячы садок пасля рэканструкцыі. Такім чынам, вёска набыла якасна новае сучаснае асяроддзе, і яно падабаецца людзям. Бо гэтая ўрбанізацыя не цісне залішне, як у вялікім горадзе, а толькі дасягае яго па ўзроўні камфорту і добраўпарадкавання, застаючыся па сваіх маштабах бліскай да чалавека. Можа, гэта і ёсць тыя прывабныя рысы, якія і павінны быць у такой з'яве, як аграгарадок.

Пабудаваныя там і новыя жылыя дамы. За лічаныя гады населены пункт карэнным чынам пераўтварыўся. У ім прыемна жыць і працаваць, бо ёсць усё, што для гэтага патрэбна. У тым ліку сучасныя вытворчыя памяшканні (той жа машынны двор), гледзячы на якія, разумееш, што гэта — новы ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці з належнай культурай.

Калі гаварыць аб нейкіх праблемах, то адна з асноўных заключаецца ў тым, што ў сваёй працы мы не можам належным чынам кіравацца комплекснымі планіровачнымі праектамі сельскіх населеных пунктаў. Тыя праекты планіровак цэнтральных сядзіб былых калгасаў і саўгасаў, якія ёсць, выконваліся вельмі даўно — найменш 20, а то і 30 год таму. Амаль усе яны вычарпалі сябе як фізічна, так і маральна. Было імкненне надаць ім новую якасць, калі пачыналіся аграгарадкі, але гэта была занадта хуткая кампанія — на ўзроўні раённых архітэктараў, без інжынерных пошукаў, без глыбокага аналізу перспектыў развіцця, на тым матэрыяле, што быў пад рукой. А тут жа патрэбна працаваць увесь час, бо мяняюцца падыходы да забудовы населеных пунктаў, яны сталі больш узважанымі. Напрыклад, пералік аб'ектаў сацкультбыту, тых жа гандлёвых прадпрыемстваў і прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, цяпер куды больш сціплы. Выходзячы з гэтага, мы спрабуем прыстасавацца, працуем з планамі паквартальнай забудовы, але больш правільна было б усё ж мець генеральныя планы развіцця буйных населеных пунктаў, асабліва тых, якія інтэнсіўна забудоўваюцца, дзе ўлічана ўся інфраструктура, усе сеткі, дарогі, добраўпарадкаванне, а галоўнае — пляцоўкі новага жыллёвага будаўніцтва.

У нас працуе шмат моладзі, ёй ёсць у каго павучыцца. Шчодра перадаюць свой багаты прафесійны вопыт Мікалай Аляксеевіч Сальнікаў, Васіль Аляксандравіч Гарусаў, Ніна Максімаўна Папкова, Ліна Мікалаеўна Сенчыла, Галіна Рыгораўна Драб, Таццяна Рыгораўна Лось... Многія з іх пачыналі ў нас пасля інстытута і да гэтага часу паспяхова працуюць, з'яўляюцца творчым касцяком калектыву.

Праўда, з моладдзю існуюць пэўныя праблемы. У Гродне працуе архітэктурна-будаўнічы каледж, які «пастаўляе» нам архітэктараў-тэхнікаў і канструктараў-тэхнікаў. Дык вось, з архітэктарамі праблема ў тым, што ў краіне няма завочнай формы навучання па спецыяльнасці «архітэктура» ў вышэйшых навучальных установах, таму паступаюць завочна на будаўнічыя факультэты ВНУ. І мы рана ці позна сустракаем маладых спецыялістаў, у прафесійнае развіццё якіх укладваем пэўныя сілы, бо яны мусяць пераходзіць працаваць па профілі. Гэтая праблема не толькі нашага інстытута, але і астатніх беларускіх праектных устаноў, і Міністэрству адукацыі варта было б знайсці выйсце. Спецыялістаў-будаўнікоў з вышэйшай адукацыяй у краіне шмат, а архітэктар — тавар усё ж штучны.

Дзеля справядлівасці скажу, што зрэдку да нас прыходзяць працаваць і маладыя архітэктары з дыпломамі ВНУ, але атрымаць іх у патрэбнай колькасці мы не можам не першы год. Дарэчы, «Звязда» ўжо пісала пра гэтую набалелую праблему яшчэ чатыры гады таму. За гэты час нічога не змянілася. А дысбаланс у падрыхтоўцы спецыялістаў нейкім чынам патрэбна выпраўляць. Тым больш, што архітэктарам працы ў краіне з кожным годам дадаецца. Варта толькі ўспомніць агучаныя планы забудовы сталіцы і не менш грандыёзныя праекты, якія выношваюцца ў абласцях.

Мы ўважліва сочым за тэндэнцыямі развіцця грамадства. Зараз паступова набывае размах аграгурызм, і мы з задавальненнем узяліся б за праектаванне як новых гасцявых сядзіб, так і рамонту таго фонду, які ёсць, а зараз размова ідзе пра яго найлепшае прыстасаванне для новых мэтаў.

Але давайце паглядзім шырэй. Для аграгурызму прыстасоўваюцца ў асноўным прыватныя сядзібы і будынкі вясковых жыхароў. Але ў Беларусі ёсць і іншыя магчымасці. У краіне, асабліва ў заходніх абласцях, захавалася нямала закінутых памешчыцкіх маёнткаў, якія пасля належнага рамонту маглі б стаць новымі адрасамі аграгурызму. Яны найчасцей знаходзяцца на балансе сельсаветаў ці калгасаў, там некалі размяшчаліся праўленні ці склады. Дзяржава зараз гатова прадаваць іх за адну базавую велічыню, толькі б знайшоўся ахвотны даць ім другое жыццё. Спашлюся хаця б на сядзібна-паркавы ансамбль у вёсцы Падароск Воўкавыскага раёна, гаспадарамі якога ў розныя часы былі каралева Рэчы Паспалітай Бона, а затым памешчыкі Бохмісы, пастаўшчыкі казачных ружжаў і апетытных сыроў да царскага (!) двара. Гэтую сядзібу ў старым парку, на беразе невялікага азярца з лебедзямі яшчэ можна аднавіць, і мы ў такой рабоце ахвотна паўдзельнічалі б.

Альбо ў аднаўленні любой з больш чым 40 сядзіб, якія па рашэнні ўрада могуць быць бязвыплатна перададзены пад аб'екты аграэкатурызму.

Цуда-палац культуры ў Васілішках.

Група тэхнолагаў (злева направа): Ларыса КАРНЕЙКА, Валянціна МІСЛЮК, Арцём ЛАГУН, Сяргей КАЛОДЗІЧ — кіраўнік групы, Фёдар ДУКА і Алена КОНЮХ.

1-я група канструктараў: Настасся ВАЛЮШКА, Алена КРЭЧКА, Міхаіл ПАДАЛЯНЧЫК, Святлана АДЗІНЕЦ, Таццяна СЕМЯНЯКА — кіраўнік групы, Наталля КЛІМОВІЧ, Ірына КІРЫЛАВА, Людміла ПАНАСЮК, Іна ЛЫСАВА.

Механічная майстэрня ў ААТ «Васілішкі».

Калектыў бухгалтэрыі: Ала РАМАНЧУК, Вольга ПЕРАЛАЙКА, Наталля КІЗЕВІЧ, Наталля САВАШЧЭНЯ — намеснік галоўнага бухгалтара, і Алена ПАШКО — галоўны бухгалтар.

Яшчэ адзін Палац культуры — у вёсцы Ёлка Зэльвенскага раёна.

ПЕРШЫМІ БЫЦЬ АДКАЗНА

Расказвае кіраўнік групы ў тэхналагічным аддзеле Сяргей КАЛОДЗІЧ.

— Наша група займаецца распрацоўкай тэхналагічнай часткі праектаў па розных аб'ектах. Спецыфіка работы ў тым, што мы — першыя, а за намі ідуць іншыя службы. Задаём усе параметры, разлічваем зыходныя дадзеныя і такім чынам рыхтуем аб'ёмы работ астатнім. Закладваем, калі хочаце, падмурак якасці дакументацыі. Ад дакладнасці нашых разлікаў, ад таго, ці ўлічылі мы ўсе нарматыўныя патрабаванні па праектна-каштарыснай дакументацыі, многае залежыць, калі праектам пачынаюць ушчыльную займацца ў напружанні.

Вынік такога пошуку ў многім залежыць ад заказчыка, ад яго планаў, задумак і магчымасцяў. На шчасце, ёсць заказчыкі, якія самі прапануюць больш сучасныя падыходы, больш эстэтычныя матэрыялы. Яны згаджаюцца на большыя з нашага боку аб'ёмы работ, на нейкія не абавязковыя, але пажаданыя дэталі дэкору ці аздаблення, нават калі яны запатрабуюць дадатковых затрат. Гэта крэда любога архітэктара — знайсці з заказчыкам агульную мову і зрабіць сваё чарговае дзеццішча крышку не падобным на іншыя.

Прычым не ўсё ўпіраецца ў грошы. Нават пры адных і тых жа затратах можна зрабіць аб'ект безаблічным, а можна пастарацца надаць яму нейкія рысы індывідуальнасці. Вядома, на малочнатаварных фермах нашы магчымасці абмежаваныя. Але нават у гэтых умовах удаецца, скажам, стварыць фасады, якія запамінаюцца, прымяніць арыгінальныя расфарбоўкі (а сучасныя фарбы даюць магчымасць працаваць і па цэгле, і па тынкоўцы, па бетоне з аднолькавым эфектам). Альбо фрагментарна выкарыстаць сучасныя матэрыялы — новыя тынкоўкі, празрыстыя матэрыялы. Абагаціць сам будынак металачарапіцай, металапрофілем, пластыкам ці вітражнай канструкцыяй... А ўнутры — у даільных памяшканнях, у бытоўках, халадзільных камерах — прымяніць плітку, сучасную сантэхніку. У выніку на аб'ект прыемна паглядзець, асабліва калі гэта комплекс будынкаў, на ўзвядзенне якога затрачаны немалыя сродкі — дзяржаўныя ці прыватнай фірмы.

Маючы гэтыя канкрэтныя разлікі, размаўляем з заказчыкамі, абавязкова ўлічваем іх пажаданні і меркаванні. Звычайна размовы зводзяцца да таго, каб пераканаць кліента выбраць больш сучасны варыянт будучага комплексу ці фермы, з сучасным тэхналагічным «начыннем». Разам шукаем нейкія аптымальныя варыянты, каб такое імкненне за прагрэсам было заказыку па кішэні.

Начальнік каштарыснага аддзела Марыя ФІЛАТАВА ведае сапраўдную цану працы праекціроўшыкаў.

Калі кансенсус дасягнуты і замацаваны дагаворам, мы прыступаем да работы: цалкам выконваем планіроўку комплексу ці фермы, задаём размеры будынкаў і памяшканняў унутры будынкаў, з улікам спосабу ўтрымання жывёлы — беспрывязнага ці ў боксах. «Далучаем» вароты, дзверы, тэхналагічнае абсталяванне — ты такая, што працуем, у асноўным, на сельскагаспадарчую вытворчасць, і пра высокі архітэктурны стыль тут не «загаворыш». Раней да гэтага ставіліся даволі скептычна — наогул абыходзіліся без архітэктараў. Цяпер час змяніўся, і большасць заказчыкаў, укладваючы даволі вялікія грошы ў сельскагаспадарчы будынак, ужо жадаюць, каб, акрамя вытворчай утылітарнасці, ён яшчэ меў і прывабны выгляд. Нам працаваць стала і лягчэй, і адначасова цяжэй, бо патрэбна кожны раз дэманстраваць творчы падыход, а таксама балансаваць паміж жаданнем зрабіць на кожным будынку штосьці эстэтычна вартае і эканамічнай мэтазгоднасцю выдаткавання сродкаў на гэтыя мэты. І на кожным аб'екце архітэктар павінен адчуць тую «залатую сярэдзіну», якая задаволіць і эстэтычны, і эканамічны бакі. Мала таго, ён павінен з найменшымі затратамі дасягнуць найбольшага эфекту. Неабходнасць такога падыходу трымае ўвесь калектыў у напружанні.

Вынік такога пошуку ў многім залежыць ад заказчыка, ад яго планаў, задумак і магчымасцяў. На шчасце, ёсць заказчыкі, якія самі прапануюць больш сучасныя падыходы, больш эстэтычныя матэрыялы. Яны згаджаюцца на большыя з нашага боку аб'ёмы работ, на нейкія не абавязковыя, але пажаданыя дэталі дэкору ці аздаблення, нават калі яны запатрабуюць дадатковых затрат. Гэта крэда любога архітэктара — знайсці з заказчыкам агульную мову і зрабіць сваё чарговае дзеццішча крышку не падобным на іншыя.

Прычым не ўсё ўпіраецца ў грошы. Нават пры адных і тых жа затратах можна зрабіць аб'ект безаблічным, а можна пастарацца надаць яму нейкія рысы індывідуальнасці. Вядома, на малочнатаварных фермах нашы магчымасці абмежаваныя. Але нават у гэтых умовах удаецца, скажам, стварыць фасады, якія запамінаюцца, прымяніць арыгінальныя расфарбоўкі (а сучасныя фарбы даюць магчымасць працаваць і па цэгле, і па тынкоўцы, па бетоне з аднолькавым эфектам). Альбо фрагментарна выкарыстаць сучасныя матэрыялы — новыя тынкоўкі, празрыстыя матэрыялы. Абагаціць сам будынак металачарапіцай, металапрофілем, пластыкам ці вітражнай канструкцыяй... А ўнутры — у даільных памяшканнях, у бытоўках, халадзільных камерах — прымяніць плітку, сучасную сантэхніку. У выніку на аб'ект прыемна паглядзець, асабліва калі гэта комплекс будынкаў, на ўзвядзенне якога затрачаны немалыя сродкі — дзяржаўныя ці прыватнай фірмы.

У большасці сваёй гэта прасторныя памяшканні, там многа святла, бо, акрамя бакавых акон, якія ў кожным асобным выпадку могуць быць размешчаны трохі інакш, прыменена на ўсю даўжыню страхі на месцы канька (вільчака) верхняя падсветка (так званыя ліхтары — аэратары, якія выконваюць яшчэ і функцыі вентыляцыі). А таксама частка асноўнага даху месцамі выканана з празрыстага матэрыялу. Аказваецца, тое патрэбна і самой жывёле, і эстэтычна ўплывае на людзей, што тут працуюць. Гэта той шчаслівы выпадак, калі тэхналогія дапамагае творчасці. Творчы падыход без аглядкі на яе. Вялікасць Тэхналогію архітэктар можа прымяніць яшчэ хіба што на ўваходных групах: на дзвярах, казырках, ганках. А ў астатнім мы цесна звязаны функцыянальнымі задачамі канструкцыі.

На аб'ектах сацкультбыту творчага прастору крышку больш. Сярод таго, што зроблена за апошнія гады, сапраўды няма роўнага знакамітым Васілішкам. І ў цэлым па гаспадарцы, і па асобных яе аб'ектах прычын ганарыцца шмат. Там было належнае фінансаванне, ставіліся высокія задачы — узвядзенне аграгарадка новага тыпу. І нейкіх адміністрацыйных, фінансавых ці любых іншых абмежаванняў мы не адчувалі ў сваёй працы. Вось чаму і цэнтр Васілішак, і асобна ўзятыя будынкі вельмі ўражваюць. Той жа Дом культуры, узведзены па індывідуальным праекце; альбо адміністратыўны будынак пасля рэканструкцыі з вялікімі прыбудовамі; штучнае азярцо на месцы маленькай сажалкі, дзе разы ў тры ці чатыры з дапамогай «Гіправадгаса» павялічаны ўзровень вады. Прастора насычана малымі архітэктурнымі формамі, і азярцо стала любімым месцам адпачынку мясцовых жыхароў, асабліва дзятвы. Як і комплексная дзіцячая і спартыўная пляцоўкі, дзіцячы садок пасля рэканструкцыі. Такім чынам, вёска набыла якасна новае сучаснае асяроддзе, і яно падабаецца людзям. Бо гэтая ўрбанізацыя не цісне залішне, як у вялікім горадзе, а толькі дасягае яго па ўзроўні камфорту і добраўпарадкавання, застаючыся па сваіх маштабах бліскай да чалавека. Можа, гэта і ёсць тыя прывабныя рысы, якія і павінны быць у такой з'яве, як аграгарадок.

Пабудаваныя там і новыя жылыя дамы. За лічаныя гады населены пункт карэнным чынам пераўтварыўся. У ім прыемна жыць і працаваць, бо ёсць усё, што для гэтага патрэбна. У тым ліку сучасныя вытворчыя памяшканні (той жа машынны двор), гледзячы на якія, разумееш, што гэта — новы ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці з належнай культурай.

Калі гаварыць аб нейкіх праблемах, то адна з асноўных заключаецца ў тым, што ў сваёй працы мы не можам належным чынам кіравацца комплекснымі планіровачнымі праектамі сельскіх населеных пунктаў. Тыя праекты планіровак цэнтральных сядзіб былых калгасаў і саўгасаў, якія ёсць, выконваліся вельмі даўно — найменш 20, а то і 30 год таму. Амаль усе яны вычарпалі сябе як фізічна, так і маральна. Было імкненне надаць ім новую якасць, калі пачыналіся аграгарадкі, але гэта была занадта хуткая кампанія — на ўзроўні раённых архітэктараў, без інжынерных пошукаў, без глыбокага аналізу перспектыў развіцця, на тым матэрыяле, што быў пад рукой. А тут жа патрэбна працаваць увесь час, бо мяняюцца падыходы да забудовы населеных пунктаў, яны сталі больш узважанымі. Напрыклад, пералік аб'ектаў сацкультбыту, тых жа гандлёвых прадпрыемстваў і прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, цяпер куды больш сціплы. Выходзячы з гэтага, мы спрабуем прыстасавацца, працуем з планамі паквартальнай забудовы, але больш правільна было б усё ж мець генеральныя планы развіцця буйных населеных пунктаў, асабліва тых, якія інтэнсіўна забудоўваюцца, дзе ўлічана ўся інфраструктура, усе сеткі, дарогі, добраўпарадкаванне, а галоўнае — пляцоўкі новага жыллёвага будаўніцтва.

У нас працуе шмат моладзі, ёй ёсць у каго павучыцца. Шчодра перадаюць свой багаты прафесійны вопыт Мікалай Аляксеевіч Сальнікаў, Васіль Аляксандравіч Гарусаў, Ніна Максімаўна Папкова, Ліна Мікалаеўна Сенчыла, Галіна Рыгораўна Драб, Таццяна Рыгораўна Лось... Многія з іх пачыналі ў нас пасля інстытута і да гэтага часу паспяхова працуюць, з'яўляюцца творчым касцяком калектыву.

Праўда, з моладдзю існуюць пэўныя праблемы. У Гродне працуе архітэктурна-будаўнічы каледж, які «пастаўляе» нам архітэктараў-тэхнікаў і канструктараў-тэхнікаў. Дык вось, з архітэктарамі праблема ў тым, што ў краіне няма завочнай формы навучання па спецыяльнасці «архітэктура» ў вышэйшых навучальных установах, таму паступаюць завочна на будаўнічыя факультэты ВНУ. І мы рана ці позна сустракаем маладых спецыялістаў, у прафесійнае развіццё якіх укладваем пэўныя сілы, бо яны мусяць пераходзіць працаваць па профілі. Гэтая праблема не толькі нашага інстытута, але і астатніх беларускіх праектных устаноў, і Міністэрству адукацыі варта было б знайсці выйсце. Спецыялістаў-будаўнікоў з вышэйшай адукацыяй у краіне шмат, а архітэктар — тавар усё ж штучны.

Дзеля справядлівасці скажу, што зрэдку да нас прыходзяць працаваць і маладыя архітэктары з дыпломамі ВНУ, але атрымаць іх у патрэбнай колькасці мы не можам не першы год. Дарэчы, «Звязда» ўжо пісала пра гэтую набалелую праблему яшчэ чатыры гады таму. За гэты час нічога не змянілася. А дысбаланс у падрыхтоўцы спецыялістаў нейкім чынам патрэбна выпраўляць. Тым больш, што архітэктарам працы ў краіне з кожным годам дадаецца. Варта толькі ўспомніць агучаныя планы забудовы сталіцы і не менш грандыёзныя праекты, якія выношваюцца ў абласцях.

Мы ўважліва сочым за тэндэнцыямі развіцця грамадства. Зараз паступова набывае размах аграгурызм, і мы з задавальненнем узяліся б за праектаванне як новых гасцявых сядзіб, так і рамонту таго фонду, які ёсць, а зараз размова ідзе пра яго найлепшае прыстасаванне для новых мэтаў.

Але давайце паглядзім шырэй. Для аграгурызму прыстасоўваюцца ў асноўным прыватныя сядзібы і будынкі вясковых жыхароў. Але ў Беларусі ёсць і іншыя магчымасці. У краіне, асабліва ў заходніх абласцях, захавалася нямала закінутых памешчыцкіх маёнткаў, якія пасля належнага рамонту маглі б стаць новымі адрасамі аграгурызму. Яны найчасцей знаходзяцца на балансе сельсаветаў ці калгасаў, там некалі размяшчаліся праўленні ці склады. Дзяржава зараз гатова прадаваць іх за адну базавую велічыню, толькі б знайшоўся ахвотны даць ім другое жыццё. Спашлюся хаця б на сядзібна-паркавы ансамбль у вёсцы Падароск Воўкавыскага раёна, гаспадарамі якога ў розныя часы былі каралева Рэчы Паспалітай Бона, а затым памешчыкі Бохмісы, пастаўшчыкі казачных ружжаў і апетытных сыроў да царскага (!) двара. Гэтую сядзібу ў старым парку, на беразе невялікага азярца з лебедзямі яшчэ можна аднавіць, і мы ў такой рабоце ахвотна паўдзельнічалі б.

Альбо ў аднаўленні любой з больш чым 40 сядзі